БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА. ЗАСНАВАНАЯ Ў 1906 Г. У ВІЛЬНІ. АДНОЎЛЕНАЯ ТАМСАМА Ў 1991 Г. 3 1 САКАВІКА 1996 Г. ВЫХОДЗІЦЬ У МЕНСКУ. ВЫДАВЕЦ РЭДАКЦЫЯ ГАЗЭТЫ «НАША НІВА»

Хмарка

САКАВІКУ

Сакавіку маё вітаньне!
Хай крые сьнег усё дазваньня,
Няхай пануе йшчэ зіма,
Хай завіруха круціць ўночы
І сьлепіць белым сьнегам вочы,
Няхай цяпла яшчэ няма;
Хай неба хмарамі пакрыта
І вецер вые так сярдзіта,
Нібы пагрозы шле вясьне,
Нібы хаўтуры ёй спраўляе
І сьцежкі сьнегам спавівае,
І дрэвы стыгнуць ў зімнім сьне...
Але я страхам тым ня веру, —
Вясна адчыніць сабе дзьверы
І сонца выгляне з-пад хмар;
І сакавік сваёй размовай
Прагоніць цяжкі сон зімовы
І аджывіць зямлі абшар.
Блакітам глянуць неба далі
І ўсе, хто доўга так чакалі
Вясны жаданае прыход,
Свой злучаць голас зь спевам волі,
З чароўным гімнам лепшай долі
І стопяць гэтым гімнам лёд!
Сакавіку мы шлем вітаньне!
Зімы сярдзітае кананьне
Не напалохае больш нас, —
Яе мінуўся час і сіла,
Зіму чакае ўжо магіла
І блізкі к нам вясновы час!

«Полымя», 1925, №2. Публікацыя Аляксандры Гесь.

80 Дзень Волі

1918 ФЕВ 1988

25 сакавіка

№ 6 (103) 16 САКАВІКА 1998 г.

НАША НІВА

Бязвольныя не выклікаюць жалю

5. Эсэ.

«Беларускія народныя крыжы»

12-13. Новая кніга Міхася Раманюка.

Лірыка чырвонага стагодзьдзя

20-22. Эсэ пра беларускую савецкую паэзію.

Індэкс рэпрэсаваных

10. Беларускія антысаветчыкі ў фондах маскоўскага «Мэмарыялу».

Тэма Свабоды

11. Экспэдыцыя Архіву Найноўшай Гісторыі і «НН» на Слонімшчыну, да ахвяраў савецкае партызанкі.

Таямнічая Туркаль

6-7. Працяг тэмы

Рыхтуйся

18-23. Апавяданьне Паўла Севярынца

Цуд выратаваньня нацыі

Лявон Баршчэўскі, Уладзімер Падгол

Час сёньняшні адметны тым, што шмат хто згубіў арыентыры ў існуючым соцыюме і, як тапелец за саломінку, хапаецца за адчай ды роспач. Калі ж чалавек найбольш востра і балюча адчувае, што багна таталітарызму засмоктвае, тады ратаваньне ўласнае душы ідзе па галовах люмпэнаў, якія складаюць у нас большыню насельніцтва. Народ у нас «хворы», недасьпелы, з «адмарожанымі мазгамі».

Час сёньняшні трагічны да таго, што скажоныя арыентыры нават некаторых палітычных лідэраў завялі, замест ускрайку лесу, у багну ілюзіяў. Шмат хто, як і некалькі гадоў таму, лічыць Беларусь незалежнай краінай, якую імкнецца далучыць да сябе Расея. Ці так гэта?

Мы ўжо другі год жывем у дзяржаве, імя якой САЮЗ «Россия — Белоруссия». Гэтае нелегітымнае палітычнае ўтварэньне мае свой парлямэнт, бюджэт, агульную эканамічную, мытную, і, што вельмі істотна, інфармацыйную прастору.

З гледзішча дагматычнай паліталёгіі, якую, як кальку, раз-пораз накідваюць на постсавецкую прастору былыя выкладчыкі «научного коммунизма», мы жывем у незалежнай Беларусі.

З нашага гледзішча, мы жывем у часе і прасторы, які мае назоў «інфармацыйны таталітарызм і каляніялізм». Дыктатар цягам трох гадоў свайго вэртыкалізаваньня засунуў інфармацыйна-электронную голку-вэртыкаль у мазгі амаль кожнага жыхара Беларусі. А расейскія некалькі тэлеканалаў літаральна працялі ўсё жыцьцё тэлеманаў. Яскравы прыклад моцы тэленарказалежнасьці быў год таму, калі недзе на Берасьцейшчыне муж забіў нажом жонку з-за спрэчкі, які тэлесэрыял глядзець. Як ні дзіўна, але ў гэтай сьмерці павінен і прэзыдэнт. Бо калі б выканаў абяцаньне і даў кожнаму па «цілявізару», жылі б сужанцы доўга й шчасьліва. З разьвіцьцём інфармацыйных стасункаў невыкананае абяцаньне пра тэлевізар можа стаца чыньнікам адстаўкі дыктатара.

Але гэта адбудзецца тады, калі ЁН ня зможа далучыць да сябе Расею й асядлаць царскі трон. Менавіта так: не правесьці інтэграцыю, не далучыць Беларусь да Расеі, а яе-матухну пакласьці пад сябе — бацьку — сына «совка». Зьместам агітацыйна-прапагандысцкіх шоў у доўгатэрміновай перадвыбарнай кампаніі за пасаду цара ў дыктатара ёсьць ганьбаваньне ўсяго сучаснага расейскага і ўсхваленьне ўсяго лукашэнкаўскага. Прычым ЁН, як і ў 1994 годзе ў Беларусі, заклікае сёньня аддаць пад суд (Ельцына), саслаць на руднікі (Чубайса), а ад «дерьмократии» — (ягоны любімы выраз) назаўжды ачысьціць славян. Мадэль далучэньня Расеі да Беларусі выглядае так: «Это будет все лучшее, что было в СССР...» — карацей, рэанімаваны таталітарызм. А камплімэнтарна ўзьнёслае віншаваньне супрацоўнікам КГБ з нагоды 80-годзьдзя функцыянаваньня і пажаданьне захоўваць і памнажаць традыцыі не дае мажлівасьці двухсэнсоўнага ўяўленьня, як яно ўсё будзе.

Хто ж гэтаму можа перашкодзіць і што? Адказваючы на гэтае пытаньне ва Ўладзівастоку, ЁН сказаў пра кучку прыкладна ў 20 чалавек «фашиствующих молодчиков». Калі так, тады ніякіх праблемаў з далучэньнем Расеі да Беларусі няма.

А нам бачацца залі, у якіх стаяць у праходах студэнты і моладзь. Залі, у якія звычайна заганялі на мерапрыемствы, запоўніла моладзь, што прагне інтэлек-

Працяг на старонцы 3.

«Жаба ў роце»

(«НН» №4"1998)

Шаноўнае спадарства!

У артыкуле «Жаба ў роце» Севярын Квяткоўскі пытаецца: «Што такое трасянка? Ці зрабіў хто з філёлягаў выкладку, якая б паказвала, што ёсьць беларускай мовай з дамешкам расейскай і наадварот?»

Я не філёляг, але нават даступныя мне элемэнтарныя веды ў галіне мовазнаўства прыводзяць да цікавых высноваў.

На слупе ля прыпынку аўтобусаў № 57 і 77 на вуліцы Пуліхава ў Менску яшчэ й зараз можна пабачыць аб'яву наступнага зьместу: «Продоеца бувет и стол куҳоны по дешовке для дачы». Вось так. Сьмешна? І мне таксама. Сумна? Безумоўна. Але калі адкласьці ўбок эмоцыі і паспрабаваць прааналізаваць гэты пэрл пісьменства, зьяўляюцца зусім іншыя думкі.

Давайце прааналізуем тэкст па словах.

«Продоеца». Транскрыпцыя слова [прадаjэца] фактычна ідэнтычная транскрыпцыі беларускага слова «прадаецца».

Гукі [а] ў слове перадаюцца літарамі «о». Відавочнае адмаўленьне ад фанэтычнага прынцыпу, характэрнага для беларускай мовы, на карысьць марфэмнага прынцыпу (расейская мова). Заўважым, што гэта прыводзіць да памылкі: нават у расейскай мове пішацца «продАётся», а не «продОётся».

Спалучэньне «тс» падаецца як «ц» — абсалютна беларуская зьява. Яшчэ трохі часу, і гэты чалавек на пісьме будзе адлюстроўваць падваеньне «ц».

«Бувет». Слова «буфет» мае ў сабе такую нялюбую для беларускае мовы літару «ф». Яна часьцяком замяняецца спалучэньнем «хв», што адбылося і ў гэтым выпадку.

Куды падзелася «х»? Магчыма, мы маем справу з дыэрэзай (выпадзеньне гука, а значыць, і літары, якая яму адпавядае). Магчымы і іншы варыянт. Гукі [х] і [в] абсалютна розныя паводле спосабу ўтварэньня: [в] — выбуховы, [х] — фрыкатыўны. Гэта моцна адасабляе іх адзін ад аднога. У гэты час гук [у] забірае гук [х] у свой склад і пачынае вымаўляцца зь лёгкім прыдыханьнем. Гэта прыводзіць да зьнішчэньня літары «х».

«Кухоны». На першы погляд, тут павінна было мець месца падваеньне «н» — кухон- + -ны. Аднак слова «кухня» — запазычанае. Для таго, каб зрабіць яго больш беларускім, «н» не падвойваецца. (Беларуская мова «ня любіць» падваеньняў).

«Дешовке». У гэтым выпадку перамагае фанэтычны прынцып. (Нашто пісаць «ё», калі вымаўляецца [о]?)

Такім чынам, словы аб'явы расейскія, якія, аднак, паступова трансфармуюцца ў беларускія. Атрымліваецца, што беларуская мова перайначвае расейскія словы і паступова пераводзіць іх у беларускія.

Сумнавядомая трасянка — гэта ня мова, а проста набор словаў, якія ўжо перасталі быць расейскімі і ў хуткім часе маюць вялікі шанец зрабіцца беларускімі.

Трасянка — адзін з магчымых спосабаў змаганьня зь іншароднаю мовай, якое ідзе на ўзроўні падсьвядомасьці.

Я не хачу быць залішне аптымістычным, але калі ціск расейскай мовы будзе дастаткова слабым ці зьнікне зусім (што малаверагодна), расейская мова ў Беларусі праз пасярэдніцтва трасянкі ператворыцца ў беларускую.

Гэты працэс адбываецца ня толькі на ўзроўні фанэтыкі, але і на ўзроўні марфалёгіі, сынтаксысу і г.д. Трасянка ў нечым нават карысная зьява. Яна не замінае карыстацца роднай мовай тым людзям, хто сьвядома хоча размаўляць па-беларуску. Тыя ж, хто сьвядома адмаўляюцца гэта рабіць, усё адно паступова пераходзяць на беларускую мову, бо размаўляюць на трасянцы.

Змаганьне працягваецца.

Алесь Менскі

* * *

Этнічная гісторыя чалавецтва вельмі разнайстайная. Яна ахоплівае ня толькі працэсы фармаваньня нацыяў, іх узаемаадносіны, але і далейшае разьвіцьцё нацыі. І вельмі цікавым у сёньняшнім кантэксьце выглядае працэс падзелу адной нацыі на некалькі галін. А менавіта такія працэсы зараз і адбываюцца на Беларусі.

У выніку асыміляцыі Беларусі Расеяй беларуская нацыя была амаль зьнішчаная, засталіся толькі яе рэшткі. Яшчэ дзесяцігодзьдзе існаваньня СССР, і можна было б гаварыць пра тое, што беларуская нацыя зусім памерла. Але з развалам СССР і набыцьцём Беларусяй незалежнасьці ўсё зьмянілася. У Беларусі пачалося вяртаньне да нацыянальных вытокаў, але зь некаторымі асаблівасьцямі. І галоўная асаблівасьць — разьяднанасьць насельніцтва на беларускі народ і беларускую нацыю. Ці, будзе больш правільна мовіць, — на старабеларускае і младабеларускае адгалінаваньні нацыі.

Людзі з сапраўды беларускімі перакананьнямі ўспрынялі традыцыйную беларускую культуру, мову, гісторыю. Але ў гэтых людзей крыху зьмяніўся мэнталітэт — да больш актыўнай дзейнасьці ў процівагу былой памяркоўнасьці. І ня дзіва, бо ў большасьці гэта беларуская эліта. Яны і сфармавалі старабеларускае адгалінаваньне.

Іншыя існуюць у другой духоўнай прасторы. Ад беларускага ў іх засталося — саманазва, самасьвядомасьць, крыху беларускай культуры і мэнталітэт. Праўда, мэнталітэт таксама зьмяніўся. Традыцыйны беларускі мэнталітэт, арганічна спалучаючыся з савецкім, сфармаваў чалавека, у якім дамінуюць калектывісцкія перакананьні разам зь цярплівасьцю і пакорай. Гэта младабеларускае адгалінаваньне. Чаму младабеларусы? Не таму што яны больш прагрэсіўныя, а таму што яны параўнальна нядаўна сфармаваліся. Калі лепш угледзецца ў абодва адгалінаваньні, то можна ўбачыць, што зараз іх аб'ядноўвае толькі тэрыторыя і самасьвядомасьць. Мэнталітэт, культура, мова — розныя. Бо младабеларуская мова — «трасянка» — спалучэньне расейскай зь беларускімі асаблівасьцямі. І зараз, у сучасных умовах, праходзіць усё большае разыходжаньне абедзьвюх галін. Магчыма, што будзе пераадоленая мяжа, пасьля якой зьяднаньне будзе немагчымае. Верагодна, што мы яе ўжо перайшлі.

Дзяржава відавочна падтрымлівае младабеларусаў. І такую палітыку можна нават назваць асыміляцыяй. Адзінае, што застаецца старабеларусам, гэта захаваць тое, што яны маюць. Бо можа атрымацца і так, што яны і зусім вымруць. А з другога боку, улада Лукашэнкі кансалідуе новае младабеларускае адгалінаваньне, якое будзе разьвівацца далей і, зусім магчыма, будзе нацыяй у поўным сэнсе гэтага слова.

Праўда, ёсьць і яшчэ адно «але». Навошта вынаходзіць ровар, калі яго вынайшлі? Навошта патрэбная новая нацыя, калі існуе старая? І магчыма, шанец яшчэ ня страчаны?

Але вяртаньня да старой нацыі няма, бо яна ня мае масавае базы. Калі ў 19 ст. быў беларускі народ ды не было беларускай эліты (інтэлігенцыі), то цяпер усё наадварот. І калі народ мог нарадзіць эліту, то эліта ня зможа нарадзіць народ. Беларусы страцілі шанец, і нацыя фармуецца нанова, амаль без уплыву эліты. Эліта адыгрывае толькі ролю каталізатару.

Пра сябе: я вучуся ў Магілёўскім унівэрсытэце на гістфаку. Падзяляю нацыянальныя погляды і нават уваходзіў у Малады Фронт. Лічу, што каб нешта зьмяніць, трэба нешта рабіць, але, на жаль, сам ня схільны да актыўнай дзейнасьці.

Алесь Рыбачонак, Магілёў

«Мэмарандум аб грамадзянстве БНР»

(«НН» №5"1998)

Дзень добры, паважаная «Наша Ніва»!

Пасьля суда над Вадзімам Лабковічам і Аляксеем Шыдлоўскім я зразумеў, чаму адбываюцца народныя паўстаньні. Хто б 4 гады таму мог падумаць, што за надпісы на сьценах можна трапіць у турму? А цяперака садзяць на 1,5 гады. За спробу ж дзяржаўнага перавароту, калі не памыляюся, могуць уклеіць 10-15 гадоў. Глядзіш, пройдзе яшчэ 3 гады, і гэтыя лічбы зраўняюцца. Тады будзе ўсё роўна — ці ты пісаў «Жыве Беларусь!» на плоце, ці з групай сяброў з аўтаматамі кіраваўся да менскага Дому ўраду. Пакараньне аднолькавае!

Я чуў, што БНФ прапануе ўсім уступаць у грамадзянства Беларускай Народнай Рэспублікі. Цікавы варыянт! Бо грамадзяне Рэспублікі Беларусь служаць у арміі гэтай рэспублікі. А грамадзяне БНР па ўсіх правілах павінны служыць у войску БНР. Ня ведаю, ці магчыма стварыць армію краіне, якая не кантралюе ніякай тэрыторыі, але гэта магло б значна паўплываць на падзеі. Калі б супрацьзаконны перасьлед беларускіх патрыётаў мог выклікаць сілавы пратэст з боку БНР, ці так лёгка было б пакараць Аляксея Шыдлоўскага за бяскрыўдныя надпісы на сьценах і бел-чырвона-белы сьцяг?

Алесь Палескі Чарадзей, Менск

ПАВАЖАНАЯ РЭДАКЦЫЯ!

Па-першае, шчыра віншую ўсіх Вас з надыходзячым сьвятам — Днём Волі.

Па-другое, хочацца дакладней даведацца праз «НН» — куды зьвяртацца, каб атрымаць грамадзянства БНР, бо вельмі хочацца быць вольнай і незалежнай і шанаваць сваю мову, культуру, сваіх продкаў, свой родны кут і быць грамадзянінам такой дзяржавы, дзе б урад ня ездзіў у Нагана выкрываць міжнародную мафію і змагацца зь ёю. Хочацца бачыць на чале ўраду не вар'ята, а сумленнага, адукаванага, культурнага чалавека, якім можна было б ганарыцца так, як на сёньняшні дзень я ганаруся сваім земляком з Наваградчыны Барысам Рагулем.

З павагай да рэдакцыі —

сп. Прэсная А.Б., Скідзель

АД РЭДАКЦЫІ. На нашую думку і паводле нашых зьвестак, ідэя грамадзянства БНР — гэта не тэрміновая палітычная акцыя, не партыйнасьць або якое іншае членства, а вельмі асабістая справа чалавека, ягоны маральны выбар. Магчыма, з часам гэтая ідэя набудзе пэўны фармалізаваны выраз, але на тое мусіць быць аб'ектыўная патрэба. Напрыклад, калі Рада БНР вырашыць, што колькасьць зваротаў да яе ў справе грамадзянства вымагае такой фармалізацыі. У кожным разе, Рада БНР — адзіная на сёньня інстытуцыя, якая можа даць дакладны адказ на пытаньні пра грамадзянства і прымаць у гэтай справе тыя ці іншыя пастановы.

Апазыцыя пойдзе ўгору...

Суайчыньнікі, супакойцеся! Мы раскусілі подлы, але хіба ўжо апошні плян нашай дохлай апазыцыі. Гэтыя аматары міжнацыянальнай варожасьці яшчэ раней мелі магчымасьць упэўніцца, што за мір народ трымаецца мёртва, як бультэр'ер сьціснуўшы сківіцы на шыі ахвяры. І ў гэтых недаробкаў не было б ніводнага шанцу, калі б ня горы... Канечне, яны сабраліся ў горы. Што больш адвечным банкрутам застаецца? На раўніне ў варожых сіл у пэрспэктыве нічога, акрамя турмы, няма. Горы — іхная апошняя надзея. Ня трэба мець багаты аналітычны талент, каб заўважыць, што пасьля перабудовы ўсе войны горныя; з Карабаху пачалося... Апрача таго, у вялікіх гарах і войны вялікія, а ў маленькіх — лякальныя канфлікцікі. Вось у Альбаніі ўсяго дзьве гары, дык там нават не настраляліся.

Рэльеф нашай тэрыторыі лагодны, як народны характар. Здавалася б, што міралюбівым сілам можна адпачыць, але на гэты расслабон і разьлічваюць мярзотнікі. Вы, маўляў, таварышы, сьпіце спакойна, а мы тым часам з дапамогаю натаўскіх злодзеяў зробім сэйсьмічны зрух у кары нашай сьмірнай бацькаўшчыны, і на месцы бяскрыўдных узгоркаў зьявяцца сапраўдныя пікі нацыяналізму. Апазыцыянэры туды рынуць, аскаляцца ў гарах як шаблезубы чачэн, а пасьля паспрабуй вытурыць. Парушацца сталыя камунікацыі. Пакуль народ праб'е тунэлі, ашалелыя ад горнага паветра выдкі будуць лютаваць... Але вы, спадары, зноў памыліліся, не на тых натрапілі, і ў нашых мазгі ёсьць. Горным казлам — месца ў засадзе, за кратамі.

Ужо складзены плян правядзеньня тыдня нацыянальнага выратаваньня. Пачатак будзе зроблены на непатрэбнай усім вышыні 345 (спадзяюся, што стальны Эдмундавіч на гэта не пакрыўдзіўся б). Па добра вядомым сцэнары да гары прыбудуць аўтобусы зь лепшымі прадстаўнікамі сталіцы і ўсіх цэнтраў. Пачэснае права на пачатак будзе дадзена самі ведаеце каму. Пасьля, калі застанецца 344 мэтры, за рыдлёўкі возьмуцца праверaныя паплечнікі, а па пэрымэтры будзе далучацца народ. (Праўда, ходзяць чуткі, што сапраўдная яе вышыня ўжо 346 — ворагі па начах накапываюць). І гэтак мэтар за мэтрам гара асядзе, чарада грузавікоў разьвязе зямлю па нізінах. Растрыбушым кожную кратавіну, урэшце пачнем узрываць, боезапасаў дзеля сьвятой справы не пашкадуем.

Заявяцца на раскопкі шакалы з кінакамэрамі, гэта будзе іх апошні сюжэт, няхай стараюцца: бо ім ніколі не зарабіць на нашым простым і мірным жыцьці.

Сяржук Блізна

На Беларускім шляху

Пратакол з пасяджэньня Рады БНР у ноч з 24 на 25 сакавіка 1918 году, калі была абвешчаная незалежнасьць Беларусі, 26 сакавіка надрукавала менская газэта «Беларускі шлях». Гэты пратакол практычна не выкарыстоўваўся сучаснымі гісторыкамі. Тэкст яго перадаў у «НН» спадар Віталь Скалабан.

З пасяджэньня Рады Беларускай Народнай Рэспублікі 24/III

Пасяджэньне адкрылася заяваю Старшыні І.Н.Серады аб прысутнасьці на пасяджэньню дэлегатаў Віленскай Беларускай Рады п.п. А.Луцкевіча, І.Луцкевіча, Я.Станкевіча, і Г.Туркевіча.

Рада прывітала гасьцей воплескамі. Пасьля таварыш Старшыні І.Я.Варонка сказаў прамову аб значэньні Вільні ў гісторыі беларускага нацыянальна-культурнага адраджэньня і заслугах перад ім нікаторых прысутных дэлегатаў Віленскай Рады. «Беларусы! — закончыў прамову п. Варонка, — сягоньня маем Вялікдзень, сягоньня зноў духоўна аб'ядналіся Вільня і Менск, душа і цела, сягоньня беларус уваскрос!»

Адказваў на прывітаньне старшыня Віленскай Беларускай Рады п. А.Луцкевіч, каторы зрабіў вялікае паведамленьне аб чыннасьці беларускіх арганізацыяў у Віленшчыне і Гродзеншчыне і даў здавальняючы адказ на ўсе запытаньня, зробленыя членамі Рады ў зьвязку з паведамленьнем.

Пасьля гэтага Рада ўставаньнем аддала пашану памяці вядомай беларускай пісьменьніцы, культурнага і палітычнага дзеяча — Цёткі-Пашкевіч.

Далей у парадку дзённым стаяла прапазыцыя Беларускай Сацыялістычнай Грамады разглядзець праект аб'яўленьня незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі. Прапазыцыя, выклікаўшы пратэст адной часьці Рады, была прынята большасьцю галасоў.

Паведамленьне аб цяперашнім становішчу Беларусі і тых прычынах, якія вымагаюць аб'яўленьня яе незалежнай Рэспублікай зрабіў Старшыня фракцыі Белар. Сац. Грамады А.А.Смоліч.

Нарада па гэтым пытаньням цягнулася 10 гадзін. З абоіх бакоў выступіла 26 прамоўцаў.

Пры наэлектрызваным паветры была прынята пераважнай большасьцю галасоў пастанова, пададзеная «незалежнікамі»: «РАДА БЕЛАРУСКАЙ НАРОДНАЙ РЭСПУБЛІКІ АБ'ЯЎЛЯЕ РЭСПУБЛІКУ НЕЗАЛЕЖНАЙ І АБ ГЭТЫМ ВЫДАЕ СТАСОЎНУЮ ЎСТАЎНУЮ ГРАМАТУ».

Местовая група падала голас процiў пастановы, але засталася ў Радзе. Земцы, у ліку дзевяці чалавек, на чале с старшынёю Менскага Губэрнскаго Земства заявілі аб выходзе. [п.п. Злобін, Мацюш, Шыманскі, Міланoвіч, Жылінскі і др.]

Ад падачы голасу ўтрымаліся прадстаўнікі аб'яднанай Гэбрэйскай С.П. і «Поалэй-Ціон».

Прыняцьце пастановы спаткала шумнае прывітаньне Рады ў словах: «Няхай жыве Незалежная Беларуская Народная Рэспубліка».

А.С.

"Беларускі шлях". 1918, 26 сак. №3.



Суродзічы беларусы! Дарагія нашаніўцы!

Ад імя Каардынацыйнага Камітэту Беларусаў Канады й свайго асабіста я маю гонар і прыемнасьць вітаць вас з 80-мі ўгодкамі 25 Сакавіка — Дня абвяшчэньня дзяржаўнай незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі Актам 25 Сакавіка 1918 году.

80 гадоў таму 25 сакавіка ў Менску Рада Беларускай Народнай Рэспублікі як законны суверэнны орган беларускага народу сваёй Трэцяй Устаноўчай Граматай пад назвай Акту 25 Сакавіка перад усім сьветам урачыста заявіла:

«... Цяпер мы, Рада БНР, скідаем з роднага краю апошняе ярмо дзяржаўнае залежнасьці, якая была накінутая расейскім царызмам на наш вольны й незалежны край.

Ад гэтага часу Беларуская Народная Рэспубліка абвяшчаецца незалежнай і вольнай дзяржавай...»

Словамі гэтымі Рада БНР абвясьціла дзяржаўную незалежнасьць Беларусі ды падарвала ўсякія дзяржаўныя сувязі з Расеяй, часткай якой дагэтуль была Беларусь.

Сёлета, ў цяжкія часы, калі Беларусь «за кратамі», сьвята адзначаючы 80-я ўгодкі Векапомнага Акту 25 Сакавіка, жадаем Вам добрага здароўя, творчых посьпехаў ды багатых плёнаў Вашае працы. Жадаем, каб так як «Наша Ніва» 1906 году праклала шлях да 25 Сакавіка, адноўленая «Наша Ніва» пралажыла шлях да дзяржаўнай незалежнасьці Беларусі! Бо:

Зерне, кінутае ў ніву, усходзе й красуе.

Зацьвіце наш край як сонца пасьля непагоды!...

Жыве «Наша Ніва»! Жыве Беларусь!

Раіса Жук-Грышкевіч,

Старшыня Каардынацыйнага Камітэту Беларусаў Канады

Цуд выратаваньня нацыі

Працяг са старонкі 1.

туальнага беларускага слова, слова ад душы і з душы, слова, што абуджае, дае надзею і веру і як крынічка прабіваецца любоўю. На сустрэчах Барадуліна, Арлова, Ракіцкага з чытачамі, што адбыліся ў Віцебску і Горадні, утвараўся цуд. Выходзіць, беларускі верш яшчэ можа выклікаць пачуцьці, шматкроць мацнейшыя за рэакцыю на поп- ці сэкс ідала. Выходзіць, што «гражданское общество», пра неабходнасьць стварэньня якога гэтак упарта цьвердзілі беларусам мясцовыя лібэралы, ёсьць, і яно велізарнае, і падмуркам ягоным ёсьць нацыянальная ідэя.

Ня хочацца тут аналізаваць спробы тых самых лібэралаў, якія хочуць заваяваць «саўка» галашэньнямі кшталту: «Выберыце нас, і будзеце зарабляць па 300 даляраў штомесяц». Альбо: «Расея мае ў Беларусі свае законныя інтарэсы й мы іх будзем шанаваць». Для іх па-ранейшаму не існуе Купалы з воклічам глыбінь ягонае душы: «Беларусь — наша Бацькаўшчына-маці». Для іх не існуе Ул.Караткевіча і выпакутаванага ім асабістага нацыянальнага сьветаадчуваньня: «Гэты край — наш дом і сабор», а дзяржавай кіраваць ужо надта хочуць.

Сапраўдную інтэлігенцыю цяжка адрозьніць ад уяўнай. Нагадаем банальнае: ня кожны інтэлектуал ёсьць інтэлігент. Адрозьненьне ў тым, што інтэлігенцыі ўласьціва мець моцны інстынкт самазахаваньня роднага соцыюму — нацыі, нацыянальнай маралі, які выяўляецца мацней за інстынкт самазахаваньня. У гэтым і сутнасьць яго мэнталітэту і зьмест ягонай маралі. А падмуркам ягоным ёсьць любоў да жыцьця і нянавісьць да садызму.

Ці можна навучыць людзей любіць і кахаць? Ці можна абудзіць беларускую душу, якая выраклася беларушчыны, ці, пад узьдзеяньнем сучасных тэхналёгіяў абалваньваньня, сьпіць?

Напэўна, што можна. І першая ўмова таго — наяўнасьць у беларускім соцыюме самой ідэі любові, носьбітам якой наканавана быць інтэлігенцыі. Тым, для каго захаваньне нацыі вышэй за самазахаваньне. Тым, хто пазбавіўся страху Сьмерці і ў кожным слове выпраменьвае любоў да жыцьця. У гэтым цуд выратаваньня беларускай нацыі і яе незьнішчальная, жыццесьцьвярджальная моц.

Пад час апошняй сусьветнай вайны з аднаго лягера ўцяклі вязьні. Гітлераўцы вырашылі за гэта расстраляць кожнага дзясятага. Пад час сьмяротнай пераклічкі адзін з прысуджаных лічбаю ўсклікнуў: «О Божачка! Як жа безь мяне выжывуць дзесяць маіх дзетак?!» І тады імгненна з шэрагу выйшаў былы ксёндз Фарнага касьцёлу Максіміліян Кольбэ і заняў месца на той сьвет. Пэдантычныя немцы захавалі жыцьцё шматдзетнаму бацьку, а на сьвятары пачалі выпрабоўваць атрутныя рэчывы. Праз год ксёндз памёр у фізычных пакутах. Працягу гісторыі мы ня ведаем. Спадзяемся, што ў душах тых дзетак высьпела такая ж любоў да жыцьця і сваіх дзетак, як у іхнага бацькі і праз боскую спадчыну перадалася такая ж самаахвярнасьць, як у слугі Бога. Бо дзеці шматкроць лепей за дарослых здольныя любіць і абуджаць любоў у душах дарослых. Вуснамі дзяцей часьцей гаворыць ісьціна, таму што яны пад апекай Бога, які бароніць іх ад д'ябла.

А магло стацца і так, што выратаваныя ад безбацькоўшчыны дзеці — сёньня ўжо дарослыя, галасавалі на рэфэрэндуме за зьнішчэньне беларускай мовы. Бо прынялі за бацьку ідала лукавага.

Але ж любоў ды каханьне, калі ёсьць нацыя, перадаюцца ня толькі непасрэдна ад сваіх бацькоў. Бацькаўшчына-маці не дае згаснуць боскім пачуцьцям, не дае зафарбаваць у галовах і душах хрыстовы колеры.

У менскай школе №79 дзеткі 3-й клясы з настаўніцай Ганнай Хенсон на ўроку зь белай паперы вырабілі буслоў, пафарбавалі ім дзюбы. Потым кожны напісаў вершык з чатырох радкоў пра Беларусь. Адныя пра краіну, што адчуваюць домам ці храмам, другія — пра бацькаўшчыну-маці. Бусьлікаў тых разам зь вершыкамі панесьлі да бацькоў, каб нагадаць, што яны беларусы, што нельга забываць пра сваю беларускую душу. Дзеткі перадалі ў бусьліных лапках і дзюбе сваю любоў, якую немажліва апаганіць і зьнішчыць. Каб нашыя дзеткі змаглі вырабіць тысячы бел-чырвона-белых буслоў — сымбаляў любові да бацькаўшчыны-маці і данесьці іх бацькам і суседзям, не адна беларуская душа здолела б абудзіцца і садамазахісцкія гульні інтэграстаў выглядалі б каму прыкра, каму сьмешна.

І тады праз два гады ў XXI стагодзьдзі гэтыя дзеткі сталі б грамадзянамі па-сапраўднаму незалежнай Беларусі і за руку прывялі б сваіх бацькоў у — БНР XXI стагодзьдзя.

Ня так даўно Ігар Бабкоў пісаў — відаць, пад уплывам апошніх рэфэрэндумаў, што «народ» (у беларускім топасе) памёр. Мы ня згодныя. Не было яшчэ каму паміраць. Народа — носьбіта беларускае нацыянальнае ідэі ў нас яшчэ НЕ БЫЛО. Дзеячы БНР імкнуліся даць пачатак гэткаму народу. Ня здолелі. Па-першае, шмат было супраціўнікаў гэтага. А па-другое, (і гэта галоўнае) тутэйшаму жыхарству не была паказаная ў даступным і прывабным для яго выглядзе гэтая самая беларуская ідэя. Ім ніхто тады не сказаў, не давёў, што Беларусь — наша бацькаўшчына-маці, што Беларусь — наш дом і храм. Што Беларусі трэба ісьці ў Эўропу. Нацыянальную ідэю, як 80 гадоў таму, так і на працягу некалькіх гадоў існаваньня незалежнай Беларусі апраналі ў па-эўрапейску модныя палітычныя адзеньні, якія неўспрымальныя для шмат якіх жыхароў Беларусі. Сухія палітычныя формулы і парадыгмы не прымала бларуская душа, а ахінуць нацыянальную ідэю пяшчотай і ласкай, распаліць яе любоўю з-за палітычнай барацьбы ды парлямэнцкай дзейнасьці не хапала ні сіл, ні часу.

Калісьці Ж.П.Сартр сказаў, што чалавек ёсьць праект самога сябе. Мы кажам: нацыя ёсьць праект самой сябе, а першымі нацыяналістамі і ёсьць нацыянальныя інтэлігенты, якія ня толькі праектуюць, але і будуюць падмурак нацыянальнага дому. Ад таго, як спраектуюць, як пабудуюць падмурак і як патлумачаць людзям пра вышэйшыя паверхі, залежыць тое, ці захоча насельніцтва жыць у сваім нацыянальным доме і будаваць яго далей для сябе і сваіх дзетак.

Нацыянальная ідэя ёсьць ня толькі праект, але і мара. Нацыянальная ідэя ёсьць ня толькі паліталягічныя формулы, але і пачуцьці. Людзі ніколі не паверацъ самаму дасканаламу праекту, калі ня ўбачаць, не пачуюць і не адчуюць шчырага пачуцьця да мары, гатоўнасьці да самаахвяраваньня ў будаўніцтве і абароне нацыянальнага дому.

Прайшло 80 гадоў з часу стварэньня БНР і некалькі гадоў, як узьнікла незалежная Беларусь. Нашыя выбітныя продкі пасьпелі толькі стварыць праект незалежнай краіны БНР. Каб пабудаваць паводле праекту, трэба ўлічваць, што будаваць трывала можна толькі з фундамэнту. Падмуркам незалежнай Беларусі можа стаць глыбіннае пачуцьцё любові да Бацькаўшчыны-маці, імкненьне да ўласнага Дому. Таму несказанае аб любові трэба гаварыць, нязробленае трэба зрабіць і не блукаць сярод фальшывых арыентыраў.

Сапраўдная кроў

Сыйшоўшы ўвечары 7 сакавіка на станцыю мэтро «Акадэмія навук», я быў уражаны карцінаю, што адкрылася мне пад зямлёю. Карцінаю, што вельмі ж нагадвала провады на фронт. А дзе яшчэ я мог бачыць столькі заплаканых дзявочых вачэй і падкрэсьлена суворых твараў іх кавалераў. Дзяўчынкам яўна падабаўся працэс сьлёзапраліваньня. Як і іхныя хлопчыкі атрымлівалі неапісальнае задавальненьне ад нагоды задэманстраваць мужнасьць. Сківіцы пацяжэлі, вочы пастальнелі, рукі на дрыготкіх дзявочых плячах наліліся цеплынёй. Вось-вось падыйдзе цягнік, і яны разьвітаюцца навякі. Цягнік падыйшоў. Усе селі і паехалі. І едучы сярод гэтых сьлёзаў, эмоцыяў і жарсьцяў я так і ня мог уцяміць — што зь імі з усімі такое адбылося. Пакуль нечы голас не прамовіў: «Очань трогацельнае кіно. Пачці как «Белы Бім Чорнае уха». Да мяне нарэшце дайшло. У кінатэатры «Октябрь» адбылася доўгачаканая прэм'ера «Тытаніка».

Напэўна, няма чалавека (а ўжо пасьля апошняй прэм'еры ня будзе дакладна), які б ня ведаў што гэта быў за карабель, да якіх берагоў ішоў і колькі чалавек затанула. І колькі яшчэ будзе праліта дзявочых сьлёз! Нягледзячы на тое, што, як высьветлілася, сусьветны акіян ведаў і большыя трагедыі. І людзі гінулі ня толькі ў нэўтральных водах... Але які прыгожы міт. Думаю, Камэрон не апошні, хто зьвяртаецца да яго. І справа тут не ў грашах. Людзі любяць страшныя, прыгожа расказаныя казкі, дзе бутафорская кроў выклікае прыемныя сьлёзы. І на танных эмоцыях захоўваецца памяць пра прыгожую, чужую бяду. Але...

У маёй краіне яшчэ ёсьць людзі, якія ня ведаюць, што адбылося 25 сакавіка праз чатыры гады пасьля трагедыі «Тытаніка». І што самому цікава, гэты факт не выклікае ўва мне канвульсіяў бясьсільля. Нават напярэдадні 80-годзьдзя нашай галоўнай даты. Памятаю, як мяне заводзіла абыякавасьць маіх сяброў напярэдадні 75-х угодкаў БНР. Аб якой казалі газэты, плякаты, нават тралейбусы тады былі размаляваныя ў гонар Сьвята. Але сьвята тады ў мяне не было. Таму сёньня ў мяне няма жаданьня абгрунтавана даказваць велічыню той далёкай падзеі тым, каго гэта не абыходзіць. Мне ёсьць з кім гэты дзень не, не адсьвяткаваць, толькі адзначыць.

«Непрыгожая машына ніколі ня ўздымецца ў паветра», — казаў авіяканструктар Рабэрта Барціні. 25 сакавіка — занадта прыгожая лічба, каб зацерціся ў самай няцьвёрдай памяці. «25». У дзень, пазначаны такой запамінальнаю лічбаю, добра падводзіць рахункі й ставіць кропкі над і. Зрэшты, яны ў 18-м годзе былі расстаўленыя. І кроў пралівалася сапраўдная. І не віна тых, хто паставіў на гэтую лічбу сваё жыцьцё, што нехта не заўважыў велічыню стаўкі. Гульня працягваецца. Можа, нават, толькі пачынаецца. 80 — лічба небясьпечная для людзей. Для ненароджаных мітаў — гэта пытальнік усім тым, хто ўздыме кілішак з воклічам «Жыве!»

Добра прачнуцца 25-га й пабачыць над краінаю вясёлае надвор'е. І не хадзіць ні на якія мітынгі. Пашпацыраваць па горадзе, зазіраючы ў вочы мінакоў у небеспадстаўнай надзеі натрапіць на погляд ва ўнісон. Сустрэць сябра, у якога ўсё нармальна. Прапусьціць зь ім па кілішку за жыцьцё. Пасьля запрасіць сяброўку на «Тытанік». І, надзівіўшыся кіношнай сьмерці, супакоіўшы паненку, патэлефанаваўшы маці, працягваць жыць.

Зьміцер Бартосік

КАЛЯНДАР

ПРАМОВІЦЬ ІМЯ

Існуе паданьне аб тым, што калі немаўля памерла няхрышчаным, душа ягоная лунае паміж небам і зямлёю аж пакуль хтосьці не прамовіць наканаванае яму імя...

Часам высоўваюць меркаваньне аб тым, што калі б у 1918 годзе Вільня не была акупаваная немцамі, абвяшчэньне БНР адбылося б там — у Старажытнай Сталіцы, і гісторыя рушыла б іншым шляхам. Але БНР была абвешчаная ў Менску, горадзе, які ў 1067 заявіў аб сабе сьвету праз уласнае зьнікненьне, каб вярнуцца сталіцай беларускай Рэспублікі. Стваральнікі незалежнай беларускай краіны ведалі, што неўзабаве яна мусіць загінуць у агні, паміж молатам і кавадлам.

Борхесавыя «чатыры цыклі» пачынаюцца гісторыяй аб умацаваным горадзе, чые абаронцы ведаюць, што гораду наканавана зьнікнуць ад мяча і агня ворагаў. Другую і трэцюю гісторыю мы ведаем — аб вяртаньні і пошуку. Апошняя гісторыя вечнага цыклю — аб самагубстве Бога...

Сёньняшні Менск — «горад, якога няма». Велічэзная неакрэсьленая прастора, якая нібы «Лятучы Галяндзец» вісіць паміж небам і зямлёю. Які хавае ў сабе ледзь прыкметныя згадкі мінулага жыцьця — сьляды сваёй душы.

Зьнікненьне — пошук — вяртаньне... БНР нарадзілася ў горадзе, асуджаным на шторазовае зьнікненьне. Сёньня мы ізноў прамаўляем імя народжанага і зьніклага восемдзесят гадоў таму немаўляці. Каб душа пайшла да неба, мусіць зьнікнуць цела. Але каб яна вярнулася да зямлі, мусіць спраўдзіцца чацьвертая гісторыя адвечнага цыклю.

І тады кола разамкнецца.

Севярын Квяткоўскі

Два абразы пад сьцягамі

Дзень Волі — гэта дзень нараджэньня маёй бабулі. Зараз, калі яе праўнучцы на 80-годзьдзе БНР — столькі, колькі бабулі споўнілася ў 18-м на яе абвяшчэньне, я ўрэшце зразумела: у маім прыватна-жаночым успрыманьні гэтага сьвята не існуе супярэчнасьцяў.

Праз шмат гадоў пасьля сьмерці бабулі мая цётка Зоня сама стане шустранькай бабуляй, захавальніцай вясковых дажынкаў, і нідзе, акрамя гэтай вёскі на Случчыне, ня чутых песьняў. Загояцца ўсе сьляды ад кухталёў, нанесеных за гады сяброўства адно аднаму намі зь яе Мішкам. Ён стане міліцыянтам, а пасьля сустрэчы на мітынгу ў Менску — сыйдзе й вернецца ў вёску... Усё вяртаецца на свае месцы — як любіць цяпер вяртацца ў бабы Маніну вёску яе праўнучка зь Менску, як вярнуўся яе дзень народзінаў у Менск Днём Волі...

Але так магло б і ня стацца. Калі б, незалежна ад майго разуменьня, шматкроць не вярталася б яна сама.

Тое гарышча ў яе хаце, з пахам дымка ад коміну, і стружкі, і старых пераплётаў... Маёй дачцэ ўжо не пашэнціць знайсьці там у восем гадоў падручнікі часоў Сталіна й хрушчоўскае адлігі! Першую кнігу маці чытаць мне забараніла, бо не магла бачыць, як роднае дзіця заліваецца сьлязьмі (на яе думку, таму што «нічога не разумее»). Гэта быў «Тарас Бульба». Калі час ад часу маці чула пра «траякі» па пісьму і «калы» па фізкультуры, яна ведала, што замест пісьма быў Гогаль «зь ягонымі хахляцкімі казкамі», а замест мячыкаў на ўроку — расповяды пра «казкі і казакі» сяброўцы, якія раздражнялі нашага фізрука. Другая кніга была дзядзькаў падручнік па бел. літ. Побач зь Ленінам, пра якога нам казалі шмат добрага ўжо ў першай клясе, усюды праз дэфіс прымазвалася: «Сталін».

«Шкодныя» кніжкі неўпрыкмет зьніклі ў цётчынай печы. Бабулю я, падрастаючы, магла б неяк і прызабыць. Не давалі. То сваякі ўзгадаюць штось. А то зноў, як у вёску патрапіш улетку, перакінуцца сустрэчныя старыя: «Чыё то гарадзкое дзяўчо?» — «Ня бачыш? Маня ўся!» — пачастуюць яблыкам, доўга гутараць, пераглядаюцца. Маня, Польшча, журавіны, тэатар... Што гэта ўсё значыць — адкуль было ведаць? Пазьней, калі гісторыя «перавернецца», аднагодкі бабы Мані распавядуць мне і пра журавіны, і пра Котлас, і пра «Польшчу», і пра... Божа, дзе была мая «дзявочая памяць» дзьве пяцігодкі таму?

Але не — яны ўсё ж недакажуць. У бабчыных сябровак будуць сьлёзы — і нявер'е, і страх, што ўсё ненадоўга, што Котлас вернецца. «Ня трэба, дзеткі, вам ведаць праўду — хто тут за што ў каго страляў...» Вось як добра жылося ў савецкай калгаснай вёсцы на памежжы, на хутарах вакол: бабка Маня дзяўчынкай хадзіла з маці па грыбы, журавіны і дровы «ў Польшчу»! Гэта ж кіламэтраў зь дзясятак, праз дрыгву і дзяржаўную мяжу.

Ёсьць некалькі варыянтаў месца і абставінаў іхнага знаёмства: можа, на журавінах, можа, у царкве, а то й на якім кірмашы. Галоўнае ня ў гэтым. Паміж вёскай і хутарам закаханых было недзе кіламэтраў шэсьцьдзесят. Паміж Грыцэвічамі ды схаванай некалі ў лясах Самахвалаўшчынай... Хоць не, Самахвалаўшчыну так ахрысьцілі пазьней, па дзеду, калі перабраўся празь мяжу ў Беларусь, да бабкі Мані. Здаецца, тады ўжо паразбуралі навокал цэрквы, як тую, вызьненскую, дзе яна сьпявала. У што яны тады верылі, што маглі прадчуваць? Дзяды ў Вызьне узгадваюць, як гарэў тады нейкі кляштар пад Слуцкам. Хутары «сабралі» ў вёску, дзе цяпер хата з утульным гарышчам, а сваякі якімсьці чынам «згубілі» адрасы бабчыных братоў, што апынуліся ў Амэрыцы. Магчыма, недзе за сьветам па зямлі ходзіць яе стрыечная ўнучка, што таксама «і крошкі пабрала». І мы ўжо не сустрэнемся... Як не сустрэліся зь дзедам, які «прапаў бязь вестак» невядома дзе, пасьля вызваленьня ад акупантаў.

Мне згадваецца іншая акупацыя, пра якую яна, пэўна, разумела, ды лічыла да лепшага не казаць. Мы гаварылі зь ёй тады зусім аднолькава: па-беларуску. Аж пакуль бацькі не забралі мяне ў горад. Пасьля бабкі Мані ў памяць чамусьці ўрэзалася мая варожасьць да дзіцячага саду. На сьлёзы там казалі: «Показывает характер», а спаць прымушалі загадамі кшталту: «Все быстро отвернулись к стенке!»

Эпізод, які ўзгадваецца ўсё часьцей, чуты некалі ад бацькоў. «Дождж будзе. Хмара ідзе», — «Ну что ты, баба Маня, неправильно говоришь: не «хмара», а «туча»!» І ўсе засьмяяліся, дадае маці.

Баба Маня вярталася й тады, калі нас, малых, цішком, падпольна неяк, пахрысьцілі ў хаце ля самае Вызны — у бабы Веры, яе сястры, таксама, як выявілася, былой пеўчай. Пазьней баба Вера стане ледзь не адзінай у сям'і камуністкай і... будзе таемна хаваць набажэнствы ў сваёй бібліятэцы (якраз там, дзе цяпер праз дарогу маскаль у папоўскім адзеньні і з гэбісцкімі замашкамі не дае ўсталяваць беларускі крыж у гонар слуцкіх абаронцаў БНР). Гэта там, на месцах, асьвечаных нябачнай прысутнасьцю бабуль, Веры й Марыі, тады, мінулай восеньню, незнаёмы зямляк сустрэў нас з дачкою прывітаньнем: «Калі б вярнуўся Сталін — разам зь дзецьмі б расстраляў»... Далучэньне нашых дзіцячых душаў да Бога было маўклівым пратэстам продкаў супраць бальшавізму, што паруйнаваў нашу мінуўшчыну. Яны нібы ведалі, што іхныя праўнукі ўжо будуць ведаць пра Хрыста, але — не пра «дзядулю Леніна».

Цяпер я згадваю пра бабуляў яшчэ і праз створаныя іхнымі рукамі ручнікі, абрусы, посьцілкі: перад сьмерцю абедзьве загадалі сёе-тое абавязкова захаваць для нас, нашчадкаў, бо «пазьней такога ня будзе». Нават усьведамленьне сябе беларусамі мы зь сястрою пачалі з паездкі ў маленстве да бабы Маніных сваякоў на поўдзень Расеі, да Азоўскага мора. Тамтэйшыя дзеці ў горадзе-крэпасьці Пятра пыталіся, што такое Беларусь, дзівіліся, што ў нас процьма ў дзесяць разоў танькейшай бульбы, лясоў з грыбамі замест стэпу, рачулак замест мора і Дону...

Бабка Маня прыйшла, як жывая, у 91-м, на Каляды. Да маёй маці. У сьне. «Віншую!» — сказала яна, і маці прачнулася. Было вельмі рана. Зьвінеў даўжэзнымі гудкамі тэлефон. Ёй паведамілі зь Менску навіну. Баба Маня прыходзіла сказаць, што на Каляды прыйшла ў гэты сьвет яе праўнучка. Праз паўгады і тры дні ў бабчынай хаце зазірнула ў вакно сонца, калі я даведалася дзьве шчасьлівыя навіны. У Марыйнай праўнучкі, майго «новага паканьня» з імем Вера, зьявіўся ўрэшце першы зуб. А ў Беларусі — зьявілася Незалежнасьць, на зьмену той, якую зруйнавалі пры бабе Мані. 25-га, каб яна дажыла, мы б сьвяткавалі Дзень Волі разам, пад нашым сьцягам на фіранках майго вакна. Я ж адзначу два дні народзінаў адразу. Нашай Волі — і яе «сястры», Беларусі — і яе дачкі. Яны абедзьве, нават ня маючы сілаў, не скараюцца й не зьнікаюць назаўсёды. Яны вяртаюцца, і рана ці позна становіцца адчувальнай нават іхная нябачная, часам нячутная прысутнасьць каля нас і над намі. Нібы ў самыя лёсавызначальныя імгненьні нехта, як са старога абраза, паглядзіць у вочы, альбо зірне цераз тваё плячо, альбо накіруе твой няпэўны крок у дзіўны, але раптам убачыцца — патрэбны кірунак.

У дзень народзінаў Волі мне чамусьці хочацца запаліць сьвечку ў хаце і назваць бабу Маню інакш, неяк нават не па-сваяцку: Паннай Марыяй...

Таццяна Сьнятко

Культурны «гвалт»

«У сучасным слоўніку тэрмін экспансія азначае сынтэз усемагчымага зла, — піша польскі дасьледнік Нікадым Бонча-Тамашэўскі. — Гвалт, кроў, вайна, псыхапатычныя правадыры і абдураныя імі натоўпы, гатовыя да разьні — вось стандартныя асацыяцыі, якія выклікае гэты патэтычны некалі тэрмін... А між тым экспансія ўвесь час вяртаецца, не дае пра сябе забыцца, яна стала прысутнічае ў культуры... Мы мусім прызнаць, што разам з галінамі, традыцыйна экспансіянісцкімі — палітыкай і вайной — практычна ўсе сфэры нашага жыцьця пазначаныя экспансіяй. Экспансіяй асобы і грамадзтва, навукі, якая ахоплівае ўсё новыя аспэкты рэчаіснасьці, мастацтва, якое шукае формаў экспрэсіі. Техніка, ідэалёгія, рэлігія — усё ажыцьцяўляецца праз экспансію».

Калі пазбавіцца ад стэрэатыпу, які бясконца звужае значэньне гэтага слова, трэба сказаць: тое, што ня творыць сваю экспансію, тое не жыве. Дакладней, не выжывае. І гэта тая формула, якая змушае нас, магчыма, па-іншаму зірнуць на наша нацыянальнае адраджэньне. Хоць насамрэч, гэтая размова — толькі працяг ранейшых гутарак пра волю і бязвольнасьць, пра сілу і слабасьць, самазадаволенасьць і — экспансію навонкі.

Зьвернемся да тэарэтычнага трактату Бончы-Тамашэўскага. Ён прапануе выразна адрозьніваць біялягічную экспансію, што вызначаецца жывёльным паходжаньнем чалавека, і экспансію культурную, якая, як і ўсё ў культуры, не вызначаецца нічым, апрача чалавечае волі.

Экспансію (або новую рэчаіснасьць) творыць той, хто авалодаў праўдзівай відзежаю сьвету. Вось, можа быць, галоўная думка, якая стаіць нам сёньня на перашкодзе. Мы, беларускае адраджэньне ў шырокім сэнсе, ня ведаем, што дасягнулі праўдзівае відзежы сьвету, не перакананыя ў гэтым, ня ўпэўненыя. Самыя падваліны нацыяналізму — ад назвы краіны да выбару правапісу — страсаюцца кожным нэафітам, а «старафіты» стаміліся спрачацца, маўляў, ай, хлопцы, седзімо, на чым ёсьць і гледзімо на ўзоры дэмакратычных краінаў. Гэта і ёсьць брак волі.

Спаміж тыпаў экспансіі і экспансіяністаў польскі дасьледчык найперш выяўляе ўнутраную экспансію і пустэльніка, засяроджанага на сваім пагружэньні ў рэчаіснасьць, бо толькі гэта дае яму магчымасьць цалкам рэалізаваць свой чалавечы патэнцыял. Ён усьведамляе навакольны сьвет у найшырэйшым аспэкце: мэтафізычным, гістарыязафічным, эсхаталягічным і г.д. Гэты тып у беларушчыне ці ня самы пашыраны на самых розных інтэлектуальных узроўнях. Мы ўсе гісторыкі з чырвонага радка і паэты або мысьляры, словам — ПУСТЭЛЬНІКІ. Самотнікі. Згадаем дзейнасьць гісторыка Міколы Ермаловіча, палітыка Зянона Пазьняка або філёзафа Ігара Бабкова, каб зразумець, што гэткі гераічны тып найбольш пашыраны сярод нас. Гэта экспансія ў сабе. Бонча-Тамашэўскі мяркуе, што «за адзінкавай унутранай экспансіяй ідзе ўзмацненьне ўсяго грамадзтва, нават калі яго члены ня браліў гэтым непасрэднага ўдзелу». У якасьці клясычных прыкладаў унутранай экспансіі на грамадзкім, так бы мовіць, узроўні, дасьледчык называе кітайскую супольнасьць зь яе саракавечнай традыяй і качавыя сэміцкія плямёны зь іх вандроўкаю ў Палестыну, зрэшты ўсю Біблейскую гісторыю жыдоў.

Пачаткі вонкавае экспансіі дасьледчык зьвязвае са зьяўленьнем пісьма. А першым тыпам такога экспансіяніста называе АДКРЫВАЛЬНІКА. Эпоху Вялікіх Геаграфічных адкрыцьцяў 15-16 ст. распачалі гішпанцы і партугальцы — чаму?

Крыніца экспансіі ібэрыйскіх адкрывальнікаў — у той самай значнай для грамадзтва ўнутранай экспансіі. Найперш, у рэлігійнасьці, арыгінальным і дынамічным каталіцызьме. Зьвярніце ўвагу на доўгатэрміновыя пасты, малітвы і іншыя рэлігійныя практыкі гішпанцаў перад выхадам у вандроўку. На жаль, звычайна гэтага не заўважаюць. Хоць аналіз міту Эльдарада ці містычнае крыніцы «жывое вады», якая мусіла знаходзіцца ў Флорыдзе і прывяла да стварэньня гішпанскай вэрсіі легенды пра сьвяты Грааль, пацьвярджае такую думку.

Адкрывальніцкія экспансіі працягваюць ажыцьцяўляцца і сёньня. У абліччы навукі. У гэтым выпадку экспансіяністы пашыраюць межы рэчаіснасьці. Але ці можам мы казаць, што гэта тычыцца і сучаснае беларушчыны? Наўрад ці. Хіба што з ранейшага часу, з 70-80-х гадоў жыва згадваецца прарыў у галіне гісторыі літаратуры, калі дзясятак адкрывальнікаў літаральна засыпаў публіку невядомымі фактамі.

Наступны герой вонкавае экспансіі — ЗАВАЁЎНІК. Ім рухае тое самае, што і адкрывальнікам, але яго ныя дзеяньні чыста дэструктыўныя. Ён не пашырае межы рэчаіснасьці, а зьнішчае стары лад нібыта дзеля таго, каб усталяваць новы. Тут згадваюцца сярэднявечныя набегі гунаў альбо мангола-татараў. Істотна, што заваёўнік таксама падрыхтаваны практыкамі ўнутранае экспансіі, ён таксама дзейнічае ў імя пэўных сваіх ідэалаў. І нават бальшавіцкія руйнавальнікі старога сьвету зьбіраліся, прынамсі ў песьнях, будаваць сьвет новы. Праўда, узьнікае пытаньне — якой унутранай экспансіяй была падрыхтаваная іхная дзейнасьць? Хіба што выношванай доўгімі гадамі нянавісьцю да існых парадкаў, а таксама — да культуры, адукацыі, дастатку.

Калі з клясыфікацыяй бальшавікоў як заваёўнікаў яшчэ можна пагадзіцца, то расейская экспансія на Беларусь у XIX ст. выпадае з клясыфікацыйнай табліцы польскага дасьледчыка. Інакш яму давялося б увесьці яшчэ адзін тып экспансіяніста — МАРАДЗЁР. Бо гэта не была заваёва і сьцьвярджаўся тут ня новы лад, а звычайны для расейскай правінцыі бюракратычны хаос. Заўважу, што гэты пэрыяд, другая палова XIX ст., калі ў Беларусь з Расеі толькі паводле статыстыкі прыбыла ня менш за мільён чалавек, яшчэ чакае свайго дасьледаваньня і ацэнкі.

Наступны ў шэрагу экспансіяністаў — піянэр. У беларускай традыцыі гэтаму паняцьцю адлавядае пачынальнік. Заваёўнік нічога не будуе, толькі руйнуе. Будуе ПІЯНЭР. Ён не такі калярытны і харызматычны, як папярэднія тыпы. Бадай толькі амэрыканцы здолелі зрабіць яго героем эпасу. Дзікі Захад XIX ст. стаўся найлепшым тэатрам дзейнасьці піянэра. Задача піянэра — усталяваньне ня столькі новага ладу, колькі старога ў найлепшых ягоных праявах. Піянэр — стабілізатар, які супрацьстаіць хаосу бандытаў і індзейцаў.

Між іншым, экспансіянісцкія памкненьні піянэраў адлюстваныя і ў беларускім эпасе — «Новай Зямлі» Якуба Коласа. Можа быць, гэта самы сьветлы і канструктыўны вобраз нашае нацыянальнае экспансіі. На доўгі час гэты тып быў страчаны ня толькі беларушчынай, але і ўсёй нацыяй. Кінутыя вёскі і землі сьведчаць пра гэта. Піянэра ў чалавеку забіла савецкая ўлада і працягвае забіваць цяперашні рэжым.

Калі распачынае шэраг экспансіяністаў пустэльнік, дык завяршае яго іншы герой, зьвязаны з сакральнай сфэрай — МІСІЯНЭР. Сьвятыя сталі патронамі многіх эўрапейскіх народаў. Нямала прыкладаў місіянэрскае дзейнасьці ведае і беларушчына зь яе, напрыклад, ксяндзамі-паэтамі міжваеннага часу. Дарэчы, гэткая практыка, піша Бонча-Тамашэўскі, характэрная толькі для хрысьціянаў. Ісламнадае ролю місіянэра заваўніку, а рэлігіі Ўсходу наогул засяроджаныя на ўнутранай экспансіі. Хрысьціянскі місіянэр усталёўвае свой лад на трансцэндэнтных падставах.

Так у агульных рысах выглядаюць праявы культурнай экспансіі, без разуменьня якой, на думку польскага дасьледчыка, немагчыма зразумець уласную культуру.

Сучасная беларушчына ў гэтым сэнсе не складае выключэньня. Адно кідаецца ў вочы пераблытанасьць нашых памкненьняў, слабасьць волі і адсюль — бяскрайні абсяг нескарыстаных яшчэ магчымасьцяў.

Сяргей Паўлоўскі

Бязвольныя не выклікаюць жалю

У альбанскага пісьменьніка Ісмаіла Кадару ёсьць апавяданьне пра турэцкага караваншчыка, які выконвае дзяржаўную замову — вязе са сталіцы на заходнія межы Асманскае імпэрыі незвычайны груз — чорныя накідкі з чадрамі. У гэтыя самыя чадры мусяць быць убраныя жанчыны Грэцыі, Альбаніі, Сэрбіі. Турак-караваншчык, просты шчыры чалавек, вельмі дзівіцца чужым норавам, раскаванасьці й адкрытасьці балканскіх жанчынаў. Міжволі сьціплы караваншчык аказаўся правадніком асманскае культуры, ідэалёгіі... За ягонымі плячыма застаецца колер ночы. За ягонымі плячыма моўкне сьмех. Але... гарэзьлівыя, сьветлыя вочы эўрапеек закідваюць у ягонае сэрца зерне сумневу...

Зьнямелыя народы Балканаў, спыніўшы разьбег уласнае цывілізацыі, страцілі ня толькі сваю дзяржаўнасьць, але і культурную самастойнасьць. Адбыўся глябальны пераварот — з цэнтра ўсходнехрысьціянскага мэсіянізму Балканы ператварыліся ў аб'ект цюрцкае акультурацыі.

Антычная Грэцыя пасьля страты ўласных дзяржаўных формаў яшчэ бясконца доўга слала сьвятло свае цывілізацыі ў Эўропу і Азію. Заваёўнікі самі былі паняволеныя элінскай культураю і накінулі яе многім народам аж да Аральскага мора і аўганскіх гор. Высокі кшталт грэцкае скульптуры дайшоў да нас пераважна... у безьлічы рымскіх копіяў, а антычная філязофія зьбераглася... у мудрагелістых арабесках мусульманскіх перапішчыкаў... І сёньня любы па колькасьці народ можа прымусіць цэлы сьвет спажываць прадукт свае культуры, калі ў народа ёсьць воля. Нас можа не абыходзіць ні колькасьць ірляндцаў ні нават лёс іхнае мовы, але мы чытаем Джойса і слухаем ірляндзкі рок, бо яны паняволілі сьвет. Гэта значыць, што і мы можам зьняволіць сваёй культураю сваіх заваёўнікаў, а можам і заваяваць сьвет, калі толькі нам ня здрадзіць воля.

З часоў позьняга Адраджэньня нацыянальныя культуры, якія колісь былі экспансіяністамі і накідвалі свой кшталт культуры ўсяму вядомаму сьвету, але пачалі дбаць толькі пра кансэрвацыю ўласных здабыткаў, непазьбежна пераўтвараліся ў рэцыпіентаў — спажыўцоў чужых культурных уплываў і на стагодзьдзі сыходзілі з арэны. Напрыклад, Нарвэгія выйшла зь летаргіі толькі ў другой палове мінулага стагодзьдзя, а напачатку нашага ўжо ўвесь сьвет ведаў музыку Грыга, літаратуру Гамсуна, мастацтва Мунка. Іхным памкненьнем найперш было скарыць Эўропу, а ўжо нарвэжцамі ім было наканавана застацца.

Індыкацыя жывой культуры — яе гатовасьць даць сьвету адказы на агульначалавечыя пытаньні. Тады праявы культуры становяцца не падпоркамі маста, а самім мастом, па якім мы пераходзім у заўтра...

Беларусь за часамі Адраджэньня вяла рэй у славянскім сьвеце. Сымбалем нашае цывілізацыі стала друкаваная кніга. Яскравы прыклад нашае экспансіі — славутая Берасьцейская Біблія, выдадзеная Мікалаем Радзівілам Чорным адмыслова папольску, каб іскры Рэфармацыі закінуць нашым суседзям на Захад. Лягічным працягам фэерычнае эпохі беларускага кірылічнага друку быў сталы ўплыў на Ўсход, які выявіўся ў самых розных формах культуры: ад разьбы па дрэве і кахлярства да тэатра і вершаскладаньня. Тым шрыфтам, які вырабіў пастар са Слуцку Галяш Капіевіч да сёньня паслугоўваюцца сэрбы і ўкраінцы, асэтыны й манголы.

Ад часоў каралевы Боны ў 16 ст. сама Беларусь стала аб'ектам італьянскай культурнай экспансіі. Па выніках мы атрымалі ня толькі рэформу землекарыстаньня й эўрапейскую урбаністычную культуру, але і высокі кшталт дойлідзтва. Беларусь стала цэнтрам барока, апошнім яго фарпостам на краю цывілізацыі. А ўжо напачатку 17 стагодзьдзя Беларусь рэтрансьлявала гэты стыль, адаптаваны й зьбеларушчаны, у розныя краі. Перанос вонкавага ўплыву далей стаў эфэктнай і эфэктыўнай формаю ўласнай экспансіі.

Беларусізацыя формаў барока і іх экспарт — ці ня самы вялікі ўнёсак Беларусі ў гісторыю сусьветнага мастацтва. Віцебская пара пачатку стагодзьдзя — яшчэ адзін прыклад. Віцебск выправіў у сьвет не беларускае мастацтва, а саміх беларускіх мастакоў. Яны перайшлі мост, які за іхнымі сьпінамі ахутала ноч.

А сёньня мы йзноў гародзім падпоркі, цешымся з пацьвілых паляў, што засталіся ад тых мастоў. Засяроджаныя на самадастатковасьці, на ўнутраным спажываньні, на хатнім ужытку... Ня дзіўная рэч — упэўніваць самога сябе ў сваёй перавазе над астатнімі. Той, хто гэтым займаецца, звычайна носіць на сабе чужую рацыю, як чорную турэцкую чадру.

... Стары караваншчык, герой апавяданьня Кадару, спакутаваўся ад сумневаў. Пакрысе ў ім высьпела адчуваньне жалю да тых жанчын, якіх ягоная дзяржава спавіла ў колер жалобы. Праз гэтае неакрэсьленае адчуваньне жалю караваншчык кепска скончыў свой шлях. Выходзіць, ня вартыя жалю тыя, хто ня мае волі на тое, каб сьцьвярджаць сваю перавагу іншым.

Сяргей Харэўскі

Ахвяра экспансіі

«Беларуская культурная экспансія». Большасьць тых, каго ў нашым грамадзтве прынята называць інтэлектуаламі, аднясуць гэтую фразу да абсурдных. Што да мяне, то я не кручу пальцам ля скроні, калі чую гэты выраз, бо сам армянін Андранік Антанян стаў ахвяраю гэтай экспансіі. Ахвяраю далёка ня першай і зусім не апошняй. І гэта цешыць.

Аднак сёньня ў Беларусі пануе іншая думка — пра неабходнасьць супрацівy культурнай экспансіі з Усходу (Захаду). Лічыцца, што гэта ледзьве не галоўны лёзунг усяго нацыянальнага адраджэньня XX ст. Насамрэч, гэты лёзунг — плён нашага часу.

Пераглядаючы гадавікі старых пэрыёдыкаў, я заўважыў, што беларускія публіцысты першай паловы стагодзьдзя ўжывалі слова «абарона» толькі ў дачыненьні да сваіх правоў: палітычных, эканамічных, сацыяльных. Абараняцца ад якіх бы там ні было ўплываў не ўваходзіла ў іхныя пляны. Задача стаяла адваротная — афарбаваць у адзін беларускі колер усё шматпляменнае насельніцтва на землях акупаванага Вялікага Княства. Беларуская Сацыялістычная Грамада перакладала свае ўлёткі на літоўскую мову й распаўсюджвала іх пад сваім партыйным подпісам па ўсёй Аўкштоце, Жмудзі й Сувалкіі. І літоўскія сяляне, якія раней і ня чулі пра існаваньне Беларусі, рабілі страйкі, так, як раілі ім гэта рабіць беларускія сацыялісты, бо сваіх, літоўскіх тады яшчэ не было. Рэвалюцыйныя вершы Алаізы Пашкевіч-Цёткі, якімі нас так мучылі на ўроках беларускай літаратуры, у 1905-07 гадах шматразова друкаваліся-перавыдаваліся ці ня ўсімі партыйнымі арганізацыямі левага накірунку, што існавалі тады ў шматнацыянальнай Вільні.

Ахвярамі гэтай экспансіі сталі Максім Багдановіч зь берагоў Волгі й жыд Самуіл Плаўнік, які замест таго, каб адрошчваць пэйсы й сьпяваць вясёлыя хасыдзкія песьні, стаў беларускім літаратарам. Ды хто скажа, колькі людзей пад час руйнаваньня Расейскай імпэрыі паставілі сваё жыцьцё на беларускую карту, стаўшы беларусамі-нэафітамі? Ці адчувалі сябе агрэсарамі настаўнікі з младабеларусаў, што гвалтам і пагрозамі прымушалі жыхароў літоўскіх і польскіх анкляваў краю запісваць сваіх дзяцей у беларускія школы? Наўрад ці.

Апошнія дзесяць гадоў са старонак беларускіх выданьняў сто разоў на дзень паўтараецца тэзыс пра выміраньне беларускай нацыі, мовы. Паўсюдна шукаюцца й знаходзяцца ворагі, але гэта робіцца выключна дзеля таго, каб застрашыць саміх сябе. Тыя людзі ня ўцямілі, што культура, якая ажыцьцяўляе экспансію, сама ставіць сябе пад удар. І што адзіная культурная прастора — гэта месца, дзе сустракаюцца экспансіі. Беларусы ж чамусьці баяцца наносіць удары па сваіх ворагах, а калі такое адбываецца, то разглядаецца як выпадковасьць, сьмешная показка па палёх гісторыі.

Прыклады таго, як магла б праявіць сябе Беларусь па-за межамі тэрыторыі дзяжавы, ёсьць. Гэта хоць бы й мільённыя наклады кружэлак «Песьняроў». Дарэчы, днямі я знайшоў яшчэ адзін сьлед гэтай культавай каманды 70-х, і ў самым нечаканым месцы, на вокладцы кампакт-дыску найпапулярнейшага ўкраінскага рок-гурта «Воплі Відоплясова» «Краіна Мрій», дзе музыкі кажуць вялікі дзякуй Ісусу, «Пісьнярам» і чарнігаўскаму піву. Яшчэ адзін прыклад — раманы, напісаныя ў Менску беларускімі літаратарамі паводле відэа-тэлехітоў і прызначаныя для спажыўца «за Ўралам». Іх аўтары й працадаўцы былі абвінавачаныя ў амаральнасьці. Але ці маральна марыць пра вялікі кітайскі мур, які б адгарадзіў нас ад польскіх ксяндзоў і расейскай папсы?

Андранік Антанян

Вострая Брама

беларускі культурны кантэкст XX ст.

Супольны праект «Нашай Нівы» і беларускай рэдакцыі Радыё Свабода: рэпартажы, рэфлексіі, гутаркі — кожную нядзелю на зьмененых хвалях Свабоды. Кожную сераду — паўтор перадачы.

RADIO FREE EUROPE
RADIO LIBERTY

Кожную нядзелю на хвалях Радыё Свабода: Новыя Хвалі, Пастаянны Час, Нязьменная Свабода (ад 26 кастрычніка 1997)

Час	К/Hz	Хвалі
18.00 - 19.30	6000, 6170	49
	7155, 7295	41
	3695	75
22.00 - 23.30	6010, 6025, 6095, 6170,	49
	7155	41
	9750	31
06.00 - 07.00	5995	49
	7295, 7275	41
	9750	31
	3980	75

Паштовы адрас: 220005, Менск-5, п/с 111 У 22.00 беларускую праграму можна слухаць у Інтэрнэце: http:/www.rferl.org/bd/be/index.html

Заставайцеся са Свабодай!

Працяг акцыі

27-28 лютага ў Менску адбылася канферэнцыя «Палітычныя рэпрэсіі ў Беларусі ў XX ст.», арганізатарамі якой былі Беларускі Хельсынскі Камітэт і Беларуская Асацыяцыя Ахвяраў Палітычных Рэпрэсіяў. Непасрэдным кіраўніком праекту была Ніна Стужынская. Канферэнцыя стала працягам сынежаньскага сэмінару «Карныя органы Беларусі: гісторыя й сучаснасьць (да 80-х угодкаў ВЧК)».

Арганізатары й удзельнікі канферэнцыі сутыкнуліся з новымі беларускімі рэаліямі ўжо на стадыі падрыхтоўкі — так і не ўдалося зьняць у арэнду кіназалю, дзе меркавалася паказаць фактычна забаронены фільм «На Чорных лядах» паводле апавяданьня Васіля Быкава й арганізаваць выставу, прысьвечаную ахвярам палітычных рэпрэсіяў. Найбольш цягнуў час з адказам кінатэатар «Партызан» — значыць і надзеяў на яго было найболей. Але й гэтая ўстанова не атрымала дазволу ад уладаў Менску на такую акцыю. Урэшце, выстава адбылася ў невялікім пакоі ў гатэлі «Плянэта». Папярэдне была праведзеная цэнзура — зьнятыя ўсе стэнды па сучаснасьці, а гэта былі, найперш, фотаматэрыялы. Як можна было зразумець, галоўны аргумэнт наступны — канфэрэнцыя й выстава прысьвечаныя палітычным рэпрэсіям, а ў сёньняшняй Беларусі такой зьявы няма. На адкрыцьцё выставы «Крыжовы шлях» сабралося шмат людзей. Мяркуецца, што выстава далей паедзе па рэгіёнах Беларусі. Архіў Найноўшае Гісторыі падрыхтаваў на выставу сваю экспазыцыю па беларускім альтэрнатыўным друку 1970-1980-х гадоў.



Асобныя дробныя правакацыі ўчыняліся і пад час канфэрэнцыі. Так, на трыбуну патрапіў нікому невядомы чалавек з дакладам пра сучасныя рэпрэсіі супраць камуністаў Літвы. Спачатку заля яшчэ неяк стрымлівалася, але, калі інтэрфронтавец пачаў нахваляваць Лукашэнку, публіка ўжо выбухнула. Трэба ведаць паводзіны Аляксандра Лукашэнкі ў дачыненьні да ахвяраў рэпрэсіяў — ён пазбавіў іх законных льготаў, якія маглі быць толькі мізэрнаю кампэнсацыяй за зьдзейсненыя супраць мірных грамадзянаў злачынствы; падтрымлівае спэцыфічную ідэалягічную палітыку, якая вядзе практычна да апраўданьня масавых рэпрэсіяў (не выпадкова цяпер зноў загучалі ў афіцыйных мэдыях самыя адыёзныя імёны другой паловы 80-х — як, напрыклад, Адама Залескага).

Тут мы падалі палітычны кантэкст канфэрэнцыі. Цалкам пазбавіцца эмоцыяў было немагчыма, бо вялося пра масавыя рэпрэсіі, а палову залі складалі самі ахвяры рэпрэсіяў. Значэньне гэтай міжнароднай канфэрэнцыі ў тым, што практыка рэпрэсіяў была прааналізаваная як непазьбежная й заканамерная ўласьцівасьць таталітарнай сыстэмы на працягу ўсёй яе гісторыі — ад зараджэньня ў 1917 годзе да мэтастазаў сёньняшняга дня.

Алег Дзярновіч

Ад «Дзяцей Чарнобыля» да сумленьня Эўропы

На Беларусь пасьля амаль гадавой адсутнасьці вярнуўся старшыня дабрачыннага фонду Генадзь Грушавы. Гэтая зьвестка, пры ўсёй яе аптымістычнасьці, нарадзіла шэраг не зусім аптымістычных пытаньняў. Пасьля таго, як усялякая дабрачыннасьць ператварылася ў манаполію дзяржавы, пасьля глябальнай пераацэнкі гуманітарных каштоўнасьцяў установамі, дзе займаюць пасады асобы кшталту Галіны Ціцянковай і небезьвядомага таварыша, які замест аргумэнту выкарыстоўвае слова «граматамёт»... пасьля нацэльваньнем на «Дзяцей...» Грушавога пільнага вока ведамства сп. Шэймана. Як вядома, праверкі-ператрусы фонду прывялі да ўзбуджэньня супраць Генадзя Грушавога крымінальнай справы. Улічваючы такія «асаблівасьці нацыянальнага паляваньня», як справы Пупейкі, Клімава, Кудзінава, «цёплыя сяброўскія адносіны» афіцыйнага Менску да місіі АБСЕ і звыклыя выкрывальніцтвы «пераваротаў», на прэс-канфэрэнцыі 11 сакавіка так і хацелася абрынуць на дэпутата Грушавога ўсю заклапочанасьць ягоным лёсам.

Зрабіць тое было няпроста, бо «віноўнік урачыстасьці», то бок цікаўнасьці, сьціпла і гасьцінна даў слова для выступаў гасьцям Беларусі. Высьветлілася, што за нас вырашыла заступацца і аказваць падтрымку яшчэ адна міжнародная арганізацыя — Хельсынская Асамблея грамадзянаў, сябры якой маюць намер стварыць яе прадстаўніцтва, акрамя тых, што ёсьць у больш чым 30 краінах, таксама й на Беларусі.

Перш чым нарадзіцца ў 1990-м годзе як сталая арганізацыя, ХАГ зьявілася ў сярэдзіне 80-х як рух барацьбітоў за мір і дэмакратыю. Неўзабаве скончылася «халодная вайна», адбыліся дэмакратычныя пераўтварэньні ў Цэнтральнай Эўропе, і ўчорашнія дысыдэнты зразумелі, што адчуваюць сябе «грамадзянамі Эўропы», успрымаючы трагедыі і боль суседніх народаў. Эўропе былі патрэбныя не міжэтнічныя сутычкі і часам спэцыфічная трактоўка правоў нацыі (ва ўрон правам асобы). Ёй патрэбная была, як сказала на сустрэчы сёньняшні кіраўнік Асамблеі Мэры Калдаф, арганізацыя, што стала б «сумленьнем Эўропы». Дарэчы, адным са стваральнікаў і першым старшынём ХАГ стаў Вацлаў Гавэл. Сёньня арганізацыя мае штаб-кватэры ў Празе і Гаазе. За гады існаваньня яна займела досьвед працы з уцекачамі, а таксама мірным насельніцтвам, што церпіць, жывучы ў «гарачых кропках». Сябры ХАГ дапамагалі людзям з Босьніі, Грузіі, Арменіі, Азэрбайджану, зараз іхны найвялікшы клопат — падзеі ў Косаве, а таксама балючая для краін Эўропы праблема цыганскага насельніцтва. Што да Беларусі, то, як адзначаюць эўрапейцы, яны адчуваюць востры недахоп інфармацыі пра нас. «Мы ведаем, што тут існуе дэмакратычны рух, які ў некаторых выпадках моцна перасьледуецца», — акрэсьліў агульныя ўяўленьні адзін з актывістаў руху «Хартыя-77» ў Чэхаславаччыне Вацлаў Троян, які выказаў падтрымку пераемнай акцыі беларусаў — «Хартыі-97». Хельсынская Асамблея грамадзянаў мае на мэце дачыненьні як з асобнымі людзьмі ў Беларусі, так і зь недзяржаўнымі арганізацыямі, найперш маладзёвымі. Гэтыя дачыненьні традыцыйна складаюцца не на афіцыйным, а на чалавечым, асабовым узроўні. Праца з моладзьдзю ёсьць асобным накірункам дзейнасьці ХАГ: штогод для маладых грамадзянаў розных краін ладзяцца адмысловыя міжнародныя адукацыйныя сэмінары, сёлета яны маюць адбыцца ў Францыі, на Кіпры, у Чэхіі і Румыніі, дзе вельмі хацелі б бачыць і маладых беларусаў. Звычайна моладзь абмяркоўвае праблемы, зьвязаныя з дэмакратыяй, нацыяналізмам, правамі чалавека.

Калі Эўропа едзе пабачыць і падтрымаць Беларусь, то Беларусь шукае, са свайго боку, дыялёгу на роўных з Эўропай. 3-6 сакавіка ў якасьці прадстаўнікоў рабочай групы Асамблеі дэмакратычных недзяржаўных арганізацыяў Уладзімер Роўда і Генадзь Грушавы наведалі Брусэль і Маскву. Яны мелі сустрэчы з дэпутатамі Эўрапарлямэнту, кіраўніцтвам праграмы TACIS, сябрамі праваабарончых арганізацыяў.

На думку Ў.Роўды, Эўропа ўсё часьцей дэманструе жаданьне весьці дыялёг ня столькі з палітычнымі коламі нашай краіны, колькі зь яе недзяржаўнымі структурамі — у наяўнасьці пэўнае «зьмяшчэньне акцэнтаў». Як вынік, у Брусэлі цяпер маецца ня толькі прадстаўніцтва «Хартыі-97», але і Асамблеі дэмакратычных недзяржаўных арганізацыяў. А ў Маскве прайшла міжнародная канфэрэнцыя, прысьвечаная Беларусі і яе будучыні, у Цэнтры імя акадэміка Сахарава. Дэмакратычныя арганізацыі Беларусі і расейскія праваабаронцы («Мемориал», некаторыя іншыя) стварылі сумесны Беларуска-Расейскі Клюб у абарону дэмакратыі.

Беларускія рэаліі час ад часу змушаюць канстатаваць: тым, хто пакліканы быць абаронцам як дэмакратыі ўвогуле, так і канкрэтных людзей, з ласкі афіцыйных «сталпоў» у любы момант можа самім спатрэбіцца абарона. Ад заяваў пра «абсурд іх перабываньня тут» да абвінавачваньняў у «фінансаваньні перавароту» — усё гэта (відаць, пасьля Босьніі з Грузіяй) не настрашыла гасьцей як папярэджаньне. Лепш раз пабачыць... Але яшчэ лепш — пабачыць зусім блізка ды трохі збоку.

«Я ня ведаю, ці закрытая цяпер крымінальная справа ў дачыненьні да мяне, — адказаў на пытаньне сам Генадзь Грушавы. — Але я спадзяюся, што ў любым выпадку мой прыезд будзе на карысьць Беларусі». Па-мойму, карысны ўжо сам факт, што Грушавы зьявіўся на Радзіме ня факсам...

Таццяна Сыпко

ТАЯМНІЧАЯ ТУРКАЛЬ

*Працяг тэмы**

Гаворачы пра «дэшыфроўку» назвы сталіцы Чэхіі — Прагі, а таксама падобнай гучаньнем эстонскай Праагі, ды роднаснага паходжаньнем назова беларускага Брагіна, сэнс якіх можна вытлумачыць з эстонскай мовы — «брага», а таксама «слота» (па-расейску «слякоть»), хацелася б дадаць, што ў Варшаве ёсьць раён гораду, які носіць назоў «Praga». Гэты раён непасрэдна прылягае да ракі Вісты. Увесну 1997 году, калі я наведаў польскую сталіцу, я йшоў па Маршалкоўскай з варшавякам Паўлам, і, убачыўшы на адным з дарожных паказальнікаў надпіс «Praga», спытаўся: што ведае ён аб паходжаньні гэтага назову? Адказ: «Над гэтым ніколі не задумваўся». Выказаўшы сваю вэрсію аб «бразе» і «слоце», я раптам пачуў ад Паўла рэальнае пацьверджаньне правільнасьці сваёй гіпотэзы. Аказваецца, ён памятае тыя часы, калі пад час вясновай паводкі гэтая, нізкая прыбрэжная частка гораду, падтаплялася вадой. Улічваючы тое, што ўсе чатыры «Прагі» — чэская, варшаўская, беларуская і эстонская стаяць на берагах рэк, то «прага» — у сэнсе «брага», «слота» — ня што іншае, як месца, якое затапляецца пад час паводкі, і названыя паселішчы ўзьніклі ў непасрэднай адлегласьці ад такога месца. Назоў «Прага» — фіна-вугорскага паходжаньня, на карысьць гэтага гавораць таксама назвы рэк фіна-вугорскага паходжаньня, на якіх узьніклі гэтыя паселішчы.

Ці ёсьць нешта роднаснае ў паходжаньні назваў рэк: Вісла, Сьвіслач, Іслач? Цалкам верагодна. «Коми-пермяцко-русск[о]й словарь», які аўтар гэтых радкоў мае ў сваёй бібліятэцы, дае такое тлумачэньне: «візла́ч» — быстрина (в реке)». Ці хуткаплынная рэчка Іслач? Няхай, хто хоча, спраўдзіць, ад'ехдзе ад Менску пару дзясяткаў кілямэтраў! Кажуць, што ў гэтай рэчцы і сёньня водзіцца стронга, якая любіць хуткаплынныя, халодныя ручаіны, што жывяцца крыніцамі.

Між тым, у студзені гэтага году прыйшлося мне быць на журналісцкіх курсах, якія ладзіла фундацыя імя Льва Сапегі ў санаторыі «Сьвітанак», які стаіць на беразе вышэйзгаданай ракі. У вольны час я меў магчымасьць прагуляцца досыць вялікую адлегласьць уздоўж гэтае хуткаплыннае, са шматлікімі перакатамі, рачулкі, з чыстаю і празрыстаю вадою, у атачэньні пагоркаў Беларускага ўзвышша.

Алесь Шутаў, які зьяўляецца адным з творцаў аршанскай газэты «Куцейна», і зь якім мы разам жылі ў адным пакоі таго санаторыя, аказаўся цікавым суразмоўцам, яго таксама цікавіць тапаніміка. Паводле вэрсіі, назоў яго роднага гораду Ворша можна таксама вытлумачыць зь фіна-вугорскіх моваў, а менавіта — марыйскай. Цікава, што на тэрыторыі Марый-Эл назваў, падобных «оршы», досыць шмат. Дык вось: «Ор» — рэчышча, дзе цячэ вада, «Ша» — вада.

Мне могуць задаць пытаньне: навошта я тлумлю галаву людзям гэтымі назвамі фіна-вугорскага паходжаньня? Справа ў тым, што беларускія дасьледчыкі, і ў прыватнасьці тыя, якія «дэшыфруюць» тапанімічныя назвы, упарта адмаўляюць наяўнасьць у Беларусі назваў фіна-вугорскага паходжаньня, адносячы ўсе незразумелыя назвы выключна да балцкага паходжаньня. Тым самым даючы летувісам і латышам нейкую маральную перавагу. Тады зьяўляюцца, напрыклад, у Рызе, такія кнігі — «Беларусы як галіна латыскага народу», ці шкадаваньні ў розных гістарычных працах, што латыская армія ў часы фармаваньня незалежнае Латыскае дзяржавы была яшчэ слабой і не змагла сваечасова заняць такія спрадвечныя латгальскія гарады як Дзісна, Дрыса (цяпер Верхнядзьвінск), Браслаў, Асьвею і Полацак, які «зьяўляецца старажытнай сталіцай Латгаліі». (Я пражыў 15 гадоў у Латвіі і сустракаў такія публікацыі ў друку, чуў выказваньні дужа вядомых латышоў).

Між тым, значная частка беларускай лексыкі зьяўляецца не славянскай, а фіна-вугорскай. Пагартаем той самы «Коми-пермяцко-русск[о]й словарь». У беларускім Пантэоне ёсьць Ярыла, паводле а. Льва Гарошкі — бог прарастаньня палёў, любові, сілы і адвагі. Згодна гэтаму слоўніку Ярыла тлумачыцца як «Яр» — яркі, сьветлы, зіхцець; «ыло» — удалечыню, далёка. Вобразна, як мне падаецца, Ярылу можна параўнаць з Сонцам (яркі + далёкі). Знаходзім такія словы: «гурт» — статак; «надзея» — надзея; «зык» — шум, гам; «долонь» — далонь; «вер[о]с» — ядловец; «вын» — сіла (напэўна, адсюль словы «выносьлівы», «выносіць»); «веса» — цяжкі; «баюн» — гаварун; «берба» — вярба; «бодёр» — бадзёры, энэргічны; «бокі» — міма; «волька» — вольха і шмат іншых, аднак заўважу, што аналягаў комі-пярмяцкіх і

Наша «Каралеўства» ў Слупску

Невялікае ваяводзкае места Слупск на захадзе польскага Памор'я, альбо па-нямецку — Памэраніі, стала вядомым некалькі месяцаў таму ледзь не ўсяму сьвету. Тут паліцыянты забілі падлетка, і гэтая падзея, што абурыла мясцовае грамадзтва, стала прычынаю хваляваньняў і сутычак з уладамі, яшчэ й дагэтуль працягвае турбаваць горад і непакоіць усю Польшчу. Апроч гэтага, ды апроч таго, што жыве там крыху больш за сто тысяч чалавек, мне практычна нічога не было вядома пра месца чарговага спатканьня нашаніўскага фэстывалю посткаляніяльнага мастацтва «Каралеўства Беларусь» з польскай публікай.

У падарожжа мы выбраліся ўдвох з мастаком Віктарам Пятровым-Хруцкім. Ад самага пачатку нам не шанцавала — у тлуме варшаўскага трамвая выцягнулі з кішэні грошы, і, каб ехаць далей, давялося тэрмінова пазычыць у варшаўскіх калегаў «златуўкі» на білеты. Цягнік да Гдыні, дзе мы мусілі перасесьці ў наступны, да Слупску, фатальна спазьніўся, і, саскочыўшы зь яго на гдыньскім пэроне, мы ўбачылі, як паволі рухаюцца міма вагоны нашага экспрэсу. У адчаі мы йрвануліся за апошнім. Я ўчапіўся і ўскочыў. Віктар адстаў. Але зразумеўшы, што апошнія грошы й білеты засталіся ў яго, я, натхнёны амэрыканскімі баевікамі, рынуўся зь цягніка. Пасьля кароткага палёту на асфальт пэрону — фэервэрк зорак у вачах. На шчасьце, барэтка спрацавала ня горш за сталёвую каску, і, дзякуючы ёй, я застаўся жывы, а «Каралеўства», урэшце, сустрэлася з жыхарамі Слупску.



Першы зь іх сустракаў нас на слупскім вакзале — Уладэк Казімерчак, дырэктар Бюро Мастацкіх Выставаў. Уладэк, зь якім мы пасьпелі за тры дні пасябраваць, адзін з шматлікіх «новых палякаў», якіх даводзілася мне сустракаць за апошнія гады. «Новы», зусім ня ў тым сэнсе, у якім у нас кажуць «новы рускі», але таму, што ён — сапраўды новае фармацыі, не зьвязаны са старою намэнклятураю, крэатураю сучаснай дэмакратычнай Польшчы. З пакаленьня саракалетніх, а значыць, мае досьвед жыцьця і працы яшчэ «ў апазыцыі», займае цяпер даволі адказны адміністратыўны пост у «культурнай сфэры» — яму падпарадкоўваюцца некалькі дзяржаўных галерэяў ва ўсім ваяводзтве, а ў мястэчку Устка, дзе мы жылі на самым беразе Балтыйскага мора, у ягоным дзяржаньні буйны культурны цэнтар, з гатэлем і мастацкай кавярняй. Сам ён — мастак, майстар артыстычнага пэрфомансу, а яшчэ й сур'ёзны палітык — кіраўнік ваяводзкай філіі Уніі Вольнасьці, працуе таксама й як журналіст. Апроч усяго яшчэ й файны хлопец, інтэлектуал і дасьціпны субяседнік. Зь ягонае ініцыятывы культурнае жыцьцё ў Слупскім ваяводзтве буяе — рэгулярна розныя выставы, міжнародныя плэнэры. А чаго варты адзіны ў Польшчы фэстываль пэрфомансу «Замак уяўленьня», які адбываецца штогод у сярэднявечным крыжацкім замку Бытаў. За пяць гадоў існаваньня фэстывалю ў ім прынялі ўдзел больш за 150 мастакоў з 23 краінаў. На сёлетні ўпершыню запрошаны і мастак зь Беларусі — Віктар Пятроў-Хруцкі.

Нашая выстава адчынілася 6 сакавіка ў невялікай галерэі «Воднік», у самым цэнтры места на пляцы Стары Рынак, у памяшканьні, якое дзеляць паміж сабою бюро падарожжаў «Воднік» і рэдакцыя мясцовай філіі «Газэты Выборчай». Пасьля ўсіх прыгодаў дарогі, нашае жыцьцё, мантаж і адкрыцьцё выставы ўспрымаліся намі проста як Элізіюм. На вэрнісаж, нават крыху для нас нечакана, сабралася поўна народу. На сваё зьдзіўленьне — бачу на марынарках у некаторых бел-чырвона-белыя значкі, падыходзяць, цікавяцца, пытаюцца, як там наша Беларусь, чую беларускую гаворку. Потым дайшло да мяне, што тут, на былых нямецкіх землях па вайне засялялі перасяленцаў зь Беларусі — тых, хто запісваўся палякамі і ад'яжджаў «на радзіму». У многіх засталіся сваякі, хтосьці бываў у Менску. Ад бясконцых размоваў, прамоваў, інтэрвію пачынае балець сківіца. Цікавасьць — надзвычайная, спачуваньне й разуменьне нашых праблемаў проста кранальнае. Адкрыцьцё заканчваецца позьнім вечарам ва ўтульнай піцэрыі недалёка ад Старога Рынку. На разьвітаньне Казімер Ялоўчык, мастак з-пад Ваўкавыску, чысьцюсенькa па-беларуску нагадвае нам біблейскую парабалу пра работнікаў, якія прыйшлі рана й атрымалі дынар, а іншыя падыйшлі пазьней — і атрымалі тое ж. Бог мае сваю ўласную, не мэркантыльную рацыю й ведае каму даць раней, а каму пазьней. «Веру — у Беларусі будзе годная будучыня, бо вы заслужылі на яе».

А на дзень Волі сьцягі нашага «Каралеўства Беларусь» залунаюць над Беластокам.

Вацлаў Арэшка







расейскіх — яшчэ больш!

Знайшоў некалькі словаў, якія ў беларускай мове лічацца вульгарнымі, а ў комі-пярмяцкай — літаратурнымі: «карга» — варона; «лярва» — зубаскал... Знайшоў цікавае слова «гавед» — дзеці, дзятва. Яно, здаецца, у беларускай мове не ўжываецца, але ёсьць у арсэнале маёй маці (родам з Полаччыны). Калі летам шпакі робяць налёты на нашыя сьпелыя вішні, яна, звычайна, прыгаворвае: «Ну, гаведа, ратунку ад вас няма!» А я думаў — дзе яна такіх словаў «набралася»!

Ёсьць некалькі словаў, па якіх я магу вытлумачыць паходжаньне назваў некаторых бліжэйшых ад Глыбокага населеных пунктаў. «Веретя» — сухая града на балоце. У вёсцы Вераце пад Глыбокім нарадзіўся беларускі эміграцыйны пісьменьнік Кастусь Акула (Таронта, Канада). «Відз» — луг, пакос, пожня. Пад Браславам ёсьць мястэчка Відзы. Казаў пра тое Кастусю Шыдлоўскаму, браслаўскаму гісторыку. Ня верыць! Кажа адно — назва балцкага паходжаньня! Цікава, што слова «відз» перакладаюць на расейскую мову як «пожня». Слова «пожня» вельмі распаўсюджанае на Глыбоччыне, аднак я ніколі яго не сустракаў у мове расейскай, між тым слоўнік перакладае яго менавіта так — «пожня».

Мне падаецца, што Іван Ласкоў, які апублікаваў сэнсацыйны артыкул «Племя пяці родаў» (ЛіМ, №33"1989), блізкі да ісьціны, адносячы назву гораду Вільня да фіна-вугорскіх. «Віль» — новы. «Вілін» — цаліна, ноў, навіна. Вільня — новы горад. Ёсьць, дарэчы, з такім коранем горад у Эстоніі — Вільяндзі, а ў Расеі — Вільгорт («віль» — новы, «горт» — дом). Тэрыторыя колішняй Віленшчыны скрозь усыпана назвамі фіна-вугорскага паходжаньня. Ашмяны: «ош» — мядзьведзь, «ошма» — мядзьвежая рака; Ашмяны — на мядзьвежай рацэ. (Старажытны герб Ашмянаў — мядзьведзь!) Вайстом, вёска непадалёк ад Вялейкі, утрымлівае характэрны канчатак «-т[о]м» — без, не. Вайстом — паселішча, дзе няма хвойнага лесу («вольт[о]м» — неачышчаны, «в[о]рт[о]м» — бязьлесы). Пад Глыбокім ёсьць вёска Варганы. Хаця і некаторыя тлумачаць назву словамі «вар гані!», аднак гэта таксама назоў фіна-вугорскага паходжаньня: «ворга» — сьцежка ў лесе; Варганы — паселішча на лясных сьцежках. Ворга — ёсьць такое мястэчка і на Смаленшчыне.

На гэтым тле, сапраўды, як заўважыў Іван Ласкоў, назва старажытнай беларускай дзяржавы Літва, а таксама імёны вялікіх князёў літоўскіх: Альгерд, Вітаўт, Жыгімонт, Міндоўг, Гедымін, Радзівіл, ды шмат іншых, якія даволі лёгка можна вытлумачыць з комі-пярмяцкай мовы, сьведчаць, што ў пэўны пэрыяд, не апісаны летапісамі, у Беларусі жылі фіна-вугорскія народы, продкі эстонцаў, комі, мардвы, марыйцаў і фінаў. Яны пакінулі значны сьлед у тапаніміцы і лексыцы Беларусі, у яе гісторыі, міталёгіі і антрапалягічных рысах беларусаў.

Я не лінгвіст, і таму ў мяне няма пэўных комплексаў, зьвязаных з гэтай прафэсіяй. Мяне, як краязнаўцу, таксама цікавяць гэтыя гістарычныя праблемы і я не абцяжарваю сябе забабонамі — «гэтага ня можа быць толькі таму, што ня можа быць». Усё можа быць! Паглядзіце на мапу Беларусі. Поўнач Віцебшчыны. Якія цікавыя назвы азёраў (пішу ў расейскай транскрыпцыі): Ордово, Ситно, Свино, Медесно, Ведето, Сесито, Лосвидо, Лисно, Нещердо, Обстерно... Хто пакінуў гэтыя назвы? Пэўная частка іх можа быць і славянскага, і балцкага паходжаньня. Трапляе мне аднойчы мапа Швэцыі, на жаль, дужа вялікага маштабу, але знаходжу дзьве цікавыя назвы азёр: Venern і Vettern. Ці не сугучныя яны сваімі суфіксамі «-ern» з такімі назвамі як Обстерно і Нещердо? Дзе канчатак «-о» можа быць і прыстаўным, славянізаваным. Obstern сугучна з тым жа Venern і Vettern. Я ня ведаю ні італьянскай, ні французскай, ні нямецкай моваў, аднак гэтыя мовы на слых я адрозьніваю адну ад другой: калі іх чую ў эфіры, вызначаю дакладна, якая мова гучыць. Ці жылі ў Беларусі вікінгі? Жылі! Пра гэта сьведчыць культ барана (казла), які некалі існаваў на Глыбоччыне. У Скандынавіі казёл быў прысьвечаны Тору-Перуну, боству земляробства і сямейнай аселасьці. Тор езьдзіў на фурманцы, якая была запрэжаная двума казламі. Сымболіка глыбоцкае свастыкі дзесь нітуецца з паходжаньнем культа казла, бо ў свастыцы старажытныя бачылі Сонца, перакрыжаваньне маланак, молата Тора-Перуна.

Туркаль, якой прысьвечаны сымбаль, выбіты на адным з камянёў Глыбоччыны — матэматычны вобраз, вылічаны на паперы, гэта — дзьверы ў дагістарычнае мінулае, дзьверы, якія яшчэ трэба адчыніць!

На малюнку: старажытны сымбаль, выбіты на адным з камянёў на Глыбоччыне.

Уладзімер Скрабатун

*Гл. папярэдні нумар.

«Я БАЦЬКАЎШЧЫНЫ НЕ

Калі б меў Твой супакой у душы і Тваю ўладу ў краіне, павесіў бы сто чалавек, вызваліў бы шэсьць мільёнаў.

Зь ліста Якуба Ясінскага да Тадэвуша Касьцюшкі

... Маю гонар упэўніць Вас, што безь бібліятэкі, мэблі і экіпажаў можна быць вельмі шчасьлівым, ня будучы рабом...

Зь ліста Якуба Ясінскага да кіраўніка расейскае акупацыйнае адміністрацыі Вільні

1794 год, лістапад. Прага ў агні. На вачах зьмярцьвелае ад жаху Варшавы войскі фэльдмаршала Суворава высякаюць прадмесьце. Вісла падзяляе гледачоў на адным беразе й гінучых на другім. Адзіны мост, які іх зьвязвае, ня можа прапусьціць усіх уцекачоў ад сьмерці, і няшчасныя тонуць тысячамі. На наступны дзень рака будзе чырвонаю ад крыві і выйдзе зь берагоў. Мабыць тым, што ўтанулі пры пераправе, больш пашанцавала, чым тым, каго п'яная ад крыві салдатня паліла жыўцом, секла шаблямі, дзідамі, гвалціла, зьдзеквалася. Ды няўжо жаўнеры-хрысьціяне, падданыя імпэратрыцы, што сябравала зь Дзідро і Вальтэрам, рабілі такое? Шматлікія сьведкі гавораць пра адно: як немаўлят адрывалі ад матчыных грудзей і насаджвалі на дзіды, як законьніц зачынілі ў Бэрнардынскім кляштары, згвалцілі і засеклі, як 19 законьнікаў і старцаў-калек закатавалі да сьмерці, як 25 тысячамі скрываўленых, пасечаных цел старых, жанчын і дзяцей было ўсеяна ўсё прадмесьце. Сярод распранутых трупаў жаўнераў і мірных жыхароў уперамешку валяліся забітыя коні, сабакі, каты, нават сьвіньні, — бязьлітасна зьнішчалася ўсё жывое.

Сярод гэтага пекла, калі сэрцы многіх мужных дагэтуль людзей страсяніліся, знайшліся тыя, хто быў ня ў стане перажыць Бацькаўшчыну, хто жадаў загінуць са зброяй у руках. За палісадамі Зьвярынца (раён Прагі) стрымлівалі ворага рэшткі двух літоўскіх рэгімэнтаў і полк габрайскае лёгкае кавалерыі Бэрэка Ясялевіча — усе пад камандай маладога генэрал-лейтэнанта войскаў ВКЛ Якуба Ясінскага. Неўзабаве ўсё было скончана... Гарматныя стрэлы раздаваліся пахавальным салютам Рэчы Паспалітай.

***

Як гэта часта бывае, пра першыя крокі гістарычнае асобы нічога, ці амаль нічога невядома. Калі нарадзіўся і дзе? Біёграф Ясінскага Генрык Масьціцкі, а за ім і шэраг польскіх дасьледчыкаў называюць Вэнглеў каля Пыздраў, што на Куявах. Але ж ня менш і нязгодных, тых, хто лічыць Бацькаўшчынай героя Вялікае княства Літоўскае, да чаго схіляюць ускосныя зьвесткі. У прыватнасьці, пасада камэнданта інжынэрнага корпусу ў Вільні, якую ён займаў у пачатку 90-х гадоў, як і ўсе вышэйшыя дзяржаўныя і вайсковыя пасады ў Вялікім Княстве, надавалася ўраджэнцам ці жыхарам Літвы. Нарадзіўся Ясінскі 24 ліпеня ў 1759 годзе, ці на два гады пазьней.

У 12 гадоў Якуба аддаюць ў Кадэцкі корпус у Варшаве (ці, як ён яшчэ называўся, у Рыцарскую школу). Да гэтага часу хлопчык ужо ведаў лаціну, нямецкую і французскую мовы.

Стан арміі быў такім жа, як стан дзяржавы. Гусарскія харугвы, напрыклад, гонар Рэчы Паспалітай, яе элітарная цяжкая кавалерыя, што наводзіла жах на ворагаў, ужо ня несьлі вайсковае службы, а толькі ўдзельнічалі ў парадах, урачыстасьцях ды пахавальных працэсіях — «пахавальныя жаўнеры», як звалі іх сучаснікі. Перад Станіславам-Аўгустам востра стаяла пытаньне аб стварэньні новага войска. Афіцэраў было зашмат, а сэнсу ніякага. Новыя вайсковыя кадры — фундамэнт пры будаўніцтве новае Рэчы Паспалітай. У 1765 г., нягледзячы на стагнацыю і розныя перашкоды, кароль адкрывае Рыцарскую школу. Празь некаторы час Станіслаў-Аўгуст з гонарам казаў, што лепшае вайсковае ўстановы больш нідзе не існуе.

Рапарты сьведчаць аб здольнасьцях Ясінскага. Ня маючы схільнасьці да сыстэматычнае працы, ён больш спадзяваўся на сваю памяць, а калі і браўся за пяро, дык для таго, каб пісаць вершы. Якая там вучоба! За сьценамі Корпуса кіпела жыцьцё! Людзі цягнуліся ў Варшаву ня толькі з краю, але і з-за мяжы. Правінцыя глядзела на сталіцу Кароны з захапленьнем і абурэньнем адначасова. А гядзець было на што: мноства крамаў, тракціры адчыненыя далёка за поўнач.

У 1783 г. Якуб прыняты ў лік афіцэраў Корпуса ў званьні падбрыгадзіра. Нарэшце, можна з галавой акунуцца ў сьвецкае жыцьцё! Пасьля Вялікага Паста цэлы год быў адным суцэльным карнавалам — званыя абеды, асамблеі, пікнікі, вячэры, віно, дамы, карты... Ясінскі стаў гульцом вышэйшае клясы і садзіўся за зялёны столік з самымі вялікімі шулерамі свайго часу.

Перакананьні маладога чалавека фармуюцца пад уплывам Русо. Ідэі гэтага філёзафа эпохі Асьветы аказвалі моцнае ўзьдзеяньне на чалавека зь няпэўнымі поглядамі, Русо быў вельмі папулярны сярод эўрапейскае моладзі. Пройдзе дзесяць гадоў, і вучні Жан-Жака ўсталююць у Францыі крывавую дыктатуру ў імя высокіх ідэалаў Свабоды, Роўнасьці і Братэрства. На фармаваньне поглядаў Ясінскага аказаў уплыў і шчэжэцкі стараста Пётра Патоцкі — патрыёт і праціўнік Расеі. Праз Патоцкага Якуб уваходзіць у патрыятычныя сфэры Варшавы.

Кар'ера ідзе ўгору. Па пратэкцыі генэрала артылерыі ВКЛ кн. Сапегі Станіслаў-Аўгуст прызначае Ясінскага, у той час ужо падпалкоўніка, і капітана інжынэрыі Міхала Сакальніцкага ў кіраўніцтва створанага ў 1780 г. у Вільні Корпуса артылерыі і ваеннае інжынэрыі, а ў пачатку 1789 г. ім жа даручае арганізацыю Корпуса інжынэраў ВКЛ. Пад'ём вайсковае справы праходзіў у рэчышчы пастановаў 4-гадовага Сойму 1788-1792 г., скліканага з ініцыятывы патрыятычнае партыі на чале з Гуга Калантаем, Станіславам Сташыцам ды іншымі.

Пасьля травеньскіх урачыстасьцяў 1791 г. Ясінскага накіроўваюць для рэвізіі работ на будаўніцтва канала Мухавец-Піна, ці т.зв. Каралеўскага канала. 13 студзеня 1792 г. Станіслаў-Аўгуст прысуджае яму званьне палкоўніка інжынэрыі ВКЛ. Пакуль Якуб мірна працуе на канале, абстаноўка ў краіне накаляецца з кожным днём. Частка шляхты, убачыўшы ў рэформах наступ на свае правы, стварае ў 1792 г. у Тарговіцы Канфэдэрацыю. Расея пільна сочыць за тым, што адбываецца ў Рэчы Паспалітай і ўвесь час умешваецца ў яе ўнутраныя справы. Праз год пасьля прыняцьця Канстытуцыі 3 траўня правадыры Тарговіцы прыяжджаюць у С.-Пецярбург і дамаўляюцца аб падтрымцы расейскіх войскаў. Расейскі генэрал Міхаіл Крачэтнікаў выкарыстоўвае штучны повад («Расея доўга цярпела крыўды ад Сойму») і 22 траўня 1792 г. на чале 32-х тысячнае арміі парушае межы Вялікага Княства. Агрэсарам супрацьстаяла каля 15 тысячаў літоўскага войска, патрыятычных, але недасьведчаных і дрэнна забясьпечаных жаўнераў. Пачалася вайна.

Расейцы бяруць адзін горад за адным, да іх далучаецца Прусія, — краіна ў коле ворагаў. Вакол здрада і анархія, — на працягу месяца наша войска знаходзіцца пад кіраўніцтвам камандзіраў, якія зьмяняюць адзін аднога. Ясінскі з горыччу вымушаны прызнаць, што бяда ня ў тым, што інжынэрны корпус, на чале якога ён стаіць, разам з артылерыяй можа выставіць толькі каля тысячы байцоў, а ў тым, што бракуе часу, каб зрабіць з гэтае тысячы добрых афіцэраў, кожны зь якіх павёў бы ў бой дзясяткі, сотні жаўнераў.

Праз тры тыдні з пачатку агрэсіі Якуб удзельнічае ў бітве пад Мірам. Як сьведчыць Сулкоўскі, ён са сваімі пехацінцамі паказваў цуды гераізму, вытрымліваючы на працягу 45 хвілінаў шквальны агонь варожае артылерыі, у той час, як літоўскія 3-фунтовыя снарады не даляталі і да паўшляху. Бітву прайгралі. Ясінскі з Сакальніцкім яшчэ вераць, што нешта можна зрабіць, і праводзяць вялікую працу па ўмацаваньні важнага стратэгічнага аб'екта — Нясьвіжа. Войска ВКЛ магло ганарыцца такімі афіцэрамі, але... Расейскі генэрал Ферзэн бярэ Нясьвіж без адзінага стрэлу. Сакальніцкі ўспамінаў: «З таго ўсяго, што зрабіў, нічога не было выкарыстана; і толькі маскалі скарысталіся маёй працай [...]. Гэта вобраз нашае вайны».

Пасьля Нясьвіжу Ясінскі ўмацоўвае Берасьце, пад якім пасьля мірскай бітвы стаяла войска. 23 чэрвеня каля гэтага гораду адбылася бітва — самая значная за ўсю кампанію 1792 г. Плян ваенных дзеяньняў, распрацаваны Ясінскім, зьявіўся новым этапам у разьвіцьці ваеннага мастацтва ў Рэчы Паспалітай. У ім прапаноўвалася пасьлядоўнае правядзеньне баёў дзеля стрымліваньня, з выкарыстаньнем мясцовых забудоваў і стараннае артпадрыхтоўкі. Генэрал Міхал Забела пісаў, што Якуб злучаў у сабе веды ваеннага мастацтва з адвагаю і руплівасьцю. За бітву пад Берасьцем Ясінскі быў узнагароджаны Залатым крыжом «Віртуці Мілітары».

На жаль, вынік ужо нічога не вырашаў. Станіслаў-Аўгуст пакорліва далучаецца да т.зв. Генэральнае Канфэдэрацыі, створанае пад пратэктаратам Кацярыны II, і 26 ліпеня аддае загад абодвум войскам Кароны і Княства скласьці зброю. Кропку паставіў ганебны Сойм у Горадні, які ўхваліў у пачатку 1793 г. II падзел Рэчы Паспалітай. На караля балюча глядзець — міжволі бачыцца падабенства зь Людовікам XVI. У такіх умовах афіцэрства, «не жадаючы бачыць сваёй ганьбы», выходзіць з арміі. Выйшлі ўсе лепшыя афіцэры. Як пісаў Сулкоўскі: «Засталіся адны абмежаваныя абываталі». Але сярод тых, хто падаў у адстаўку, мы ня бачым палкоўніка Ясінскага. Якуб лічыў, што дзеля будучыні, дзеля падтрыманьня баяздольнасьці войска лепш застацца. Маральную падтрымку аказаў яму ў гэтым Тадэвуш Касьцюшка. У студзені 1793 г. Ясінскі вяртаецца ў Вільню і працуе над узнаўленьнем корпуса інжынэраў.

Захоплены прыкладам французаў, ён становіцца самым радыкальным сярод патрыётаў і ўпэўнены, што ганьбу, якую столькі гадоў зносіць Бацькаўшчына, змые толькі кроў. Патрэбная рашучасьць і бязьлітаснасьць. Аднойчы Якуб нават выказаў думку, што краіну нельга выратаваць, калі ня высекчы ўсю шляхту. На такі змрочны жарт яго штурхала скрайняе раздражненьне, бо ён добра бачыў, да чаго давяла краіну шляхта ў сваёй упартасьці і вузкасьці поглядаў.

З восені пачынае адчувацца неспакойнае бражэньне. Уся Рэч Паспалітая паступова пакрываецца сеткай канспіратыўных арганізацыяў. Многія разумелі, што выбух непазьбежны. Касьцюшка едзе ў Парыж, дзе беспасьпяхова імкнецца атрымаць дапамогу французаў. Ясінскі становіцца душой канспірацыі ў Вільні. Каб не было падазрэньняў, ён прымае маску чалавека, ляяльнага да акупантаў, і водзіць знаёмства зь людзьмі, якія прадалі Бацькаўшчыну. За лепшае месца для падпольнага штабу Ясінскі палічыў картачны салён свайго ад'ютанта і злога генія Ігнація Хадкевіча. (Дарэчы, гульня ў карты істотна дапамагала ў папаўненьні касы. Вось, напрыклад, дзеячы руху Дуклан Ахоцкі і капітан Качаноўскі ўзялі са сьціплай касы каля 2-х тыс. злотых, а празь некаторы час, паезьдзіўшы па краіне, пагуляўшы, папіўшы, вярнулі назад 15 тыс. дукатаў, а гэта 53 кг золата!)

Калі выдавалася вольная хвіліна, Ясінскі піша вершы. Праўда, ён цьвяроза ацэньвае свае здольнасьці: «Пішу тое, што хачу, і аб тым, што мяне цікавіць, пахвалы не шукаю...»

Ясінскі ірвецца ў бой, і хоча пачаць выступленьне ў дзень 19 лістапада — гадавіну, калі Францыя вырашыла дапамагаць усім прыгнечаным нацыям. Не хапала вытрымкі, верх брала жаданьне пакрасавацца перад усімі ў парадным мундзіры на белым кані з шабляй нагала. Ён быццам не заўважае непадрыхтаванасьці і дрэннае забясьпечанасьці войскаў. Але хада падзеяў падштурхоўвалася і зь іншага боку. У пачатку 1794 г. да акупантаў пачалі даходзіць зьвесткі пра канспірацыю. Людзей сталі падвяргаць рэпрэсіям толькі праз адно падазрэньне. З пачаткам арыштаў у Літве ўлады даведаліся і пра Ясінскага. Гетман Касакоўскі і камандзір віленскай залогі генэрал Арсеньеў, мабыць, нямала зьдзівіліся, калі зразумелі, з кім пілі каву і рэзаліся ў карты. Якуба своечасова папярэджваюць, і ён хаваецца на Антокалі, адкуль едзе пад Вільню ў Вількамірскі павет, дзе стаяць верныя яму рэгімэнты. Каб ня кідацца ў вочы расейцам, Ясінскі вымушаны зьмяніць бліскучы мундзір на сялянскую вопратку.

Нарэшце канспіратары вырашаюць, што час больш не працуе на іх. Пачынаць, вядома, трэба было зь Вільні. Кітовіч ва «Ўспамінах» сьведчыць, што ў Ясінскага было 240 жаўнераў супраць 900 расейскіх, а паводле Карзона 380 жаўнераў ўзялі ў палон 1012 расейцаў — у любым выпадку бачная перавага ворага.

Вільня. Ноч з 22 на 23 сакавіка 1794 г., цішыню парушае гарматны стрэл — сыгнал да паўстаньня. Перамагчы ў адкрытым баі ворага, які толькі ў людзях меў васьміразовую перавагу, мог толькі Напалеон ці гетман Хадкевіч, таму Якуб спадзяецца на раптоўнасьць і рашучасьць. Залога, узятая зьнянацку, амаль не аказала супраціву. Былі чутныя толькі рэдкія стрэлы... Ясінскі на сівым кані паказаўся перад расейцамі. Сваім выглядам ён нагадваў Сьв. Юрыя. Ні ў каго не падняла ся рука стрэліць у яго... Раніцай Вільня сустрэла Волю.

На другі дзень законная ўлада на чале зь Ясінскім абвясьціла «Універсал да ваяводзтваў і паветаў ВКЛ», у якім паведамлялася аб выкананьні доўгу мужнымі войскамі палкоўніка Ясінскага і вызваленьні краіны ад ворагаў. У Кароне бачылі адрозьненьні «Універсалу» ад свайго «Акту паўстаньня». Асяродзьдзе Касьцюшкі асьцерагаецца літоўскага сэпаратызму. Падазронасьць палякаў, жаданьне цалкам падпарадкаваць нашыя абшары і безразьдзельна дамінаваць у літоўскіх справах прынесла шмат шкоды патрыятычнаму руху. У сваю чаргу Вялікае Княства ніколі не адмаўлялася дзейнічаць з Каронай рука ў руку дзеля ўсеагульнае волі, ды яшчэ і прызнала вярхоўнае кіраўніцтва паўстаньнем у асобе Касьцюшкі.

25 красавіка ў Вільні адбываецца пакараньне сьмерцю гетмана Касакоўскага за нацыянальную здраду. Галоўным ініцыятарам пакараньня быў Ясінскі. Гэтая падзея не спрыяла росту ягонага аўтарытэту ў вачах шляхты; для шляхты Якуб заставаўся занадта радыкальным. Па прыкладу французскіх рэвалюцыянэраў, наш палкоўнік быў прыхільнікам усіх саслоўяў.

Некаторы час Ясінскі валодае ў Княстве дыктатарскімі паўнамоцтвамі. 4 траўня абываталі Літвы ўбачылі адозву: «Зьнішчайце здраднікаў і забойцаў і не чакайце ніякага правасудзьдзя, якое часта спазьняецца. Ці мы, ці яны». Эгацэнтрызм Ясінскага пашыраў шыхты неспрыяльнікаў. Для многіх ён — «літоўскі сэпаратыст і якабінец».

Касьцюшка ўзводзіць Ясінскага ў генэрал-лейтэнанты, але не ад шчырага сэрца, а таму, што асьцерагаецца прэтэнзіяў на вярхоўную ўладу. У «Праклямацыі», выпушчанай ім, падкрэсьліваецца, што генэралы Ясінскі, Грабоўскі і Хлявінскі, якія дзейнічаюць у Літве, — усяго толькі камандзіры аддзелаў ягонага войска.

Супраціўныя бакі робяць няўдалыя спробы затушыць паўстаньне. 10 траўня прускі

ПЕРАЖЫВУ...»

генэрал Фафрат на чале 11 тыс. жаўнераў парушыў межы Рэчы Паспалітай. Фафрат быў служакам старой школы, і яго дзеяньні зусім не грунтаваліся на рэальных абставінах, здавалася, што ён ваяваў не з жывымі людзьмі, а з васковымі постацямі. І ў расейцаў адбыліся перамены. Замест Ігельстрома, які ўцёк з пачаткам выбуху, вярхоўным галоўнакамандуючым рэскрыптам ад 22 чэрвеня прызначылі 60-гадовага князя Мікалая Рапніна, — таксама, у пэўным сэнсе, знаходку для паўстанцаў. Старога князя ўжо не турбавала славалюбства, ён жадаў толькі супакою і цішыні, але ў сілу канцылярскіх хітраспляценьняў выбар паў чамусьці менавіта на яго. Як і трэба было чакаць, пачатак дзейнасьці Рапніна адзначыўся незвычайнай асьцярожнасьцю і адсутнасьцю якога-колечы пляну.

Ясінскі тым часам пакідае адміністратыўную працу ў Вільні і бярэцца за шаблю. Першая бітва, у якой ён удзельнічае — пад Немянчынам, скончылася паразай ліцьвіноў, пад Палянамі — таксама. А тут яшчэ пачынаюцца непаразуменьні з паплечнікамі. Старэйшых афіцэраў раздражняла неабходнасьць падпарадкоўвацца маладому выскачку. Хлявінскі, напрыклад, паказваў яўную несубардынацыю. Касьцюшка паставіў кропку прызначэньнем генэрала Вяльгорскага галоўным камэндантам войскаў ВКЛ. Памяркоўныя былі вельмі задаволеныя — больш шыбеніц ставіць ня будуць.

Якуб засыпае новага кіраўніка рапартамі, проста ўмольваючы яго ўмацоўваць сталіцу, і ў спазоры такіх абставінаў высылаць партызанскія атрады за расейскі кардон. Замест гэтага Вяльгорскі загадаў вывесьці войскі зь Вільні ў Лідзкі павет, а сам напісаў расейскаму генэралу Кнорынгу, прапануючы здаць горад. Не падазраваючы, што такое творыцца зусім побач, Ясінскі чакае галоўнага камэнданта ў лягеры пад Соламі, куды той і не зьбіраецца ехаць. Прамарнаваўшы шмат часу, Якуб, у якога было каля 4 тыс. жаўнераў, вырашыў атакаваць два расейскія корпусы — Зубава і Бэнігсэна (каля 5 тыс. чалавек і 16 гарматаў). Бітва, што адбылася пад Соламі — адна з найбольш крывапралітных пад час паўстаньня 1794 г.

Пазьней Ясінскага будуць называць афіцэрам-тэарэтыкам, які ня меў войска. На жаль, збольшага так і адбывалася, але перад намі не кабінэтны стратэг пруска-аўстрыйскага ўзору. Празь пяць гадзін бою усё, як казаў Напалеон, вырашыў «сьвежы» батальён, ды не батальён, а некалькі палкоў, што падыходзілі да расейцаў. Жаўнеры Ясінскага адступілі з годнасьцю і ў баявым парадку. Пад час адступленьня загінуў брат Якуба Юзаф, капітан стралкоў.

Прайграныя бітвы, сьмерць брата, непаразуменьні з кіраўніцтвам руху заганяюць Ясінскага ў дэпрэсію. Пэсымізм робіць зь яго чалавека, абыякавага да свайго і чужога жыцьця. Касьцюшка, мабыць, адчуваючы, што не заўсёды быў справядлівы зь «літоўскім сэпаратыстам», пасьля доўгіх угавораў схіляе яго да прыняцьця камандаваньня на жмудзкай мяжы й наднарвянскага фронту. Дзейнічаць прыходзілася ў вельмі цяжкіх умовах. Вораг напіраў з усіх бакоў, да таго ж Якуб дрэнна ведаў мясцовасьць. Для папаўненьня сваіх шыхтоў ён едзе ў Берасьце, адкуль накіроўваецца да Бельску, каб сабраць рэшткі літоўскае арміі і ўдарыць па Прусіі. Па дарозе, у другой палове жніўня, да яго даходзіць вестка, якая канчаткова перакрэсьліла ўсялякія надзеі на перамогу. Пала Вільня.

Якуб Ясінскі піша ліст да расейскага камэнданта гораду. «Даведаўся, што пан камэндант загадаў разрабаваць мой дом. Няхай ён запытае сваіх афіцэраў, ці абыходзіліся ў нас зь імі такім чынам? Маю гонар упэўніць Вас, што безь бібліятэкі, мэблі і экіпажаў можна быць вельмі шчасьлівымі, ня будучы рабом...» У тыя ж дні, убачыўшы проста фатальную сытуацыю ў Горадні, Якуб гаворыць ад'ютантам: «Я Бацькаўшчыны не перажыву, калі лёс ня дасьць мне загінуць у бітве, зьвярнуся да гэтых прыяцеляў», — і паказаў на пісталеты. Пагарда да сьмерці кідала яго ў самыя гушчары бітваў, а Якуб быў нібыта замоўлены ад куляў. Касьцюшка, каб неяк узьняць настрой Ясінскага, сэпаратызму якога цяперака асьцерагацца не было сэнсу, па прыбыцьці ў Горадню ўзнагароджвае генэрала пярсьцёнкам з надпісам: «Бацькаўшчына свайму абаронцу» і прызначае камандзірам адной зь літоўскіх дывізіяў, даручыўшы наднарвянскую дывізію Юрыю Грабоўскаму.

Расея, нарэшце атрымаўшы гарантыі захаваньня міру з боку Турэччыны, вырашае адным моцным ударам пакончыць з Рэччу Паспалітай. Выклікалі графа Суворава-Рымніцкага, адно імя якога, як казаў Румянцаў, запужае многія тысячы. Суворaў рухаўся паскораным маршам; у верасьні-кастрычніку ён наносіць першыя паразы нашым войскам пры Крупчыцах, пад Берасьцем, Кабылкай... Касьцюшка разумеў, што, змагаючыся з Фэрзэнам і Суворавым па-адным, у яго больш шанцаў. 10 кастрычніка ён сутыкаецца з Фэрзэнам пад Мацяёвіцамі. Вораг меў падвойную перавагу ў людзях і патройную ў артылерыі. Пад час бітвы цяжка паранены Начальнік трапляе ў палон...

Якуб прыбыў у Варшаву празь дзесяць дзён пасьля мацяёвіцкае трагедыі і папрасіў Тамаша Ваўжэцкага, абранага на месца Касьцюшкі, аб пасадзе ў Празе. Ён спаліў масты. Мяркуюць, што нібыта ў гэты момант Ясінскі прапанаваў зьнішчыць караля і ўсіх палонных, каб спаліць масты і для астатніх.

Прага атрымлівала ўдар першай, бо павінна была служыць шчытом, што прыкрывае Варшаву з поўдня, адкуль ішоў Суворaў. А за сьпінаю — Вісла, і адзіны мост, што злучае прадмесьце з горадам. Умацаваньні рабілі палонныя, бо народ ужо ні ў што ня верыў. Генэрал Юзаф Заёнчак, адказны за абарону Прагі, таксама ня меў ніякіх надзеяў. Ён лічыў, што каб паспрабаваць выстаяць, патрэбна хаця б 45 тыс. жаўнераў, а ў наяўнасьці толькі 15 тыс. Войска Суворава, разам з прусакамі — 38 тыс. і 86 гарматаў. Прусакі сьцьвярджалі, што войскі Рэчы Паспалітай налічвалі 35 тыс. Паводле Заёнчака, усё войска РП налічвала тады 22 тыс. жаўнераў.

Ясінскаму даручылі абараняць левае крыло — Таргувэк. У ягоным распараджэньні толькі 4 тыс. жаўнераў 5-га і 7-га літоўскіх рэгімэнтаў, ды яшчэ пара-другая соцень габрайскае лёгкае кавалерыі Ясялевіча.

3 лістапада расейцы праводзяць артпадрыхтоўку. Наступнай раніцай а 5-й гадзіне пачаўся штурм. На пазыцыі Ясінскага быў абрынуты ўдар 4-х з 7-мі калёнаў суворaўскага войска. Прыкладна праз палову гадзіны вораг зламаў лінію абароны і хлынуў за ўмацаваньні Таргуўка. Пачалася паніка. Цывільныя і войскі кінуліся да маста. Улады не было, — Заёнчака параніла ў жывот у самым пачатку штурма. Толькі вакол Ясінскага згрудзіліся рэшткі жаўнераў, якім заставалася прыгожа загінуць, засланяючы сваімі целамі адыход апошніх абаронцаў Бацькаўшчыны.

Якуб не палохаўся сьмерці, а нібыта забаўляўся зь ёю. Стоячы на ўвесь рост у прамозглай вільгаці восеньскае раніцы і блакітных клубах парахавога дыму, ён рабіў зь сябе жывую мішэнь, але кулі ня бралі яго да таго моманту, пакуль з карабіна, што падаваў яму ад'ютант, не было пакладзена некалькі дзясяткаў ворагаў.

Потым настала Вечнасьць...

Аляксандар Суворaў пад час крывавае оргіі ў прадмесьці цынічна заяўляе прускаму генэралу Швэрыну: «Я тут з маім войскам, увенчаны ляўрамі перамогі». У С.-Пецярбургу таксама ўзрадаваліся гэтай ганебнай перамозе, амытай крывёю многіх тысячаў бязьвінных людзей. Жаўнеры атрымалі срэбныя і бронзавыя мэдалі з манаграмай Кацярыны II і надпісам: «За труды и храбрость при взятии Праги 24 октября 1794 г.», для афіцэраў — пазалочаныя і бронзавыя крыжы з тым жа надпісам. Хацелі і ўласна для Суворава адліць мэдаль, але ўсяму бывае мера. Цэсарэвіч Павал Пятровіч рашуча запрацівіўся, кажучы, што гэта было ня «действие военное, а единственно закланиe жидов».

Праз два гады Павал Пятровіч, стаўшы Паўлам I, і робячы ўсё насуперак сваёй ненавіснай маці, адпускае на волю Касьцюшку і 17 тысячаў палонных — ацалелых удзельнікаў апошняга акту трагедыі Рэчы Паспалітай.

Андрэй Шпунт

Гісторык і палітыка

Мне ўяўляецца марным кожны радок, напісаны не дзеля таго, каб служыць дзейснаму жыццю.
Освальд Шпэнглер

І так лічыў не адзін Шпэнглер...

Адзін з маіх калегаў па фаху ўпэўнены, што ягоны выключны абавязак — навука, — і ніякай палітыкі! Яго не спаткаць ні на мітынгах апазыцыі, ні на крамольных з пункту гледжаньня ўладаў камэрных зборках. Ён піша і публікуе грунтоўныя тэксты, але толькі на далёкія ад палітыкі тэмы. Прызнаюся, мне ён часам нагадвае адукаванага страўса, бо падманвае сам сябе...

Ну хіба можа захаваць палітычную цнатлівасьць гісторык? Наіў, а хутчэй фальш. Бо тое, чым ён займаецца, гісторыя — сама па сабе ўжо становіць пэўную формулу арыентацыі ў сьвеце, крэсьліць нейкія ідэалы, а значыць — і пазыцыі. У звычайнай псыхічна здаровай асобы свая нацыянальная гісторыя абуджае перадусім патрыятызм, яе сымбалі сьцьвярджаюць нацыянальную ідэнтычнасьць. Ці ня самы клясычны прыклад ператварэньня гісторыі ў сілу прадэманстравалі старажытныя грэкі: калі іх краіне стала пагражаць вялізная Пэрсія, яны зьвярнуліся да старых кронікаў, песьняў Гамэра, у якіх апяваліся перамогі грэкаў над азіятамі, — і іх маленькі народ зноў зьдзівіў сьвет Маратонам ды Тэрмапіламі!

У новы час ня толькі досьвед блізкіх нам па долі палякаў і літоўцаў, але практычна ўсёй Цэнтральна-Усходняй Эўропы пацьвердзіў, што ўсе паднявольныя народы шукалі сілы дзеля вызваленьня ў сваім мінулым. Гісторыкі найчасьцей былі і дзеячамі нацыянальна-вызвольнага руху. Яны адважваліся на стварэньне мітаў і нават фальшаваньне дакумэнтаў, каб толькі ўмацаваць самаідэнтычнасьць свайго народу. І чым больш прыгнечаны быў народ, тым больш актыўна яго гістарыяграфія імкнулася абудзіць нацыянальную сьвядомасьць адпаведным тракмняць сілы, якія хочуць панаваць трывала. Вобразна кажучы, за кожнай тэрытарыяльна-палітычнай інтэрвэнцыяй ці акупацыяй заўсёды наступае інтэрвэнцыя ў гісторыю. Так было і ёсьць у Беларусі. І цяперашнія ўлады, як толькі дамагліся неабмежаванага панаваньня, узяліся (NB — пры падтрымцы камуністаў!) ваяваць зь беларускай гісторыяй, мяняць падручнікі — вяртаць савецкія і расейскія схемы і штампы. Чым жа яны былі небясьпечныя? Тым, што беларуская гісторыя нават праз такія недаробленыя кнігі можа прынамсі дэсаветызаваць і дэрусіфікаваць асобу. І нацыянальна-дэмакратычны рух слушна ставіць на прапаганду менавіта нацыянальнай гісторыі, гістарычнай саматоеснасьці беларусаў. Праўда, часта гэта робіцца ў надта прымітыўных формах, але — такі этап. Містыфікацыя мінулага, яго гераізацыя, прага апалягетыкі — усё гэта і цяпер характэрнае для папулярнай (ненавуковай) гістарыяграфіі эўрапейскіх народаў, асабліва малых. Вунь жа літоўцы могуць напісаць, што гэта іх продкі «падрыхтавалі дзівосную элінскую культуру», а на Ўкраіне можна часам прачытаць, што ўкраінцы вядуць свой радавод ад старажытных этрускаў... Гэта выдаткі своеасаблівага інстынкту самазахаваньня, спосаб самаабароны ад эгаізму і эксцэнтрызму суседніх народаў — мацнейшых, большых.

Да беларускай сытуацыі цяпер найлепш дастасоўваюцца словы кембрыдзкага прафэсара Эльтана: нашае цяперашняе цяжкое, будучыня — няпэўная, і толькі мінуўшчына ўжо канчаткова нашая, якую можна сузіраць, перажываць... Яна цісьне на нас. І ня раз яшчэ прарве. Дзе і як — залежыць ад гісторыка, бо той яе «лепіць».

Адзін мудрэц казаў, што з гісторыяй трэба абыходзіцца як з радыеактыўным элемэнтам. Як жа тут можна хаваць галаву ў пясок?

Генадзь Сагановіч

таваньнем мінуўшчыны.

Усё гэта — натуральная праява этапу станаўленьня нацыяў і нацыянальных дзяржаваў. У эўрапейскіх народаў у XIX ды й XX стагодзьдзі гістарыяграфія была шчыльна зьвязаная з нацыянальным і палітычным жыцьцём, яна проста зьяўлялася яго par excellence. Як казаў адзін французскі вучоны, менавіта гісторыкі і стварылі сучасныя народы! Яшчэ нядаўна ўласныя палітычныя перакананьні выразна выступалі ў навуковых працах многіх эўрапейскіх гісторыкаў. І толькі ў сучаснай Эўропе гістарычная навука вызвалілася ад такой функцыі. Бо ўжо споўніла сваю місію.

Але нават у стабільным грамадзтве, што перажыло фазу нацыянальнага разьвіцьця і сталеньня, гісторыя ў прынцыпе ня можа быць вольнай, незалежнай ад палітыкі. Гісторык па фаху мусіць усьведамляць, што вынікі ягоных досьледаў аўтаматычна трапляюць у палітыку, выкарыстоўваюцца ў палітычнай барацьбе тымі сіламі, кан'юнктуру якіх могуць пацьвердзіць. І максымум, што ў ягоных магчымасьцях — захаваньне чысьціні «мундзіра», г.зн. аўтаномнасьці свайго навуковага жыцьця, прынцыпаў прафэсійнай этыкі.

О, колькі крыві псуе нашаму брату палітыка! Гісторык заўсёды пад пільнай увагай уладаў. Кожная дыктатура мабілізуе кагосьці з рыцараў багіні Кліа на выпрацоўку ідэалягічных падмуркаў свайго панаваньня, гістарычнага апраўданьня сваіх дзеяў, а камусьці — проста затыкае рот. Ня сёньня, дык заўтра гісторык абавязкова будзе запатрабаваны палітычнымі сіламі яго грамадзтва. Самы рафінаваны прафэсіянал мусіць самавызначацца, у час X пакідаць свой ціхі габінэт, ісьці



ІНДЭКС РЭПРЭСАВАНЫХ

Архіў Найноўшае Гісторыі вядзе падрыхтоўку да пачатку вялікага праекту «Індэкс рэпрэсаваных». Нашая задача — стварыць кампутарную базу зьвестак з імёнамі ўсіх рэпрэсаваных савецкім рэжымам грамадзянаў Беларусі, а таксама ўраджэнцаў Беларусі, якія рэпрэсаваныя па-за яе межамі. Можа быць, наш праект будзе разьвівацца марудна, бо на сёньня мы пазбаўленыя самай галоўнай крыніцы — доступу да архіваў КГБ. Між тым, за лібэральнымі часамі адноўленай незалежнай Рэспублікі беларускія гісторыкі зрабілі пэўныя напрацоўкі — справа рэабілітацыі ахвяраў была тады палітыкай дзяржавы. І што вельмі важнае — у нас ёсьць партнэры, якія дапамагаюць нам атрымаць інфармацыю пра беларускіх грамадзянаў, калі яны былі асуджаныя па-за межамі Беларусі альбо адбывалі там несправядлівае пакараньне. Таму, няхай марудна, але наш праект будзе рэалізоўвацца. Заканчэньне гэтага праекту прыпадзе на той пэрыяд, калі ў нашым грамадзтве адбудзецца адыход ад таталітарнай сьвядомасьці, а ў будынку зьліквідаванага КГБ адкрыецца Цэнтар вывучэньня генацыду.

Мы будзем працягваць рэалізацыю гэтага праекту, зыходзячы з маральных прынцыпаў, а таксама ўсьведамляючы, што гістарыяграфічныя й сацыялягічныя задачы вывучэньня савецкага пэрыяду могуць быць пасьпяхова вырашаныя толькі пры дастатковым колькасным і адначасова пэрсаніфікаваным уяўленьні пра найбольш заўважны сюжэт з савецкай гісторыі — рэпрэсіі. Немалаважны й юрыдычны бок справы — вядзецца пра маёмасьць і правы нашчадкаў.

Дзякуючы апошнім дасьледаваньням, сёньня мы ўжо ўяўляем мэханізм функцыянаваньня машыны тэрору ў 20-50-я гады. Але рэпрэсіі бліжэйшага да нас часу — 60-80-х гадоў — яшчэ шмат у чым застаюцца незразумелымі. Адна з прычынаў такой сытуацыі — многія каты яшчэ жывыя й знаходзяцца на дзяржаўнай службе.

У рамках праграмы супрацоўніцтва й абмену інфармацыяй з маскоўскім «Мемориалом» Архіў Найноўшае Гісторыі атрымаў выбарку з базы зьвестак па асуджаных у 1961-1987 гадах. У гэты пэрыяд ужо не адбываліся масавыя рэпрэсіі, і ўсіх асуджаных паводле ідэалягічных матываў зьмяшчалі ў трох месцах: Дуброўлаг, Пермскія лягеры, Уладзімірская турма. У 60-х — першай палове 80-х галоўным палітычным артыкулам быў арт. 67 Крымінальнага кодэксу (у РСФСР — арт. 70) — «антысавецкая прапаганда й агітацыя». Судовыя справы паводле гэтага артыкула лічыліся асабліва небясьпечнымі й падлягалі разгляду судоў толькі вышэйшай інстанцыі — пачынаючы з абласных.

Маскоўскі «Мемориал» атрымаў уліковыя карткі палітвязьняў 60-80-х гадоў. У наш Архіў інфармацыя перададзеная па дзьвюх пошукавых пазыцыях: месца асуджэньня — на тэрыторыі БССР; у выпадках асуджэньня па-за межамі Беларусі — па нацыянальнасьці — беларуская. З названых асобаў нам вядомае толькі імя Міхала Кукабакі. У далейшым мы разьлічваем атрымаць зьвесткі пра ўсіх рэпрэсаваных па-за межамі Беларусі ўраджэнцаў Беларусі.

Алег Дзярновіч

Сьпіс вядомых Навукова-Дасьледчаму Асьветніцкаму Цэнтру (НИПЦ) «Мемориал» асобаў, якія былі асуджаныя судамі БССР паводле арт. 67 Крымінальнага Кодэксу БССР «антысавецкая агітацыя і прапаганда» ў 1961-1987 (Архіў НИПЦ «Мемориал», Фонд 67)

Прозьвішча	Імя	Імя па бацьку	Год нараджэньня	Месца нараджэньня	Дата асуджэньня
			ВЯРХОЎНЫМ СУДОМ БССР		
Барбарчук	Ніна	Іосіфаўна	1919	Менск	15.01.1962
Гарачы	Эдуард	Мікалаевіч	1936	Яраслаўль	06.06.1962
Грынблят	Леапольд	Саламонавіч	13.11.1901	Менск	04.12.1968
Міладоўскі	Іосіф	Іосіфавіч	1923	Берасьцейская вобл., Лунінецкі р-н, х.Савінск	09.10.1962
Сярогін	Георгі	Якаўлевіч	30.11.1918	Краснадарскі край, ст. Петрапаўлаўская	07.10.1963
Ханжэнкаў	Сяргей	Мікалаевіч	13.03.1942	Магаданская вобл., п. Усьць-Уціны	07.10.1963
Храпавіцкі	Віктар	Іванавіч	10.06.1937	Віцебская вобл., Глыбокае	07.10.1963
			БЕРАСЬЦЕЙСКІМ АБЛАСНЫМ СУДОМ		
Грыгор'еў	Аляксандар	Уладзімеравіч	15.02.1923	Польшча, Беластоцкае ваяводзтва, в.Макаркі	10.04.1964
Лагодзін	Мікалай	Васільевіч	6.12.1928	Берасьцейская вобл., Драгічынскі р-н, в.Радоўня	11.04.1963
Ракашэвіч	Васіль	Васільевіч	20.05.1923	Берасьцейская вобл., Ляхавіцкі р-н, в.Хоцяж	10.04.1964
			ВІЦЕБСКІМ АБЛАСНЫМ СУДОМ		
Вайценка	Рыгор	Сяргеевіч	15.05.1924	Віцебская вобл., Полацкі р-н, в. Дручаны	12.05.1962
Дубоўскі	Фёдар	Васільевіч	6.05.1923	Магілёўская вобл., Горацкі р-н, в.Радзіёнаўка	11.02.1964
Кукабака	Міхал	Ігнатавіч	3.12.1936	Магілёўская вобл., Бабруйск	07.03.1985
Прахарэнка	Піліп	Якаўлевіч	1908	Віцебская вобл., Аршанскі р-н, в. Ганчарова	23.01.1963
Тычкоў	Мікалай	Іванавіч	1926	Наўгародзкая вобл., Чудаўскі р-н, в. Слабада	29.10.1962
			ГОМЕЛЬСКІМ АБЛАСНЫМ СУДОМ		
Аніськоў	Алег	Георгіевіч	2.01.1941	Гомельская вобл., пгт.Уваравічы	19.12.1963
Коршыкаў	Уладзімер	Майсеевіч	1936	Гомельская вобл., Рагачоўскі р-н, с.Задруцьце	28.02.1963
Прахарэнкаў	Аляксей	Міканоравіч	23.07.1927	Смаленская вобл., Панізоўскі р-н, в. Малае Арэтава	26.06.1970
			ГАРАДЗЕНСКІМ АБЛАСНЫМ СУДОМ		
Галубовіч	Фёдар	Міхалавіч	1920	Магілёўская вобл., Асіповіцкі р-н, в. Сініца	08.03.1962
Трафімчык	Іван	Васільевіч	1918	Гарадзенская вобл., Дзятлоўскі р-н, в. Барышына	13.09.1968
Траяк	Іван	Сяргеевіч	1923	Хмяльніцкая вобл., Палонскі р-н, с. Бялецкае	13.10.1962
Казак	Іван	Віктаравіч	1935	Гомельская вобл., Веткаўскі р-н, в.Колбаўка	16.06.1962
			МЕНСКІМ АБЛАСНЫМ СУДОМ		
Васільеў	Аляксей	Пятровіч	1925	Курская вобл., Рыльскі р-н, в.Мазепаўка	15.08.1962
			ВАЕННЫМ ТРЫБУНАЛАМ БЕЛАРУСКАЙ ВАЙСКОВАЙ АКРУГІ		
Памагаеў	Леанід	Фёдаравіч	9.03.1946	Тульская вобл., Яфрэмаў	29.07.1964
Удодаў	Аляксандар	Іванавіч	11.09.1946	Магілёўская вобл., Бабруйск	29.07.1964
			ВАЕННЫМ ТРЫБУНАЛАМ МЕНСКАГА ГАРНІЗОНУ		
Балодзіс	Зайгіс	Імантавіч	15.01.1964	Бауска (Латвія)	02.07.1984
Дзіджус	Готартс	Фрыцавіч	26.09.1939	Шаўляйскі р-н, с. Радвіляй (Літва)	20.09.1963
			ВАЕННЫМ ТРЫБУНАЛАМ В/Ч 75092, БЕРАСЬЦЕ, БССР		
Удачын	Аляксандар	Алегавіч	5.04.1964	Клайпеда	6.04.1984

Сьпіс вядомых НИПЦ «Мемориал» асобаў беларускай нацыянальнасьці, асуджаных судамі СССР паводле 70 КК РСФСР («антысавецкая агітацыя і прапаганда» і яе аналягі ў кодэксах былых саюзных рэспублік) у 1961-1987 гг. (Архіў НИПЦ «Мемориал», Фонд 167)

Прозьвішча Імя Імя па бацьку	Год нараджэньня	Месца нараджэньня	Дата асуджэньня	Кім асуджаны
Валодзькін Віктар Андрэевіч	1933	БССР Магілёўская вобл., Дрыбінскі р-н, с.Новая Буга	12.06.1963	Цалінны крайсуд
Галдовіч Аляксандар Аляксандравіч	21.08.1947	Масква	02.12.1985	Краснадарскі крайсуд
Гарачы Міхал Максімавіч	15.09.1930	БССР Гомельская вобл., Журавельскі р-н, с. Шапніцы	18.08.1962	Чаркаскі аблсуд
Грашчанка Павал Паўлавіч	1909	БССР Магілёўская вобл., Слаўгарадскі р-н, Слаўгарад	29.08.1961	Луганскі аблсуд
Казак Аляксандар Аляксандравіч	1913	БССР Баранавічы	17.07.1961	В/суд Комі АССР
Купцэвіч Аркадзь Адамавіч (Лявіцкі Павал Аляксандравіч)	1906	Смаленская вобл., Вязьма	03.12.1963	Кемераўскі аблсуд
Маліноўскі Мікалай Аляксандравіч	10.09.1931	БССР Менская вобл., Капыльскі р-н, п. Мажа	29.01.1982	Чарнігаўскі аблсуд
Мацкевіч Аляксандар Астапавіч	5.05.1939	БССР Віцебская вобл., Полацкі р-н, в.Стрыжына (Сьціжына — УФСБ)	29.11.1962	Архангельскі аблсуд
Пятровіч Сьцяпан Афанасьевіч	4.01.1944	БССР Менская вобл., Слуцкі р-н, с. Даросіна	17.01.1964	Луганскі аблсуд
Румачык Пётар Васільевіч	1.07.1931	БССР Берасьцейская вобл., Драгічынскі р-н, в. Горка	07.02.1986	Чыцінскі аблсуд
Русак Уладзімер Сьцяпанавіч	17.06.1949	БССР Берасьцейская вобл., Баранавіцкі р-н, в. Зьвёздная	10.09.1986	Маскоўскі гарсуд
Савіцкі Эдуард Іосіфавіч	1912	БССР Баранавіцкая вобл., Слонім	15.01.1963	Варонежскі аблсуд
Тарасевіч Фёдар Мацьвеевіч	1926	БССР Менская вобл., Старобінскі р-н, с. Паварчыцы	18.12.1962	Вярхоўны суд ЛітССР
Юркоў Георгі Сяргеевіч	23.02.1931	БССР Менская вобл., Барысаўскі р-н, п. Весялова	02.07.1964	Пермскі аблсуд
Кавалёў Канстанцін Фёдаравіч	1936	УзССР Ташкент	22.04.1963	Растоўскі аблсуд

Архіў Найноўшае Гісторыі зьвяртаецца з просьбаю да ўсіх, хто што-небудзь ведае пра названых у сьпісе людзей, паведаміць гэтую інфармацыю нашаму архіву. Адрас: п/с 71, Менск 220123.

Публікацыя ажыцьцёўленая ў рамках праекту «Адна зямля — Усходняя Эўропа» © Архіў Найноўшае Гісторыі

Сьпіс кніг,

перададзеных у бібліятэку Архіву Найноўшае Гісторыі маскоўскім Гісторыка-асьветным, праваабарончым і дабрачынным таварыствам «Мемориал»

Беженцы и вынужденные переселенцы на территории Российской Федерации / Правозащитный центр «Мемориал». — Москва: Звенья, 1997.

Беленкин Борис. Российские периодические издания о национал-экстремизме 1992-1996: Библиографический указатель. — Москва: Звенья, 1997.

Библиографический указатель изданий общества «Мемориал» (1988-1995). — Москва: Мемориал, 1995.

Госбезопасность и литература на опыте России и Германии (СССР и ГДР) / Сост.: Фонд Генриха Бёлля. — Москва: Рудомино, 1994.

Григоренко Пётр. В подлолье можно встретить только крыс... — Москва: Звенья, 1997.

За спинами мирных жителей: Захват заложников и использование гражданского населения в качестве «живого щита» федеральными войсками России в ходе вооруженного конфликта в Чечне. — Москва: Мемориал, 1996.

Закон Российской Федерации «О реабилитации жертв политических репрессий» (С изменениями и дополнениями на 1 июля 1994 г.)

Звенья: Исторический альманах. Вып.1. — Москва: Прогресс: Феникс: Atheneum, 1991.

КГБ: вчера, сегодня, завтра: Международные конференции и круглые столы / Общественный фонд «Гласность». — Москва, 1995.

Корни травы: Сборник статей молодых историков. — Москва: Звенья, 1996.

Марченко, Анатолий. Живи как все: Показания Анатолия Марченко. — Москва: Весть-ВИМО, 1993.

Осипова И.И. «В язвах своих сокрой меня...»: Гонения на Католическую Церковь в СССР (По материалам следственных и лагерных дел). — Москва: Серебрянные нити, 1996.

Право народов на самоопределение: идеология и практика: Материалы к семинару. — Москва: Звенья, 1997.

Право народов на самоопределение: идея и воплощение / Правозащитный центр «Мемориал» — Москва: Звенья, 1997.

Преподавание прав человека в 5-9 классах средней школы: Книга для учителя / Сост. А.Егорова и др. — Москва: Звенья, 1997.

ТЭМА СВАБОДЫ

Экспэдыцыя Архіву Найноўшае Гісторыі й «Нашай Нівы» на Слонімшчыну (12-13 лютага 1998)

Нашая дасьледчая група працягвае традыцыю экспэдыцыяў па рэгіёнах Беларусі. Першая такая выправа была арганізаваная ў 1997 годзе на Віцебшчыну да сяброў Саюзу Беларускіх Патрыётаў. Мы шукаем кантактаў зь людзьмі — жывымі носьбітамі традыцыі і бясцэннай інфармацыі, якую сёньня атрымаць у дзяржаўных архівах амаль немагчыма. Запіс вуснай гісторыі ня можа быць замяняльнікам пісьмовых дакумэнтаў, але фіксацыя ўспамінаў адкрывае зусім новыя магчымасьці ў разуменьні розьніцы паміж гістарычнымі эпохамі ды дае гуманітарнае прачытаньне падзеяў.

Не вазьмуся сьцьвярджаць, што Слонімшчына значна адрозьніваецца ад усёй іншай Беларусі, але некаторыя сюжэты канфліктнага з савецкім ладам жыцьця тут прадстаўленыя ў канцэнтраванай форме. У Слоніме жывуць людзі, якія спрабуюць вярнуць сканфіскаваную ў 1950 годзе маёмасьць сваіх бацькоў. Але ўлады прапанануюць, як, напрыклад, Леанардзе Раўкоўскай, 127 тысячаў рублёў у кампэнсацыю за бацькоўскую зямлю — 12,5 гектараў. Падобныя справы з раённых пераходзяць ужо ў абласныя суды. Час, калі адбываліся масавыя рэпрэсіі, усё больш аддалаецца, паміраюць людзі, якія прайшлі ГУЛАГ. Але праблема свабоды й адстойваньня сваіх правоў набывае новае гучаньне — нашчадкі ўсё часьцей пачынаюць узгадваць пра свае маёмасныя правы.

Досыць падрабязна пра намаганьні грамадзянаў Беларусі адстаяць свае правы распавядае «Газэта Слонімская». Досьвед гэтай газэты па-свойму ўнікальны па-за межамі сталіцы. Заснаваная Віктарам Валадашчуком, ранейшым супрацоўнікам «Свабоды», які вярнуўся ў родны горад, «Газэта Слонімская» досыць хутка заняла сваё месца ў інфармацыйнай прасторы рэгіёну ды стварыла канкурэнцыю газэце мясцовай «вэртыкалі» «Слонімскаму весьніку». У выніку — слонімскай друкарні было забаронена друкаваць «Газэту Слонімскую» ўжо адразу пасьля першага нумару, і рэдакцыя вымушаная паслугоўваецца магчымасьцямі іншай друкарні. Ужо зусім сьвежыя падзеі — у Слоніме была скарочаная колькасьць гандлёвых кропак, дзе можна прадаваць «Газэту Слонімскую». Здарылася гэта пасьля публікацыі крытычнага для мэра гораду матэрыялу. Але, тым ня менш, газэта дынамічна разьвіваецца, жыхары гораду й раёну пастаянна зьмяшчаюць там свае абвесткі й рэкляму. Як я зразумеў, маючы наклад 6.900 асобнікаў, рэдактар, імкнучыся захаваць хісткі балянс у адносінах з уладамі, цяпер наўмысна стрымлівае рост накладу.

Яшчэ адзін прыклад самацэнзуры — рэгулярна публікуючы матэрыялы пра ўзброены паваенны антысавецкі рух, рэдакцыя часта пазначае імёны людзей толькі ініцыяламі. Многія ахвяры й каты яшчэ жывыя. Ва ўмовах раёну гэтыя ініцыялы збольшага прачытвацца чытачамі, але ўвесь комплекс асабістых дачыненьняў з сацыяльнымі мэханізмамі дзяржавы (зь яе пэнсіямі й афіцыйнымі героямі) прымушае ўтрымліваць статус-кво. Такая дыстанцыя беларусаў ад рэаліяў сьведчыць пра тое, наколькі нашае грамадзтва яшчэ не гатовае да прызнаньня сваёй уласнай гісторыі. Але не праробленая належная праца і самой беларускай гістарыяграфіяй,



якая альбо самаўхілялася ад вострых тэмаў найноўшае гісторыі, альбо займалася апалягетыкай (ня важна, якога кірунку). У гэтай атмасфэры змрочнага замоўчваньня асобную місію ўскладаюць на сябе незалежныя газэты — тыя ж «Газэта Слонімская» і «Наша Ніва».

«Газэта Слонімская» дапамагала нашай экспэдыцыі і ўвесь час з намі знаходзіўся яе супрацоўнік Сяргей Ёрш, які, апроч таго, — аўтар публікацыяў у «НН» пра антысавецкі супраціў 1944-1950-х гадоў і пра тэрор супраць цывільнага жыхарства пад час Другой сусьветнай вайны. Бандытызмам займаліся і фармацыі, якія залічваліся да савецкай партызанкі. Апублікаваныя намі ў 1997 годзе факты былі надзвычай рэзкімі й прымушалі любога чалавека адмовіцца ад тых спрошчаных уяўленьняў пра падзеі Другой сусьветнай вайны ў тыле, якія былі навязаныя савецкай апалягетыкай і гістарыяграфіяй. Пры сёньняшняй афіцыйнай палітыцы рэсаветызацыі такое не даруецца, і летась «НН» атрымала папярэджаньне Генэральнай пракуратуры. Быў момант, калі перад нашай газэтай паўстала праблема магчымага закрыцьця.

Цяпер мы непасрэдна сустрэліся зь людзьмі, чые ўспаміны зафіксаваў і падрыхтаваў для публікацыі ў «НН» Сяргей Ёрш. Каб не пераказваць ужо апублікаваны 10 сакавіка 1997 году ў «НН» матэрыял, прывядзем цытату з натарыяльна засьведчанага дакумэнту, які паўстаў як адказ на дзеяньні Генэральнай пракуратуры супраць «НН» і КГБ супраць Сяргея Ярша: «Я, Струпавец Васіль Васільевіч, 1928 г. нар., ураджэнец вёскі Якімавічы Слонімскага раёну, пацьвярджаю, што ўсе факты, прыведзеныя Сяргеем Яршом у артыкуле «Што яны выраблялі!» адпавядаюць сапраўднасьці. Злачынствы над маёй сям'ёй, нада мной асабіста і над маімі аднавяскоўцамі зьдзяйсьнялі партызаны савецкага атраду імя Панамарэнкі: Іван Зайцаў, камандзір атраду; Пётар Бухарэўскі, камандзір роты; Іван Багуслаўскі, Азановіч — асабіста ды іншыя. Прыведзеныя ў газэтнай публікацыі мае словы я гатовы пацьвердзіць у судзе, калі ў гэтым будзе патрэба...» У Якімавічах Іван Зайцаў з падручнымі замардаваў каля 50-ці чалавек.

Мы змаглі зрабіць свае запісы сьведчаньняў на магнітафон і відэакамэру, выязджалі непасрэдна на месца трагедыі. Калі Васіль Струпавец падняўся на ганак дому, у якім былі забітыя ягоныя бацькі, да нас падыйшла спадарыня Яўгенія Швайдзюк, чыю сям'ю напаткаў такі самы лёс. Дамы гэтых дзьвюх сем'яў стаяць адзін супраць аднаго, праз вуліцу. Яны пакінутыя й спусьцелыя.

Моцнае ўражаньне робіць тое, што ўсе паваенныя гады Васіль Струпавец імкнуўся адстаяць права сваёй сям'і. Ён прайшоў раённыя, менскія, маскоўскія інстанцыі; дайшоў да прыёмнай Мікіты Хрушчова. Дамо слова далей спадару Васілю:

«Прыязджаў да мяне палкоўнік КГБ зь Менску. Гаворыць мне, то Зайцаў у бальніцы ляжыць, а Багуслаўскі недзе на рыбалцы, яго не знайшлі... І гэта мне гаворыць палкоўнік КГБ! Я ня вытрымаў, кажу: «Я тады сам яго заб'ю!» Адказвае: «Отвечать будешь!» Ну дык давайце іх судзіць, народным судом, Зайцаў жа не адзін такі!» — кажу. Палкоўнік толькі сказаў: «Твоё дело». Потым я яшчэ восем гадоў змагаўся».

Фарс з дасьледаваньнем паўтарыўся ўжо ў наш час. Пасьля публікацыі ў «НН» і папярэджаньня Генэральнага пракурора па «справе Струпаўца» ў Слоніме працаваў старшы сьледчы КГБ па Горадзенскай вобласьці Барыс Рагімаў. Як мы ведаем, ён змог сабраць толькі пацьверджаньні апублікаваных матэрыялаў. Але тады перад КГБ стаяла зусім спэцыфічнае пытаньне — узбуджаць ці не ўзбуджаць супраць Сяргея Ярша крымінальную справу. Пазьней Барыс Рагімаў вёў справу супраць Паўла Шарамета.

Генэральны пракурор праігнараваў скаргу галоўнага рэдактара «Нашай Нівы» на вынесенае папярэджаньне. Хоць адносна скаргі на папярэджаньне за публікацыю Вялікоднага пасланьня мітрапаліта Ізяслава сп. Бажэлка адказаў, што «знаходзіць абгрунтаваным афіцыйнае папярэджаньне». Але цяпер мы поўнімся новымі ўражаньнямі й фактамі. Цяпер мы папросту ня зможам забыцца на нашую экспэдыцыю й будзем патрабаваць ад Генэральнай пракуратуры разгледзець факты ваеннага злачынства.

Калі мы стаялі на ганку таго дому сьведкі, Васіль Струпавец прамовіў сваю фразу пра свабоду. Усе гэтыя гады ён і яго суайчыньнікі былі пазбаўленыя свабоды, таму ў яго не было магчымасьці адстаяць правы сваёй сям'і. Ня можа ён гэтага зрабіць і цяпер. Падобныя думкі мне ня раз яшчэ прыходзілася чуць пад час нашага падарожжа. Можа ў тым найбольш можна адчуць розьніцу паміж Усходняй і Заходняй Беларусяй, што на Ўсходзе мы сустракаем шмат дзейных людзей, але амаль выключна сярод новай генэрацыі. На Захадзе ж жывуць старыя людзі, якія складаюць цэлую антысавецкую й антыкамуністычную традыцыю Беларусі. Фактычна мы можам назіраць унікальную соцыяпсыхалягічную зьяву, калі ўражаньні сьведкі тэрору трансфармаваліся ў адчуваньне катэгорыі свабоды, а не набылі статус начных кашмараў.

***

Паводле матэрыялаў нашай экспэдыцыі Севярын Квяткоўскі падрыхтаваў некалькі сюжэтаў для праграмы «Бумэранг», якая робіцца сумесна з Архівам Найноўшае Гісторыі й выходзіць на польскім «Радыё 5», што прымаецца ў Беларусі. Адзьнятыя відэаматэрыялы складуць аснову нашых відэапраграмаў.

Алег Дзярновіч

Заканчэньне будзе

На здымках: Васіль Струпавец на ганку хаты, дзе была зьнішчаная ягоная сям'я; два сьведкі распавядае Яўгенія Швайдзюк.



Сьпіс кніг,

перададзеных у бібліятэку Архіву Найноўшае Гісторыі маскоўскім «Фондом защиты гласности»

Журналист в поисках информации / Сост.: Авдеев В.В. — Москва: Права человека, 1997. — («Журналистика и закон»)

Журналисты на Чеченской войне: Факты. Документы. Свидетельства (ноябрь 1994-декабрь 1995) / Сост.: Олег Панфилов — Москва: Права человека, 1997.

Информационная война в Чечне: Факты. Документы. Свидетельства (ноябрь 1994 — сентябрь 1996) / Сост.: Олег Панфилов. — Москва: Права человека, 1997.

Краткий юридический справочник для журналиста / Сост.: А.Воинов. — Москва: Права человека, 1997.

Муратов С.А. Нравственные принципы тележурналистики: Опыт этического кодекса / Фонд защиты гласности. — Москва: Права человека, 1997. — («Журналистика и закон»)

Понятия чести и достоинства, оскорбления и ненормативности в текстах права и средств массовой информации / Фонд защиты гласности. — Москва: Права человека, 1997. — («Журналистика и закон»)

Пресса на территории России: конфликты и правонарушения. 1996 / Сост.: Олег Панфилов. — Москва: Права человека, 1997.

Пресса на территории СНГ: конфликты и правонарушения. 1996 / Сост.: Олег Панфилов. — Москва: Права человека, 1997.

Пятилетка гласности: Хроника 1991-1996 г. / Фонд защиты гласности. — Москва: Права человека, 1997.

Техника юридической безопасности для журналиста / Фонд защиты гласности — Москва: Права человека, 1997. — («Журналистика и закон»)

Расстрельные списки. Вып. 1: Донское кладбище. 1934-1940. — Москва: Мемориал, 1993.

Расстрельные списки. Вып. 2: Ваганьковское кладбище. 1926-1936. — Москва: Мемориал, 1995.

Репрессии против поляков и польских граждан / Сост. А.Э.Гурьянов. — Вып. 1. — Москва: Звенья, 1997. — («Исторические сборники «Мемориала»)

Решение проблем беженцев и вынужденных переселенцев. — Москва: Звенья, 1997.

Суетнов А. Самиздат: Библиографический указатель. — Москва, 1992.

Тополянский В.Д. Вожди в законе. Очерки физиологии власти. — Москва: Права человека, 1996.

«БЕЛАРУСКІЯ НАРОДНЫЯ

Летась незадоўга перад сваёй заўчаснай сьмерцю мяне паклікаў да сябе этнограф Міхась Раманюк. Невылечна хворы, ён ужо амаль не хадзіў, а ягоны зазвычай усьмешлівы твар раз-пораз сьцінаўся ад болю. Аўтар фундамэнтальнага альбому «Беларускае народнае адзеньне», які ёсьць бадай у кожнай сьведамай беларускай сям'і, паказваў мне, колькі яшчэ падрыхтаваных да друку фундамэнтальных альбомаў ён пакідае на волю нашчадкаў.

Перад разьвітаньнем этнограф перадаў мне рукапіс адной такой кнігі, якая сёньня рыхтуецца да друку ў выдавецтве «Наша Ніва». Кніга называецца «Беларускія народныя крыжы». 100 старонак тэксту, сто аўтарскіх фотаздымкаў, якія адразу пасяляюць адчуваньне кроўнае лучнасьці з уласнай нацыяй. Я думаю, якую б тэму ні ўздымаў этнограф Міхась Раманюк: ці то народнага адзеньня, ці то традыцыйных рыбацкіх прыладаў, ці хоць якіх гліняных сьвістулек, яго самога найбольш цікавіла менавіта гэтае адчуваньне. Усялякае старoцьце, сабранае па глухіх беларускіх вёсках, вытлумачанае і выстраенае ў сыстэму, дзіўным чынам само пачынае вытлумачваць нам саміх сябе і тое, што творыцца вакол нас.

Я паспрабую праілюстраваць гэтыя словы на прыкладах з новае кнігі. А пачну з тэзы пра тое, што беларусы ня маюць вартых помнікаў сваім культурным дзеячам, бо ня маюць беларускіх магіл. Аказваецца, што да апошняга, гэта зусім ня так. Але каб пераканацца ў гэтым, трэба зразумець, якой неперааддольнаю прорвай падзеленыя ў нас могілкі гарадзкія і вясковыя. Міжволі новая кніга М.Раманюка сьведчыць пра гэты падзел.

Свае ўражаньні ад наведваньня вясковых могілак занатаваў Зьміцер Бартосік.

Фота Дзяніса Раманюка, 1990 г.

Да нашага сыходу

Нядаўна мы зь сябрам апынуліся ў вёсцы. Дакладней, у санаторыі пад Менскам, дзе праходзіў сэмінар для журналісцкай брацii. Парою вельмі дарэчы апынуцца зімою паза межамі гораду, дзе такая чаканая млявасьць перапыняецца адно пяцiразовымі харчаваньнямі, масажамі-саўнамі, кактэйлямі-більярдамі і, вядома, гарачымі дыспутамі наконт далейшага лёсу нашай шматпакутнай Бацькаўшчыны. У вёску я, у адрозьненьне ад сябра, не выходзіў. Той жа апранаў свой шыкоўны, у Варшаве набыты строй, у якім на брудней вясковай вуліцы больш паходзіў на чыкагскага гангстэра, і ішоў у паход, як ён казаў, па жывыя сюжэты. Парушаючы мясцовую летаргію сваёй выкшталцонай беларускай мовай.

Аднойчы яму закарцела, каб я склаў яму кампанію. Ды не абы куды, а на вясковыя могілкі. «Ну ўжо там якія табе жывыя сюжэты?» — упарціўся я. «Хачу знайсьці беларускія магілы». Пачуўшы такі годны адказ, я не на жарт заінтрыгаваўся. Нават амаль не паспрачаўся. Маўляў, бліжэйшая беларуская магіла — на Вайсковых кладах у сталіцы. Але ўпэўніцца ва ўласнай праваце на свае вочы я адмовіць сабе ня мог і пайшоў разам зь ім. Хоць, кажучы шчыра, як жа мне хацелася памыліцца! Я цалкам быў на ягоным баку. І ня менш за яго хацеў на самых звычайных беларускіх могілках убачыць беларускамоўную магілу не народнага паэта, ня сябра Саюзу мастакоў, а надмагільле, зь якога можна было б зразумець, што пад ім пакоіцца ўсяго толькі Беларус.

Могілкі былі немалыя. Зусім старыя, замшэлыя драўляныя крыжы, можа, стогадовай даўніны суседзілі з праржавелымі крыжамі нашага часу, зробленымі са звычайных, звараных паміж сабой вадаправодных трубаў. Па мне, чым такі сымбаль, дык лепш казённы жаўнерскі абэліск. Уразіла мноства дзіцячых магілаў. Ля адной я нават расхваляваўся. Хлопчык Валодзя нарадзіўся са мною ў адзін месяц і год. Дата сьмерці — 71-ы год. Якраз той год, да якога сягае мая ўласная памяць. З выцьвілага мэдальёну на мяне глядзеў занадта сур'ёзны для трохгадовага чалавека твар. Адчуваньня радасьці жыцьця ад тых лічбаў і таго погляду ў мяне не паболела.

Трапляліся й багатыя магілы, з гранітнымі помнікамі ды агароджамі зь нержавейкі. Але ўсе пахаваньні аб'ядноўвала (ці ўраўноўвала) расейская мова. Часам настолькі пачварна вершаваная ў эпітафіях, што нават мяне крыўда брала за невядомага нябожчыка. Пакуль я паліў ля помніка 23-гадовай вельмі прывабнай дзяўчыны Ірыны, што памерла (ці загінула?) летась у векапомны дзень 3 ліпеня, спакой могілак быў парушаны празь меру жывым крыкам майго сябра, які гукаў мяне.

Ён знайшоў першую беларускую магілу. Але, што ўразіла мяне асабліва — можа й сапраўды першую нашую магілу з тых, што захаваліся. Надпіс на ўрослым у зямлю, магчыма, за сто гадоў камяні расейскімі літарамі але зь беларускім акань ем паведамляў, што тут спачывае «Раба божая Татяна Ляхава». «Татяна» было напісана, можа й несьвядома, але бяз мяккага знаку. Нашыя пошукі яе нашчадкаў актывізаваліся і былі ўвянчаныя. Наступныя дзьве магілы былі ўжо сьвядома беларускія. Ахайныя абэліскі Івана ды Эмілii Ляхаў. З чыёй ініцыятывы? Дзяцей ці самога Івана Паўлавіча, прыгожага савецкага афіцэра са здымку? Ды ці так гэта важна, калі двум падарожнікам па гэткіх халодных мясьцінах стала значна цяплей.

Але беларускія могілкі на гэтых магілах не скончаліся. Калі мы, задаволеныя, зьбіраліся сыходзіць, нам трапілася яшчэ адна беларуская магіла. Ладны драўляны крыж, пафарбаваны сіняю фарбаю, за грунтоўнай агароджаю, на якім нажом былі няроўна надрапаныя беларускія словы «пагіб ад фашыскай рукі 1944 Пражыў 47. Кухарчык К.М.» Тут ужо быў сюжэт. Жывы й па сёньня.

Як мала, аказваецца, нам трэба, каб не пачувацца самотнымі ў сваёй мове — знайсьці да сваіх жывых душаў пару ,роднасных душаў зусім невядомых, даўно зьніклых з гэтага сьвету людзей. Я ня веру ў адвечнае жыцьцё чалавечае душы. Там, куды зьнікаюць нашыя душы, ня можа быць моваў. Але драма і моц гэтае краіны ў тым, што нават душы, якія былі ёй адданыя, не зьнікаюць зь яе жыцьця назаўжды. Сваімі магіламі яны яшчэ доўга будуць удзельнічаць у ратаваньні зямлі, за якую і ў якую леглі. Да нашага сыходу.

Зьміцер Бартосік

Часам мне здаецца, што беларускія могілкі існуюць не ў рэальнасьці, а на нейкім падкоркавым узроўні. Ці не тамсама існуе й беларуская вёска зь ейным спрадвечным і жаданым парадкам. Магчыма, так здавалася і Міхасю Раманюку, нават тады, калі ён наведваў сотыя па ліку вясковыя клады, каб занатаваць і сфатаграфаваць яшчэ што-небудзь такое, чаго няма больш ні ў воднага народа сьвету. Між іншым, паводле вясковых надмагільных знакаў, аказваецца, можна вызначыць нацыянальнасьць нябожчыка. Раманюк спасылаецца на ўкраінскага этнографа Волкава, які прыйшоў да высновы, што «паўночныя паветы Валыні былі ў мінулым заселеныя беларусамі». «Перш за ўсё, — тлумачыць Раманюк, — гэта тычылася надмагільляў у выглядзе гарызантальна пакладзенага на невысокі земляны насып бервяна з маленькім крыжом у месцы галавы нябожчыка».

Містыцызм сьмерці ўвесь час дзіўным чынам пераплятаецца з рацыяналізмам жыцьця як у народнай філязофіі, так і ў манаграфіі этнографа. Вось, напрыклад, як выяўляўся на могілках полавы падзел. Гэтым разам Раманюк спасылаецца на сьведчаньне Адама Кіркора:

«Крыжы й камяні ставілі толькі над магіламі мужчын; магілы жанчын не заўсёды абазначалі крыжамі, а толькі насыпнымі курганчыкамі, але затое дзе-небудзь пры дарозе, на балоцістым месцы або на ручайку, празь які праходзіць сьцежка, клалі бервяно або дошку; на іх выразалі крыж, чаравік або серп, на асобных пазначалі і год сьмерці. Гэты звычай змушае мінака рабіць заўпакойную малітву».

Яшчэ адзін непахісны ў сваім рацыяналізьме закон — гэта стаўленьне вяскоўцаў да самагубцаў. Міхась Раманюк піша:

«Магілы самагубцаў заўжды выносіліся за межы кладоў. На магілах ня ставілі крыжы або іншыя, зьвязаныя з хрысьціянскай традыцыяй знакі, зямля надмагільнага пагорка не абкопвалася й не даглядалася...

Без магілы хаваюць толькі тых нябожчыкаў, якія лічацца «нячыстымі» й небясьпечнымі для жывых. Яшчэ з часоў паганства славяне не закопвалі ў зямлю людзей, якія наклалі на сябе рукі. Іх пакідалі на зямлі й закідвалі гальлём.

Ідэя гневу «маці-зямлі», якая абразілася тым, што яе змушаюць прыняць да сябе нячысты труп-загубак, выяўленая ў шматлікіх формах. Ва ўяўленьні беларусаў такі нябожчык заўсёды вяртаецца назад да жывых, колькі б разоў яго ні спрабавалі закопваць. Зямля, у сваю чаргу, карае людзей за зьнявагу й выклікае ўвесну халады й замаразкі, згубныя для пасеваў».

Сам абрад заўсёды каштоўны і велічны сваёю дакладнасьцю, яго нельга парушаць. Гэта інстынктыўна адчуваюць гарадзкія кабеты, якія прыяжджаюць на пахаваньне ў вёску, або нават і ў горадзе. Раптам жанчына замітусіцца, прыгадаўшы аднекуль, што трэба захінуць люстэрка, або што нельга, каб труну нёс падлетак — блізкі сваяк нябожчыка. Найчасьцей такія дарыўкавыя веды паходзяць зь фільмаў або з анэкдотаў і нічога агульнага з абрадам ня маюць. Аднак самое жаданьне хоць якіх правілаў у важным акце пахаваньня я назіраў ня раз. Вось жа кніга Міхася Раманюка — гэта, калі заўгодна і параднік для беларуса на невясёлую часіну.

Такім чынам, беларускія магілы ёсьць. Нават калі на іх нічога не напісана ні на якой мове. Але побач з гэтым адкрыцьцём этнаграфічная праца Міхася Раманюка «Беларускія народныя крыжы» прымушае задумацца пра іншае ананімнае зьявішча, якое стала ў Беларусі настолькі пашыраным і непрыкметным, што яго можна назваць бытавым. Я маю на ўвазе вандалізм. Разбурэньне магіл. Некалькі красамоўных фактаў пра гэта занатаваў Сяргей Харэўскі.



КРЫЖЫ»



Табу на сьмерць

... Аднойчы ў біяграфіі Байрана я прачытаў пра тое, як паэт піў віно з паліраванага чэрапа, чым прыводзіў у вусьцішнае захапленьне сваіх юных сяброў. Чэрап быў выцягнуты з старога кляшторнага пахаваньня і належаў невядомаму манаху... Яшчэ даўней гэтак рабілі гуны ды манголы, якія не выклікалі ніякае сымпатыі. Цяпер я страціў сымпатыю і да Байрана. Дарма, што пасьля прывід мніха ўсё жыцьцё перасьледаваў паэта.

Ня ведаю, ці асуджалі Байрана за гэта ягоныя сучасьнікі (выхадка з раскіданьнем чужых магілаў паблякла на тле ягоных пазьнейшых грахоў). Але мае суайчыньнікі заўсёды пагарджалі гэткімі людзьмі.

Гэткія людзі заўсёды былі Чужыя. Нават калі нехта з сваіх рабіў падобнае, людзі ймкнуліся сьпіхнуць грэх на Чужых. Тыя, хто выварочваў крыжы, рабаваў скляпы, церабушыў магілы, абавязкова мусіў быць ЧУЖЫМ, нібы той гун з Усходу.

Зазвычай такое прыпісвалі мэліяратарам, геолягам альбо вайскоўцам. Напрыклад, у Воўчыне савецкія памежнікі разрабавалі пахавальню караля Панятоўскага. З каралеўскай труны жонкі савецкіх афіцэраў зрабілі начоўкі. Памяць пра тое дзікунства й дасёньня абурае мясцовых жыхароў...

Недалёка каля Вольны, у гаі на пагорку стаяў тузін каплічак-пахавальняў колішніх тутэйшых арандатараў. У 70-я прыйшлі геолягі. Выпрабоўвалі ўзрыўчатку на гэтых капліцах. Пасьля той-сёй з дасьледчыкаў нетраў пахваляўся «здабычаю» — калечка, пярсьцёнак, ланцужок...

Пад Койданавам, у прадмесьці Прымагільле ў 1977 годзе «брыгада зь Менску» зьнішчыла могілкі з радавым цьвінтаром Кастравіцкіх, на якіх была капліца Сьв. Станіслава. Цудам ацалела толькі магіла пісьменьніка Каруся Каганца (Карла Кастравіцкага), на якой ў 88-м замест зьнішчанага помніка паставілі новы...

Мой сябра з Жухавічаў, што пад Міром, неяк захацеў паказаць мне панскія магілы ў старасьвецкім парку. Яму карцела пахваліцца руплівым стаўленьнем сваіх землякоў да чужых крыжоў. Але мы знайшлі тыя магілы павывернутымі... У вёсцы нам распавялі, што гэта ўчынілі тыдзень таму дзеці вайскоўцаў з Баранавічаў.

Гэтак прападалі крыжы па ўсёй Беларусі... Аднойчы разам з аднакурсьнікамі па мастацкай вучэльні я быў на «бульбе» ў Асіповіцкім раёне. Памятаю, як мы натрапілі на вялікі драўляны крыж пры сьцежцы ў зацішным куце бедных заросłых могілак. Замшэлы дубовы крыж быў «падперазаны» расшытымі фартухамі. Для нас, юных мастакоў, гэта быў таямнічы сюжэт: магутны сівы крыж у засені вербалозу, спавіты ў рукатворны бел-чырвона-белы кужаль. Нехта з маіх аднакурсьнікаў не ўстрымаўся і ўсё ж такі зьняў найбольш прыгожы фартушок з вышываным пунсовым крыжам. На наступны дзень да нас прыйшлі старыя кабеты і папрасілі вярнуць усё на месца. Хлопец-«калекцыянэр» гэтак і зрабіў. Аўра таямнічасьці і ўзьнёслае сур'ёзнасьці не пакідала яму выбару. Скарыла таксама танальнасьць, у якой паўшэптам гутарылі з намі сялянкі. У іхных вачах, мы, што цікавіліся старымі здабыткамі, былі амаль хаўрусьнікамі. Супраць каго?

Гэта высьветлілася праз год, калі мы йзноў патрапілі ў Асіповіцкі раён. Крыжа на месцы не было... Старшыня калгасу (людзі казалі — родам з Волгі) усё ж вывернуў крыж і спаліў. Маўляў, моладзь са сталіцы прыяжджае і што бачыць?.. Чамусьці ў нас, «сталічнае моладзі» пасьля гэтага засталося адчуваньне правіны. Нейкая істотная повязь паміж намі і тутэйшымі людзьмі была парваная. А яшчэ — ніхто з нас, мастакоў, не даўмеўся замаляваць той памятны крыж...

За савецкім часам тэма сьмерці чалавека і дачыненьняў жывых з памерлымі ўвогуле выпадала зь беларускага мастацтва. Выключэньне — ваенная тэма, якая сьцьвярджала патас неўміручасьці. Але сьмерць на вайне — ненатуральная. Беларускае савецкае мастацтва ў XX стагодзьдзі адмаўляла натуральны чалавечы скон. Гэтая тэма не трапляла ў шкалу каштоўнасьцяў будаўнікоў сьветлае будучыні на зямлі...

Сяргей Харэўскі

Апошняя выснова С.Харэўскага прымусіла мяне сходу згадаць фрагмэнт зь нядаўна чытанага эсэ Ўладзімера Арлова:

«Гадоў дваццаць таму так званае «Беларускае тэлебачаньне» любіла круціць задушэўны фільмец з геніяльным пасажам пра тое, што ў юным горадзе вялікай хіміі Наваполацку жыцьцё гэткае сьветлае й шчасьлівае, што нават няма могілак, бо людзі папросту не паміраюць: пакуль яшчэ маладыя, а таму, маўляў, пераможа камунізм, і, ня выключана, савецкія вучоныя раскрыюць таямніцу вечнага жыцьця. Ня ведаю, чым паілі і ў якіх лазьнях парылі стваральнікаў жыцьцесьцьвярджальнае стужкі, але добра памятаю, што на зялёнай высьпе справа ад дарогі на Полацак, дзякуючы вялікай хіміі, тады ўжо ляжалі пад бярэзінамі двое маіх аднаклясьнікаў».

Л яшчэ я згадваю, як у рамане Ўладзімера Караткевіча «Чорны замак Альшанскі» гулялі ў футбол чарапамі. У Адама Глёбуса гулялі школьнымі глёбусамі, якія ад гэтага нагадалі аўтару чарапы. Ды ці мала такога згадваецца. Мабыць, тэма вандалізму — гэта сапраўды адна з чырвоных нітак беларускае літаратуры. У адрозьненьне ад тэмы сьмерці. Якой за савецкім часам не існавала.

Яшчэ адна важная тэма, якую абуджае новая кніга Міхася Раманюка, — вера.

Зусім нядаўна за сяброўскай бяседай зайшла гутарка пра царкву, зрэшты, не ўпершыню. Размова, як заўсёды, круцілася вакол выбару канфэсіі. Вось, разважалі мае сябры, ёсьць сапраўдная патрэба зьвяртацца да Бога, але ні ў касьцёл, ні ў царкву ісьці ня хочацца. Ну, не сваё гэта. І потым успрымаюцца тыя ўстановы станоўча ці адмоўна, але як зьявы культуры, а не як тое, што сапраўды мае дачыненьне да твайго Бога.

Прызнацца, раней я ахвотна ўдзельнічаў у такіх дыспутах, бо мне таксама, як той казаў, хацелася, а не маглося. А цяпер я раптам прыгадаў тых гарадзкіх цётак, якія ў хаце нябошчыка імкнуцца ўсё зрабіць правільна, ды ня ведаюць, што і як. Цяпер я маўчаў, бо ўжо прачытаў апошнюю кнігу Міхася Раманюка і пытаньне пра сваю канфэсію ператварылася для мяне ў адказ пра свой космас і тую кроўную лучнасьць, пра якую я казаў напачатку. Рэч у тым, што вясковыя беларусы даўно знайшлі свой адказ на пытаньне нашае спрэчкі. І заўсёды ў іх атрымліваўся сымбіёз паганскіх і хрысьціянскіх традыцыяў.

Свая царква магла быць і проста крыжом пры дарозе, пры крыніцы або нават на цьвінтары. Раманюк піша:

«Чалавек дзеля спаўненьня мары ці пажаданьня зьвяртаўся не да абраза ў покуці хаты ці храме, а да крыжа ў адкрытай прасторы.

Абракальныя крыжы невысокія, яны ўяўлялі вобраз фантастычнага боства, паганскага ідала. Вялікая колькасьць тканінаў — апатрапеяў на іх ніколі не аднаўлялася, таму за дзесяцігодзьдзі крыж ператвараўся ў белую піраміду. У ім найменш выяўлена хрысьціянская ідэя. Крыж выступае хутчэй у якасьці каркаса для ўскладаньня тканінаў».

Такія фантастычныя і адначасова блізка зразумелыя кучы палатна сярод поля або па-над возерам Раманюк па-мастацку зафіксаваў на фота. Але апатэозам свае царквы выступаюць у кнізе прошчы.

«У Салігорскім раёне існуе прошча «Царковішча», сваеасаблівы крыжова-аброчны, мэмарыяльна-паганскі комплекс. У сасновым барку, на невялікім узвышшы паляна, на якой укапана дзесяць розных па вышыні, прапорцыях і дэкаратыўных запілоўках крыжоў. Увітыя белымі палатнінамі-ручнікамі і спавітыя фартушкамі, крыжы ўражваюць манумэнтальнасьцю й таямнічасьцю, падабенствам на фігуры людзей, апранутых у белыя строі.

Паводле легенды «Царковішча» ўзьнікла на месцы ці то царквы ці то цэлага манастыра: «Калісь, кажуць, тут манастыр быў», і крыжы пастаўленыя ў алтарнай частцы, а ў «месцы, дзе была каплічка, расьце дуб, яго падпаясвалі фартушкамі». На крыжы й дрэвы абракаліся белымі палатнінамі, ім пакланяліся, каб пазбавіцца ад хваробаў і атрымаць жаданае. Прывядзем аповед Зінаіды Галаватай:

«Вось гэты маленькі хрэсьцік паставіў дзядзька Ігнат, бо яго жонка не магла зацяжарацьць. Яму ўсядно што, хлопчыка ці дзяўчынку прыдбаць. Пасьля многія жонкі прыбіралі крыжы фартушкамі й ручнікамі. Людзі зьбіраюцца тут на Міколу, Спаса, Вялікдзень, ставяць на рукі (гарызантальныя канцы крыжа) сьвечкі, апранаюць фартухамі, завіваюць ручнікамі, абразкі паднаўляюць. Пеўчыя сьпяваюць духоўныя песьні, а хто моліцца Богу».

Шчыра кажучы, такія факты ўражваюць ня менш за якія-небудзь стоды з выспы Вялікадня. Ня хочучы інтрыгаваць чытачоў, але адно з-за браку месца заўважу, што такіх фактаў у новай ілюстраванай манаграфіі Міхася Раманюка шмат. Як і папярэдні фундамэнтальны альбом пра народнае адзеньне, кніга «Беларускія народныя крыжы» вартая таго, каб патрапіць у кожны беларускі дом.

Сяргей Паўлоўскі

На здымках: каваны крыж у Докшыцкім раёне (1983); абракальны крыж, які ператварыўся ў палатняны стажок у Чэрыкаўскім раёне (1988); лясная прошча ў Сьветлагорскім раёне (1988). Радуніца на могілках у Ганцавіцкім раёне (1989), драўляна-палатняная інсталяцыя у Лунінецкім раёне (1992). Здымкі Міхася Раманюка. На цэнтральным здымку – сам М.Раманюк фатаграфуе крыж.

Для нашых чытачоў, якія хочуць спрычыніцца да выданьня новае кнігі, падаем адрас, на які можна пераслаць грошы: Раманюку Дзянісу Міхайлавічу, а/я 107, Менск 4, 220004, Беларусь; або — на гэты ж адрас на імя Ramaniuk Dzianis (для імянных валютных чэкаў). Сабекошт новага альбому 10$ або 500.000 БРБ.

КНІГІ – ПОШТАЙ

Каб замовіць патрэбную Вам кнігу, неабходна пазначаную суму плюс суму за перасылку праз пошту пералічыць на наступны рахунак: БГФ «Наша Ніва» р/р 3015201930039 «Гарант» філія АКБ «Поіск» г. Менску, Код 987.

Не забудзьцеся на паштовай квітанцыі ў сэктары «Для пісьмовага паведамленьня» указаць назву кнігі й Ваш дакладны паштовы адрас і, калі ёсьць, тэлефон.

Зьвяртацца можна праз пошту: 220085 Менск, а/с 5, Віталь Супрановіч.

№	Аўтар і назва	Кошт	Кошт перасылкі
1.	Васіль Быкаў. Сьцяна	112.000	20.000
2.	Гарт. З успамінаў пра Саюз Беларускіх Патрыётаў	75.000	16.000
3.	Аляксандар Лукашук. За кіпучай чэкісцкай работай	50.000	12.000
4.	Аляксандар Лукашук. Філістовіч. Вяртаньне нацыяналіста	28.000	12.000
5.	Канвэер сьмерці	250.000	20.000
6.	Каралеўства Беларусь: Посткаляніяльная культура	110.000	15.000
7.	Адам Глёбус. Толькі не гавары маёй маме	30.000	16.000
8.	Адам Глёбус. Койданава	45.000	10.000
9.	Ж.Дзюрасэль. Эўропа з 1815 году да нашых дзён	15.000	16.000
10.	Б.Фэйган. Уводзіны ў археалёгію	10.000	12.000
11.	Фрагмэнты	40.000	20.000

НАВІНКА!

Беларусы: У 8 т. Т. 2. Дойлідзтва / А.Лакотка; Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклёру; Рэдкал.: В.Бандарчык, М.Піліпенка, А.Лакотка. — Менск: Тэхналёгія, 1997. ISBN 985-6234-28-X

Выданьне працягвае акадэмічную сэрыю «Беларусы» і цалкам прысьвечанае дойлідзтву. Зробленая спроба разглядаць гэтую галіну дзейнасьці з этнаграфічнага й антрапалягічнага пункту гледжаньня.

НАВІНКА!

Дзербіна Г. Права і сям'я ў Беларусі эпохі Рэнэсансу. — Менск: Тэхналёгія, 1997. ISBN 985-6234-31-X

Упершыню ў Беларусі комплексна дасьледуецца шлюбна-сямейнае права XVI ст. Шмат увагі надаецца юрыдычнай тэрміналёгіі й катэгарыяльнаму апарату фэадальнага права.

НАВІНКА!



Фонды бывших архивов Коммунистической партии Белоруссии: Краткий справочник. В 2 ч. Ч. 1 / Сост. Г.Данилова, В.Селеменев; Предисл. В.Селеменев, М.Шумейко. — Менск: Нацыянальны Архіў Рэспублікі Беларусь, 1997. ISBN 985-6372-05

Каштоўнасьць гэтага выданьня ў тым, што зафіксаваныя такім чынам архівы КПБ робяцца больш абароненымі ад нечаканага зьнікненьня асобных дакумэнтаў.

Новыя кнігі і пэрыёдыкі, дасланыя ў рэдакцыю

Адам Міцкевіч і Беларусь. Adam Mickiewicz a Białoruś / Уклад. В.Грышкевіч, навук. рэд. А.Мальдзіс, Т.Нягодзіш. — Менск: ННАЦ імя Ф.Скарыны, 1997. — 320 с., іл. — Наклад 1.000 ас. ISBN 985-6419-06-9

Беларусы: У 8 т. Т. 2. Дойлідзтва / А.Лакотка; Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклёру; Рэдкал.: В.Бандарчык, М.Піліпенка, А.Лакотка. — Менск: Тэхналёгія, 1997. — 391 с.: іл. — Наклад 1.000 ас. ISBN 985-6234-28-X

Гаек С., Гурка Л. Эўропа, Эвангельле, Беларусь. Рэфлексіі напярэдадні Трэцяга Тысячагодзьдзя. — Ворша-Lublin-Харкіў: Слово, 1997. — 32 с. ISBN 83-7119-162-6

Гісторыя Беларусі: Навучальны дапаможнік. — Менск: ЗАТ «Эканомпрэс», «Фінансы, улік, аўдыт», 1998. — 304 с. — Наклад 10.000 ас. ISBN 985-6479-02-9

Грыневіч В. Пасхальныя матывы ў творах сьв. Кірылы Тураўскага. — Ворша-Lublin-Харкіў: Слово, 1997. — 38 с. — ISBN 83-7119-167-7

Гурскі А. Сьвяткаваньне каляд на Беларусі. — Менск: Унівэрсытэцкае, 1998. — 95 с. — Наклад 1.000 ас. ISBN 985-09-0259-0

Дзербіна Г. Права і сям'я ў Беларусі эпохі Рэнэсансу. — Менск: Тэхналёгія, 1997. — 175 с. — Наклад 300 ас. ISBN 985-6234-31-X

Дэкрэт «Аб Усходніх Каталіцкіх Цэрквах» [II Ватыканскі Сабор] / Пераклад рэдакцыі газэты «Царква». — Полацак: Сафія, 1997. — 16 с. ISBN 985-6448-02-6

Каляндар газэты «Царква» на 1998 год. — Полацак: Сафія; Люблін: Kerygma, 1997.

Козіч В. Чалавек і прырода ў сучаснай беларускай прозе. — Менск: Беларуская навука, 1998. — 96 с. — Наклад 3.000 ас. ISBN 985-08-0149-2

Паплаўскі А. Спынены лістапад. Вершы. — Берасьце: Рэдакцыя газэты «Шлях», 1997. — 64 с. (Сэрыя: Берасьцейскае вогнішча). — Наклад 150 ас. ISBN 985-6275-13-X

Сільнова Л. Агністыя дзьмухаўцы. Літаратурна-мастацкае выданьне. — Берасьце: Выдавецтва С.Лаўрова, 1997. — 32 с. — Наклад 200 ас. ISBN 985-6371-13-9

Сьвірыдаў С. Крык душы: Аповесьці, апавяданьне. — Менск: Мастацкая літаратура, 1998. — 286 с. — Наклад 700 ас. ISBN 985-02-0457-6

Данилов В. Мой путь к Богу и к Католической Церкви. — Полацак: Сафія, 1997. — 62 с. ISBN 985-6448-04-2

Czasopis. Pismo Informacyjno-Kulturalne Wschodniej Białostoczczyzny. — Nr. 3 (86). Marzec 1998. ISSN 1230-1876

Касэты — поштай

На складзе БГФ "Наша Ніва" ёсьць касэты (кошт 45.000 + 7.000 БРБ)

Касэты можна замовіць праз пошту: 220085 Менск, а/с 5, Віталь Супрановіч

1. Народны альбом: Супольны музычны праект (1997)
2. Палац. Дарожка (1997)
3. NRM. Made in NRM. Песьні з альбомаў 1995-1996
4. Новае Неба. Мая Краіна (1996)
5. Крама. Хворы на рок-н-рол (1993)
6. Данчык. Беларусачка і іншыя песьні (1974/1998)
7. Мясцовы час. Падвойны альбом (1998): Слота (1989), Мой дом (1990)
8. Žygimont VAZA. Стан галюцынацыі
9. Андрэй Мельнікаў. Гэта мы! (1996)
10. Камэлот. У краіне талераў (1995)
11. Віктар Шалкевіч. Смутны беларускі блюз (1996)

На складзе БГФ «Наша Ніва» маецца ў наяўнасьці больш за 70 найменьняў касэтаў беларускіх рок-гуртоў, бардаў, поп-выканаўцаў. З поўным сьпісам можна пазнаёміцца ў папярэдніх нумарах «Нашай Нівы».

Літоўская Мэтрыка

Прымаюцца заяўкі на тамы Мэтрыкі — 6, 7, 8, 10, 11. Ахвотным просьба зьвяртацца на адрас: п/с 5 Менск 220085, Віталь Супрановіч.

Калі маеце тэлефон, калі ласка, пазначце яго.

Беларускі хіт-парад

СТУДЗЕНЬ-ЛЮТЫ

1. Народны альбом — Ковчег
2. NRM. Made in NRM — Vigma
3. Данчык. Беларусачка — ВМА
4. Палац. Дарожка — Сатис
5. Андрэй Мельнікаў. Гэта мы! — ZBS
6. Мясцовы час. Слота. Мой дом — ВМА
7. Mroja. 28-ja zorka — ZBS
8. Žygimont VAZA. Stan halucynacyi — Skat rec
9. Кардон. Радыяцыя — БАС
10. KRIWI. Hei-loli — Ковчег

Новы год прынес новых герояў — цалкам абнавілася першая тройка сьпісу. Сам жа хіт-парад спазнаў кардынальныя зьмены, папоўніўся перавыданьнем двух альбомаў «Мясцовага часу» і новым альбомам «Палацу». Да творчасьці першага ўзрасла цікавасьць — гэта ўжо другое перавыданьне старых запісаў гурта за апошнія два месяцы; «Палац», прарваўшы блякаду ў СМІ ў першыя зімовыя месяцы, зараз ізноў у пазыцыі чаканьня. Цікавы факт: з усёй дзясяткі толькі альбомы KRIWI, «Палаца» ды праект «Народны альбом» можна лічыць абсалютна новымі працамі, астатнія ж намінанты — гэта перавыданьні. Што гэта: ці крызыс беларускай незалежніцкай музыкі, ці густы слухачоў вытанчаныя да такой ступені? Натуральна, ня варта забывацца на такую рысу характару беларусаў як настальгія, якая стала лёсавызначальнай у апошнія некалькі гадоў — т.зв. «советские» з болем узгадваюць тое, што ляснула ў Віскулях, «нацыяналы» — што ляснула ў 1994-ым, і ўсе імкнуцца вярнуць незваротнае, ідэальнае. Гэта добра відаць і ў музыцы, калі «советские» не зьбіраюцца мяняць маскоўскую папсу ні на што іншае, а «нацыяналы» давяраюць толькі праверaным у папярэднія гады выканаўцам.

У гэтым жа рэчышчы можна глядзець на творчасьць Данчыка, які ці не ўпершыню стаў музычным нацыянальным героем; гэта сапраўдны чалавек-мроя, прывід з прывіднай краіны, пра якую мы марылі, дзе спалучылася наша, беларускае, з тым, што называюць «амэрыканскай марай». Успомніце кожнае зьяўленьне на гістарычнай бацькаўшчыне, дзе яго сустракаюць як мэсію, як выратаваньне, як прарока, ад яго чакаюць Слова ці, дакладней, Песьні (можа, таму было расчараваньне ў чытачоў пасьля апошняга прыезду з канцэртамі — ён ня даў адказу на самае складанае «як?»). Таму апраўданай выглядае цікавасьць да рарытэтнага альбому «Беларусачка».

Кампіляцыя новых каралёў «Made in NRM», дзе на выбар сабраныя песьні з «Одзірыдзідзіны» і «Ŀалалала»; на другім месцы хіт-параду — гэткая ж нечаканасьць для ўсіх, як і рок-карона.

І, нарэшце, на першым месцы ў сьпісе папулярнасьці стаіць твор, які называюць і «культавым», і «нефіговым», і «файным» — «Народны альбом». Зноў напрошваецца паралель з матэрыялізаванаю нязьдзейсненаю марай. Але тут, здаецца, усё нашмат цяжэй: пры добрай прамоцыі «Народны альбом» рызыкуе стаць той сілай зьяднаньня для ўсіх нас, якой ён стаў для ўсіх беларускіх музыкаў, што ўдзельнічалі ў стварэньні праграмы.

Сяргей Сахараў

У нязьменных дэкарацыях

Лявон Вашко. Паэты-цары (трыццаць пяць беларускіх малюнкаў). Апавяданьні. — Менск: Мастацкая літаратура, 1997. 301 с.

Як чытаў гэтую кнігу, то ніяк ня мог пазбавіцца ад неадчэпнай думкі-мроі, што трымаю ў рукох кінасцэнар, напісаны кімсьці з кагорты нэарэалістаў адмыслова для «Беларусьфільма», але пастаноўка фільма не ажыцьцявілася зь невядомых прычынаў.

Трыццаць пяць малюнкаў Лявона Вашко, трыццаць пяць маленькіх навэл, дзеі якіх адбываюцца ў шараговым запыленым беларускім мястэчку. Навэлы, сабраныя пад гэтай вокладкаю, лучацца між сабою толькі тым, што дэкарацыі на працягу кнігі не зьмяняюцца. Усё тое ж запыленае мястэчка, усё тыя ж міліцыянт Байда й местачковая «галава» Вераніка Аркадзіеўна Базар, надзеленыя абсалютнаю ўладаю, усё той жа ціхаплынна-магутны Нёман.

Героі кнігі ўсе, як адзін, пражываюць сваё жыцьцё, ускладнёнае тым, што зь мястэчка вырвацца не лягчэй, чым індусу з сваёй касты. Парадак, у якім яны жывуць, успрымаецца імі як адвечны, таму й справядлівы. А можна зрабіць спробу падмануць сваю карму — зьехаць за белы сьвет, у далёкую Цюмень. Спроба — не хвароба.

У мястэчку вуліцы вузкія, на любімы мазоль суседа хочаш ня хочаш, а наступіш. Але кніга Лявона Вашко не перарасла ў кроніку крывавай вэндэты. Ад самаразбурэньня адміністарыцыйную адзінку, якая існуе толькі на паперы, ратуе гумар. Але гумар «Паэтаў-Цароў» вельмі падобны на бяззлобныя кпіны ў горцаў — вымушаная й асэнсаваная якасьць, зьнітавая з пачуцьцём самазахаваньня. Толькі ён, ды яшчэ творчасьць, зь якой не прыходзіць у галаву зрабіць прафэсію, ратуюць людзей, якім ужо абрыдла жыць у адных і тых самых дэкарацыях, на беразе ўсё таго ж несупыннага Нёмана.

Яшчэ не магу абысьці ўвагаю ў гэтай рэцэнзіі-карацельцы, сакоўнасьць і прыроднасьць мовы Лявона Вашко, мовы, ад якое ня тхне філялягічнай вывучанасьцю. Натуральная й простая, яна цешыць і захапляе мяне, як беларускае слова, пачутае ад простай бабулі, якая едзе нядзеляю ў перапоўненым віленскім тралейбусе да касьцёлу Пятра і Паўла.

Андранік

Супраціў супраціву

Новый Иерусалим. Ну что ты думаешь об этом? — Менск: Левит, N.J.sound, 1997.

Для беларускага рок-н-ролу слова «супраціў» набыло атрутны смак. Гэта як наркотык, безь якога пачынаюцца ломкі. Але ж рана ці позна «супраціў» пяройдзе ў шэраг гістарычных, калі праца дзеля адмаўленьня проста згубіць сэнс і цікавасьць як для слухачоў, так і для саміх музыкаў? Невядома, як будзе далей, але прэцэдэнт створаны: у сваім новым альбоме гурт «Новый Иерусалим» паспрабаваў перастуліць праз тую чырвоным пазначаную мяжу.

Гэты гурт за мяжой называюць проста хрысьціянскім: пратэстантызм, які спавядаюць музыкі, не адмаўляецца ад новых музычных павеваў, дазваляючы рок-гуртам з адпаведнай сьвядомасьцю выступаць нават у бажніцах, тым самым паказваючы на адкрытасьць веры. Гэтым жа можна патлумачыць і назву. «Ну что ты думаешь об этом?» — правакуючы слухачоў, музыкі самі адказваюць на гэтае пытаньне на працягу альбому.

Нешта накшталт рэклямы: «Кто прекрасней всех на свете? — Вы...», — і далей па тэксьце. Наогул, відзежа рэклямнага праспэкту не пакідае ўвесь час. Напачатку падаецца інтэрмэдыя «В нашем городе» — «А что если есть!» Вядома, ёсьць: «Короче так», «Мой рассказ», «Послушай, что тебе скажу» — бесьперапынная размова зь сябрам, у якога «подруга чумовая была», які «тырил дома сигареты», але адумаўся і перайшоў на бок Бога. Супрацьпастаўленьне дабра і зла на такіх «пабытовых» прыкладах, як ні дзіўна, мае ўплыў на слухача, ад якога «Новый Иерусалим» і набірае сваю энэргію. Але зазначым, што немалая роля надаецца і звычайнаму шоў, якога прагне слухач. Маленьні набываюць рысы карнавалу.

Менская рок-тусоўка скептычна ставіцца да «Нового Иерусалима»: зьмяніўшы «sex, drugs, rock-n-roll» на «In God we trust», хлопцы «здрадзілі» й асноўнай ідэі беларускага рок-руху — супраціву. Але парадокс — праз тое гурт нарадзіў ці ня новую плынь — супраціў супраціву. Асноўная ідэя рок-руху пачынае паступова страчваць сваю актуальнасьць, зьяўляюцца новыя людзі, якія ствараюць, так бы мовіць, сваю міталягічную прастору зь яе дэміургамі, героямі, мэдыятарамі.

Сяргей Сахараў

Клаўдзі Дуж-Душэўскі. Сьцяг

... Сьцягі не існуюць самі па сабе. Людзі, далёкія ад гісторыі з геаграфіяй, надаюць ім часам неўласьцівы сэнс. У 80-я адзін мой знаёмец пажартаваў, што ступень дэмакратыі вызначаецца колькасьцю палосаў на сьцягу, маючы на ўвазе Кітай і СССР. У тыя гады модным дэкаратыўным элемэнтам быў сьцяг ЗША. Яго наляплялі паўсюль, дзе было магчыма: на штаны, рамяні, торбы... У гэткай любові да нацыянальнага сымбалю Амэрыкі было, вядома, ня столькі эстэтычнага захапленьня, колькі жаданьня задэманстраваць сваю апалітычнасьць. Нікога тады не абыходзіла гісторыя й сэмантыка сьцяга ЗША. Гэта быў сымбаль памкненьняў, тады яшчэ цьмяна ўяўных...

... Гісторыя й сэмантыка нацыянальных сьцягоў часьцяком пакручастая й парадаксальная. Сьцяг рэспубліканскае Францыі, узьняты ў 1789 годзе, як ні дзіўна, увабраў у сябе самыя старажытныя фэадальныя й клерыкальныя сымбалі. Сіні — колер плашча Сьвятога Марціна, які адсек мячом ад яго кавалак, каб ухутаць жабрака. Аж з часоў Хлёдвіга, з 496 году гэты колер нязьменны французскі сымбаль. Чырвоны — колер сьцяга імпэрыі Карла Вялікага, прыняты ў 800 годзе. А ў 1498-м французскі сьцяг стаў белым — фамільным сьцягам Арлеанскае дынастыі каралёў. Злучаныя ў роўначасткавы трыкалёр — сымбаль Сьвятое Тройцы, сіні, белы й чырвоны сталі сьцягам... рэвалюцыі. Натуральна, народ не зьбіраўся паглыбляцца ў выкрунтасы дрымучае гсторыі, папросту гэты сьцяг паўстаў зь нетраў ягонае душы, як натуральна дадзены ад прыроды...

... Большасьць сьцягоў сьвету была створаная на мяжы XIX і XX ст. Дасьледчык Вячаслаў Насевіч заўважае: «Паколькі далёка ня ўсе эўрапейскія нацыі ў XIX стагодзьдзі мелі сваю дзяржаўнасьць, тады ж узьнікае паняцьце нацыянальнага сьцяга як сьцяга нацыі, якая на гэткую дзяржаўнасьць прэтэндуе. Такую ролю выконваў, у прыватнасьці, новы беларуска-чырвоны польскі сьцяг ці эстонскі сіне-чорна-белы, які ўзьнік у 1881 г.» І ў кожнага зь іх быў свой аўтар. Мастакі абагульнялі легенды, удасканальвалі традыцыю, кампанавалі ў эталён. Стварэньне нацыянальных сымбаляў — асобны разьдзел у гісторыі мастацтва. Напрыклад, Мсьціслаў Дабужынскі стварыў сёньняшні сьцяг Літвы. Праўда, літоўцы ўсё ж настаялі, каб жоўтая паласа была не пасярэдзіне, а зьверху. Аргумэнтам Дабужынскага было тое, што ў эўрапейскай геральдыцы колеры (эмалі) павінны разьбівацца белым ці жоўтым (мэталам). Аргумэнт літоўцаў быў нечаканы — студэнты-літоўцы насілі на фуражках жоўтую стужку толькі ўверсе. З таго часу сьцяг Літвы падобны да сьцягоў Этыёпіі, Габона і Ганы...

... Напрадвесьні свае дзяржаўнасьці, да 1917 году беларусы пэўна ведалі, што іхны знак — белая Пагоня на чырвоным тле. Аднак эталёну Сьцягу не існавала. Існавалі паданьні, існавала народная сэмантыка арнамэнту. У часе лютаўскае рэвалюцыі беларусы паслугоўваліся чыста белым сьцягам, на якім зьмяшчалі лёзунгі. Аднак неўзабаве гэткі варыянт падаўся недасканалым. Пытаньне пра Сьцяг паўстала рубам. Як і ўсе пытаньні ў тым годзе... Беларускія арганізацыі Пецярбургу зьвярнуліся да маладога архітэктара, выпускніка Пецярбурскага горнага інстытуту, Клаўдзія Дуж-Душэўскага, актывіста-выдаўца й тэатрала. За сябе сьведчыць сам Дуж-Душэўскі ва ўспамінах за 1934 год, напісаных па-літоўску: «Цікава адзначыць, што беларусы ўважалі сваім дзяржаўным сьцягам той, што і літоўцы, гэта значыць белую Пагоню на чырвоным полі, але нацыянальнага сьцяга не было. Мне давялося зрабіць некалькі праектаў нацыянальнага сьцяга, і адзін зь іх быў прыняты, менавіта: бела-чырвона-белы. Ад таго часу гэты сьцяг і лічыцца за беларускі». На жаль, аўтар не назваў даты зацьверджаньня свайго эскізу і хто менавіта яго зацьвярджаў. Мне асабіста было б цікава ўявіць і іншыя варыянты магчымага Сьцяга. Праўда, сёньня гэтага ўявіць немачыма... Паводле запісаных у 1968 годзе Адамам Мальдзісам успамінаў Язэпа Дылы, на Ўсебеларускім зьезьдзе выкарыстоўваўся чырвона-бела-блакітны сьцяг. Што гэта? Фальсыфікацыя? Памылка? На жаль, сёньня гэтага ўжо ня спраўдзіць...



Пра тое, што менавіта Душэўскі быў аўтарам Сьцяга, я часта чуў у Вільні, і ні ў кога гэта не выклікала сумневу. Сын Дуж-Душэўскага Сьцяпан падрабязна выкладаў бацькаву канцэпцыю. Паводле яе, бел-чырвона-белыя кукарды й стужачкі на фуражках насілі студэнты-беларусы ў Пецярбургу яшчэ да 1915 году. У гэтыя ж колеры спавіваліся розныя ўрачыстыя аздобы, сымбалізуючы ў стылізацыі народны арнамэнт. Праўда, гэткія ж колеры былі і ў латышоў. А таму беларусы з-за сваёй прыроднае сьціпласьці не сьпяшаліся «тузануць на сябе коўдру». Гэтак цягнулася датуль, пакуль латыскі мастак Яніс Гросвалдс не зрабіў праект бела-чырвона-белага сьцяга для латыскіх стралкоў, які яны мусілі б узьняць над Мітаваю ў выпадку вызваленьня яе ад немцаў... З гэтае прычыны беларусы былі ў разгубленасьці, пакуль у 1917 годзе латышы не спынілі свой выбар на кармінавым палотнішчы зь белай паласою. Такі варыянт нацыянальнага сьцяга Латвіі быў зацьверджаны канчаткова ў траўні. З гэтай беларуска-латыскай спрэчкаю зьвязаны й славуты інцыдэнт падчас адкрыцьця Ўсебеларускага зьезду: нейкі латвійскі бальшавік заклікаў беларусаў адмовіцца ад гэткага сьцягу. Заля ўскалыхнулася ад абурэньня. Латыскі таварыш, напэўна, даўно не бываў на радзіме й ня ведаў, што ўсё ўжо залагоджана.

У які ж дзень і дзе Сьцяг быў узьняты? Паводле сьведчаньняў, увесну 1917 году ён быў на будынку Беларускага таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны ў Пецярбургу. Дарэчы, Дуж-Душэўскі быў супрацоўнікам гэтага Таварыства з 1916 па 1918 год. Падобна што гэта магла быць менавіта яго ініцыятыва. Сьцяг Беларусі затрапятаў у падбітай сталіцы зруйнаванае імпэрыі. Неўзабаве Сьцяг рушыў у Беларусь. 12 сакавіка ў Менску адбылося масавае сьвята — нацыянальны Дзень беларускага значка. У гэты дзень бела-чырвона-белыя значкі, кукарды й сьцяжкі можна было пабачыць паўсюль на вуліцах. Сьцягі, пашытыя паводле эскіза Дуж-Душэўскага былі разасланыя ў мясцовыя арганізацыі. Радаслаў Астроўскі сьведчыў што ён сам атрымаў Сьцяг у траўні 17-га ў Слуцку, дзе ў той час працаваў. На тым Сьцягу было вышыта золатам: «Няхай жыве вольная Беларусь». У сьнежні 1917 году ў Менску падчас Усебеларускага зьезду бел-чырвона-белы сьцяг ужо адзінадушна ўважаўся за нацыянальны сымбаль Беларусі...

... На якім доме ўпершыню быў падняты Сьцяг у Беларусі? На дзіва, усе помнікі Менску, зьвязаныя з эпохаю БНР, ацалелі. Гэта і славуты гарадзкі тэатар, дзе 7 сьнежня 1917 года трыюмфаваў Усебеларускі зьезд, разагнаны праз 11 дзён бальшавікамі. Гэта і будынак чыгуначнага дэпо, куды перабралася Рада Ўсебеларускага зьезду, сапраўдным дзівам яшчэ ацалелы паміж рэйкавых шляхоў. Гэта і будынак былога Царкоўна-археалягічнага музэю, у якім была абвешчаная БНР, добра вядомы менчукам як «домік з шакалядкі», на якім яшчэ няма мэмарыяльнае шыльды, ужо выраблены скульптарам Шатэрнікам. Гэта, нарэшце, і былы губэрнатарскі палац, дзе засядаў Народны сакратарыят. Менавіта гэта і ёсьць першы будынак у Менску, над якім вольна залунаў наш Сьцяг — сымбаль Волі. Гэта быў дзень уцёкаў бальшавікоў зь Менску — 19 лютага 1918 году. Сьцяг быў зьняты з гэтага будынку кайзэраўскімі вайскоўцамі. Пра гэта, дарэчы, зь ня надта ўцямнай радасьцю шматкроць паведамлялі савецкія гісторыкі. Але што праўда — нямецкаму афіцэру не прыйшло ў галаву разьдзіраць на шматкі нацыянальны сымбаль беларусаў. Застаецца загадкаю, куды ён трапіў пазьней... Агульнанацыянальная ж вартасьць гэтага помніка, як Дома Беларускага Сьцяга, разумелася яшчэ тады. Ужо ў кастрычніку 1918 году ў менскім часопісе «Варта» быў зьмешчаны славуты здымак былога губэрнатарскага палацу, на гаўбцы якога лунае бел-чырвона-белы Сьцяг.

... У 1917 годзе ў «Статуце Беларускіх Нацыянальных Культурна-Прасьветных Гурткоў у войску» перадапошні пункт у загадным парадку паведамляў: «Кожын член беларускай грамады у войску павінен насіць беларускі нацыянальны знак — белая стужка з чырвонай палоскай пасярэдзіне; усе тры палоскі — белая, чырвоная і белая — аднэй шырыні». Нядаўна сярод збораў былога Інстытуту гісторыі партыі пры ЦК КПБ, што захоўваюцца ў Нацыянальным архіве Беларусі, дасьледчык Віталь Скалабан выявіў улётку арганізацыі «Беларускі гай». Гэтая культурна-асьветніцкая арганізацыя была ўтвораная ў сьнежні 1917 году ў Адэсе пры Беларускай Вайсковай Радзе Румынскага Фронту, дзе і зьявіўся гэты цікавы дакумэнт, надрукаваны, дарэчы, чырвонаю фарбаю. Ахайны бел-чырвона-белы аркушык... Красамоўным сьведчаньнем легітымнасьці нашага сьцягу яшчэ ў той час ёсьць ягоныя выявы на гэтай улётцы, дзе яны аздабляюць заклік: «Братья-Белорусы, объединяйтесь!» Сам тэкст выдрукаваны па-расейску, што ў пэўнай ступені лягічна ў тыя гады і ў тым месцы. Але сымбаль, сымбаль мусіў чытацца адназначна любым беларусам, да якога й апэлявалі «гаёўцы»... Гэткім сымбалем стаў Сьцяг. Душэўскі не памыліўся.

Як бы глыбака не адшукваліся карані Сьцяга, у крывіцкіх харугвах ці ў штандарах Уладзіслава IV, перадусім аўтару дакладна трэба было вычуць тое, што беларус пазнае як сваё. І гэта сталася. Не пасьпеў яшчэ Сьцяг патрапіць ва ўсе куткі краю, як яго ўжо ўважалі за неад'емную частку беларускасьці. Вацлаў Ластоўскі пісаў: «Белыя нагавіцы, белая кашуля, белая сьвітка, падперазаная чырвоным паясом — вось сыльвэтка беларуса. Зразумела, што і нацыянальны сьцяг беларусаў бел-чырвона-белы. Ён прыгадвае нам нашую белую сьвітку з чырвоным паясом».

Тамаш Грыб дае больш паэтычныя тлумачэньні: «Белая барва, як уяўленьне сьвятла, вельмі пашыраная на Беларусі, згэтуль, мабыць, паходзіць і назва Беларусі — белая, чыстая, вольная, як сьвет сонца. Ня менш пашыраная ёсьць на Беларусі і чырвоная барва, як чырвоны ёсьць золак на небе перад узыходам сонца; таму наш бел-чырвона-белы сьцяг — сьцяг адраджэньня і вызваленьня беларускага народу». Цікава, што ўспрымаючы Сьцяг літаральна праз год, як нешта цалкам натуральнае й дадзенае ад Бога, беларусы згубілі й дату яго нараджэньня й забыліся на аўтара...

Архітэктар Дуж-Душэўскі, які падпісваў свае праекты й малюнкі «Klod», а лісты да Антона Луцкевіча «Кляўдыя», ачоліў спачатку дыпляматыю БНР у краінах Балтыі, пасьля стаў дзяржсакратаром ва ўрадзе Ластоўскага... Па зьняволеньні палякамі ў 1921 годзе, ён пакінуў Беларусь, краіну, якой падарыў Сьцяг.

Сяргей Харэўскі

КЛАЎДЗІ ДУЖ-ДУШЭЎСКІ (1891, Глыбокае – 1959, Вільня) архітэктар, выдавец, журналіст, грамадзкі дзяяч. Скончыў Віленскую рэальную вучэльню. 1912-1917 вучыўся ў Пецярбурскім горным інстытуце. У 1921 ад'ехаў у Коўна. У 1924 скончыў Літоўскі Ўнівэрсытэт. Аўтар дзясяткаў будынкаў у Коўне, Панявежы, Клайпедзе, Шаўлях. Рэдактар часопіса «Беларускі асяродак».

У папярэдніх нумарах прадстаўленыя творы:

1. Фэрдынанд Рушчыц. Зямля
2. Мсьціслаў Дабужынскі. Віцебск, лесьвіца
3. Марк Шагал. Прамэнад
4. Ільля Рэпін. Беларус
5. Марк Антокальскі. Помнік Кацярыне
6. Вітальд Бялыніцкі-Біруля. Блакітная капліца
7. Хаім Суцін. Паж
8. Казімер Малевіч. Чорны квадрат
9. Язэп Драздовіч. Пагоня Ярылы
10. Валянцін Волкаў. Менск, 2 ліпеня 1943 году
11. Манумэнт Перамогі
12. Помнік Леніну ў Менску
13. Пётра Сергіевіч. Шляхам жыцьця
14. Аляксей Глебаў. Францішак Скарына
15. Міхал Філіповіч. Бітва на Нямізе
16. Лявон Вітан-Дубейкаўскі. Касьцёл Пятра і Паўла ў Дрысьвятах
17. Лявон Тарасэвіч. Бяз назвы
18. Ян Булгак. Выгляд з Зарэчча
19. Іосіф Лянгбард. Менская Опэра
20. Аркадзь Астаповіч. Дворык

грамафон.

Андрэй Аляксандраў

Я ЛЮБЛЮ БЕЛАРУСЬ

«Я люблю Беларусь», —
казалі вочы ваўкалака,
што ўзіраліся з падзямелья
ў далёкае неба.

«Я люблю Беларусь», —
скрыгаталі скрываўленыя латы
пад Грунвальдам
і Воршай.

«Я люблю Беларусь», —
сыпявалі рукі,
што прымалі Мудрасьць
над праскім брукам.

«Я люблю Беларусь», —
хрыпела горла,
што сустрэла пятлю
на шляху ў бясьсьмяротнасьць.

«Я люблю Беларусь», —
крычалі грудзі,
прашытыя чырвонымі ніткамі
вечнага сну.

«Я люблю Беларусь», —
плявалі вусны
ў твар
карычневай зграі.

«Я люблю Беларусь», —
адказвалі сьпіны
чырвона-зялёным дубінкам.

«Я люблю Беларусь!» —
гаворыць маё сэрца
і чуе ў адказ мільён
такіх жа словаў:

Я люблю Беларусь!

Тацяна Багарадава

***

На душе — холодное кипенье
и сирени шелест голубой...

С.Есенин

Аднаўленьне душы і прыроды...
А на вуснах — салодкі прысмак,
І настрой без падстаў і нагоды
Растлумачыць ня можна ніяк.

Ціхі сад дождж абмые вясновы
І пакіне парадак і лад,
Пракувае зязюля замовы
Ад зімовага суму і звад.

На душы, як пасьля прычашчэньня,
Стане сьвятла, і боль адляціць.
Адсьвяткую яе абуджэньне
І пачну па-вясноваму жыць!

Паскідаю апратку каханьня
І нікчэмную патаснасьць слоў,
І спатолю нарэшце жаданьне —
Акунуцца ў паветра бароў.

Водар хвояў і елак калматых
Задурманіць маю галаву.
Я адчую, што стала багатай,
Што ня горш за астатніх жыву.

І драпежніцкі колер даляраў
Я зьмяню на зялёны убор;
Зіцхаценьне рубінаў, кралаў —
На далёкую велічнасьць зор!

Цеплыню і пяшчоту зямную
Патрымаю ў далоні сваёй,
І сьлязінку зь бярозы буйную
Я змахну асьцярожнай рукой.

І пякельную смагу спатолю —
Увесь бярозавік выпʼю да дна —
За зямлю і за лепшую долю,
Бо на сэрцы — буяе вясна!

Вольга Базылёва

***

Я так хачу, пайшоўшы ў іншы сьвет,
Ізноўку нарадзіцца ў Беларусі,
А больш нічога. Нават пад прымусам
Я не зьмяню сваё жаданьне, не.

Навошта іншая краіна мне?
У сэрцы ўжо пятнаццаць год каханьне.
Балючым будзе нашае растаньне,
І рана ўжо ў вяках не зажыве.

Вярнуцца зноў, і зноў у родны Менск,
Ён стаў нібы паловай майго сэрца.
Так, гэта так, мне гэта не здаецца,
Маёй душы не перажыць замен.

Мы зь Беларусяй, як адно жывое,
А безь яе мне ўжо ня дыхаць, мне ня
жыць,
Балючым жалем сэрца затрымціць,
Бы зазьвіняць званіцы за ракой.

Мы разумеем думкі між сабой,
Мы блізкія, мы родныя, сваячкі,
І я за гэта ўсёй душой удзячна,
Я жыць магу, ды толькі разам зь ёй.

Тацяна Барысава

ГЭТА СПРАВА

Гэта справа
ганебных рабоў —
пакланяцца і падаць.
Наша справа —
стаяць, уздымацца, ісьці.
Наша Воля лунае
узьнесеным сьцягам.
Наша Воля крывёю
на сьнезе блішчыць.
А калі падрыхтуюць
сапраўдныя кулі
і гумовыя палкі
уздыме АМАП,
мы таксама сябе
як насьлед падрыхтуем.
Мы ніколі-ніколі
ня зьвернем назад!
Гэта справа
ганебных рабоў —
пакланяцца і падаць.
Нам да скону свайго ня быць!
Хай пачуцьцем Айчыны

Высокім і Палкім
наша мухнае сэрца
заўсёды гарыць!

Аляксей Бацюкоў

ТРЫ СЬЛЯЗЫ

Зышла Іржа
З майго нажа,
Крывя зышла з крыжа.

Схапілі рты
Свой сьмех пусты,
І цені зьбіліся ў гурты.

Мой белы край
Счарнеў ад зграй
Сьвятых, што не пусьцілі ў рай.

Тацяна Будовіч

***

Прыходзіць ноч. Пакуль магу,
Стараюся ня спаць,
Бо хворае маё ўяўленьне
Мне дорыць сны
З прыступак да вар'ятні.

Уладзіслаў Вольны

***

Яна выходзіць на вуліцы,
праспэкты і плошчы сталіцы,
гарачым, як полымя, сэрцам
яна растапляе сьнег.
І цьвёрды халодны лёд
пад ёйным абцасам драбіцца.
Іх тысячы — вольныя хвалі
зьнішчаюць варожы сьлед.

Як сьвежыя кроплі расы
на ранішнім ліпеньскім сонцы,
блішчаць васільковыя вочы
на фоне Айчыны сьцягоў
і сьціснуўшы пальцы ў кулак,
супольна зь іншымі крочыць
па плошчах, праспэктах сталіцы
пад безьліччу родных сьцягоў.

Яна набліжае Вясну
ў краіну нашчадкаў Скарыны,
зьмяняе людзкія настроі
і верыць, што блізіцца дзень
жаданай, сьвятой перамогі
для бела-чырвонай краіны.
Зялёным, густым аксамітам
засьцелецца продкаў зямля.

НАПІШАМ...

Напішам вольныя вершы
на аркушы чыстым паперы,
на белай, як ветразь, тканіне
гарачай ліцьвінскай крывёй,
яны стануць гострым навершам
для стрэл сучасных Гамэраў
і сьлед у кожным сэрцы пакінуць
адметнасьцю, сілай сваёй.
Напішам жа вольныя вершы
гарачай ліцьвінскай крывёй!

Сяржук Гіркін

МАЛІТВА ЗА БЕЛАРУСЬ

За Беларусь, яе лясы, палі ды рэкі
Мой родны край, які люблю.
Ёй Госпадзі паблаславі навекі,
Аб гэтым шчыра я Цябе малю.

Ёй, Божа, дай зімою сьнегу,
А летам добры й багаты плён,
Народу шчасьця дай давеку,
На ворагаў спашлі праклён.

А калі прыйдзе на зямлю яе сьвятую
Вайна, руіны, палоны, галады,
Абарані яе ад рук чужынскіх,
Дай ёй жыцьця на доўгія гады.

Сусьвет стварыў Ты, Божа, шмат краінаў,
Але адна зь іх толькі мне мілей,
Той край лясоў, палёў ды журавінаў,
Мая Айчына мне за ўсіх радней.

Андрэй Гуцаў

НЯВІННАЕ

Прыйдзе вечар —
і прыйдзе сон,
Прыйдзе ранак іскрыста-каляны.
Ты прачнешся, зірнеш у акно —
і пабачыш: яшчэ гэтак рана!..

На губах затрымаецца сьмех.
І з салодкай, дрымотнаю казкай
Ты прысьніш свой спакусьлівы грэх...
(Не замольвай яго, калі ласка...)

Ала Кажэра

ПАМЯЦІ МІХАСЯ ТКАЧОВА

Ён жыў між нас,
Пра гэта помняць вёрсты
Яго душой асьвечаных дарог.
Ён быў між нас,
Зь любові, а ня з помсты
Агонь сьвяты, як Прамэтэй, бярог.

І на сьвятло ўзьнятае Паходні
Пад родны сьцяг зьбіраўся сэрцаў боль,
Ад старажытнай шырыўся Гародні,
Адсюль, дзе замкаў вечная юдоль.

Не пакарыць ніколі той зямліцы,

Дзе замкі, нібы волаты, стаяць,
Заўжды вачыма пільнымі байніцы
У бок ворага нястомныя глядзяць.

У гонар твой над нёманскаю кручай
Няхай лунае вечны успамін,
І вечна будзе беларусаў лучнасьць
Ахоўваць там асілкавы спачын.

Хоць мінуў час, а цяжка нам паверыць
У непарыўнасьць горкае бяды,
Як свой працяг ты нам пасьлеў даверыць
Змаганьне Беларускай Грамады.

Алесь Катлянік

ЖЫВЕ БЕЛАРУСЬ! ЖЫВЕ ГРАМАДА!

Каўбасна-водачная пыса,
Грашова-рэчавы манкурт,
Забыўшыся на словы Бога,
Штурхаюць душы да пакут.

Што ж мераць жыцьцё карытам
Ды сонца чакаць у вакно?
Ліцьвін-беларус!
Ні быдлам ня будзь,
Ні подсьцілам дзеля яго!

Ня сьпі, душа!
Не лянуй, галава!
Жыве Беларусь!
Жыве Грамада!

Пазначым час айчыннай справай,
Засьведчым гонар ды любоў
І на вірлівых скрыжаваньнях
Ня здрадзім памяці дзядоў.

Ці спадчына не ў нашчадкаў?
Ці лёс за чужынскім дваром?
Ліцьвін-беларус!
Краіны абрус
Трымай годным гаспадаром!

Ня сьпі, душа!
Не лянуй, галава!
Жыве Беларусь!
Жыве Грамада!

Макс Кірэйчык

ПАРТЫЗАНСКАЯ

Ціхім ранкам сьцеляцца туманы,
Цёмным ценем хіліць лісьце клён.
Сьпіць дуброва, сьпіць зямля ўзарана,
Сьпіць у магілах зброі горкі плён.

Ціхім ранкам сьветлы месяц згінуў,
Зорак срэбных мяккі згас прамень.
Сьпі ў сьвітаньня час, жаўнерскі сыну,
Сьпіць пад пеплам зброі гордай цень.

Ціхім ранкам лес заснуў цяністы,
Сполахі зарніц пачалі баль.
Недзе па палёх, лясох імглістых
Чуйна дрэмле зброі нашай сталь.

Ціхі ранак не прынес спакою.
Ноч сышла, Літвы заве штандар.
За спачын магіл Літоўскіх вояў,
Час настаў — абудзьма зброі гарт!

ПРА АРЛОЎ

Orzeł Biały tu był swym ptakiem
Tutaj wił gniazda, był naszą opieką.

З аматарскай паэзіі абываталяў
польскае нацыянальнасьці.

Не відаць арлоў у хмарным небе —
Над Літвой нялётнае надвор'е.
Усё жывое хіліцца да глебы,
Апроч стромкіх храмаў на ўзгор'ях.

Biały Orzeł зданем бляклым сноў
Над абшарам «białoruskiej ziemi».
Ад разбораў тут маскаль лютуе —
Хворае на ўсе заганы племя.

А аскепкі Рэчы Паспалітай
У тутэйшым каталіцкім людзе
Будзяць рух да Macierzy obfitej,
Выракліся свае Маткі ў брудзе.

Гэй, панове, марныя стараньні!
На хлусьні будуеце бажніцу.
Бо «літоўскі фактар» зноўку стане
Палкай ў кола вашай калясьніцы.

Менск і Вільня вашых простых мрояў —
Толькі цэнтры крэсавай пальшчызны.
З гэткай «сьвежасьцяй» ідэйнай зброі
Не прыдбаць агульнае спусьцізны.

На стагодзьдзі Крэва нас злучыла,
Хіба Рыга разьвяла навечна?
Крэсавяк Літве чужая сіла.
Рада Поляка — заўжды дарэчы.

Крэва, Люблін, Берасьце, Варшава —
Нашых слаўных дзеяў крыж супольны.
Разам узьнялі харугвы славы,
Разам палі ў кайданы няволі.

З прыкрых звадак, горкіх закалотаў
Карыстае толькі «двохгаловы».
Не дамо ж заборцам нашай цноты,
Не разбурма край наш на паловы!

Не гнязьдзяцца на Літве арлы,
Бусел тут заўжды апекай людзям...

Тацяна Лапцёнак

БЕЛАРУСЬ

Беларусь, Беларусь, Беларусь...
І мне не забыць Тваіх рук,
што калыхалі, гушкалі мяне
у сярэбрана-белым палыне...

Мяне маленькую, яшчэ дзіця,
Ты навучала слухаць дрэвы
і галасы калосьсяў сьпелых
і белы-белы Твой прасьцяг...

Беларусь,
за Цябе хто радней мне тут,
за Цябе, такую адзіную?
Ты была сваім дзецям чужынай,
і цяпер ня скажуць «Айчына»,
скажуць проста — месца жыцьця.

Беларусь,
падымі вочы ў неба...
Ты заўсёды была, як дзіця,
і ня верыла словам ганебным,
а чакала да забыцьця,

што і Цябе палюбяць,
як сама Ты ўмееш любіць —
назаўсёды, усёй істотай,
пакуль сэрца ня скончыць біцца...

Беларусь,
бачыш — зоры ня гаснуць.
Гэта душы тых, хто любіў,
хто застаўся Тваім дыханьнем,
бласлаўленьнем Тваім і Сілай.

Беларусь,
на руках насіла
ты калісьці гэтых дзяцей,
а цяпер — паглядзі на неба —
яны сьвецяць для ўсіх людзей,
яны сьвецяць, каб Ты квітнела,
каб Табе стала дыхаць вальней.

Беларусь,
падымі вочы ў неба...

Алесь Менскі

ДЗЕНЬ ВОЛІ

Што будзе на Дзень Волі?
Дождж з ранку ці слата?
Сьвятло залье раздолье
Ці брудная вада?

Ці завядуць у небе
Пляскучы сьпеў сьцягі?
Ці будзе кроў на глебе,
На тварах пісягі?

Пытаньні йдуць бясконца
Ды роздумаў даволі —
Мы будзем. Будзе сонца.
І будзе наш Дзень Волі.

СЯСТРЫ

Маладзейшая за Волю
Акурат у пяць разоў —
Хай у столькі ж разоў болей
Ты пачуеш добрых слоў.

Ад выгод усіх гатункаў,
Ад пяшчотных пацалункаў,
Ад шыкоўных падарункаў
Хай ня будзе паратунку.

Ну а мой кароткі вершык
Будзе хай зь іх самы першы!

М.Міхееў

***

Верце, людзі, што ня будзе
Беларусяй правіць зграя,
Моладзь наша не такая,
Нас ня купіш на мякіне!
Мужнасьць хай нас не пакіне!

Верце, людзі, не забудзе
Наш народ такія сьвяты!
Хай трасуцца нашы каты,
Іх чакаюць ужо краты.
Мужнасьць хай нас не пакіне!

Вецер будзе... Будзе бура!
Не ўтрывае дыктатура!
Мудрасьць хай нас не пакіне!

Зьміцер Піскур

АБЛОГА

Па мокрым бруку кволымі нагамі,
хадой п'яною ўздоўж якой дарогі,
паўз ліхтары, харчэўні, корчмы, крамы,
куды ж мяне вы цягнеце, о, ногі?!

Я заблукаў у лябірынтах вулак,
як жа адолець гэтую аблогу?
Апёк руку забыты недакурак.
Дапамажыце ж галаве, о, ногі!

Пятро Прыходзька

ТАЛІСМАН ЛЮБОВІ

Замальвала дзяўчына хлопца-волата,
Імкнулася красой зачараваць, —
Умела зь медзі, волава і золата
Свой талісман любові змайстраваць.

Так раіла рабіць яшчэ бабуля,
Пражыўшая ў любові многа год:
Міналa ў бойках яе мужа куля,
І ўвесь стары мужнеў зь вякамі род.

У споведзі перад бацькоўскім краем
Ніколі не прысутнічаў спадман...
Любой дзяўчыне ад душы параім
Рабіць такі любові талісман,

Каб заўважаць ня толькі бляск мэтала,
А дабрыню ўсяе радной зямлі,
Каб зорка ярка ў талісмане зьзяла,
І кветкі ў ім блакітныя цьвілі,

Каб у яго ўпляталася праменьне
Нягасных зорак, цьвет маладзіка,
Чырвоных, белых ружаў зіхаценьне
І ціхі шэпт вясною раўчука.

Зьдзяйсьненьню мар ня будзе
перашкоды
Ні ў яве, ні ў летуценьні сноў.

Ад прыгажосьці роднае прыроды
Заўжды ўзгарыцца на душы любоў!

Браніслаў Пяткевіч

ВЯСЕНЬНЯЕ

У дзень нараджэньня Радзімы
Зацьвердзім вялікае сьвята,
На сьвет навакольны глядзім мы
З жаданьнем свабоды крылатай.
У душы сваіх патрыётаў
Усялім збавеньня надзею,
Трамплін для высокіх узьлётаў,
Праклён на пагібель зладзею.
А тых, хто памёр у змаганьні
За край нязалежны й родны,
Празь песьні, быліны, паданьні
Узвысім на помнік народны.
Нам сонца асьвеціць дарогу,
Калі да жыцьця мы ў стане,
А лёс прынясе перамогу
І праўда у вочы нам гляне.

Алена Раманоўская

З ГЕНРЫХА ГАЙНЭ

Wo wird einst Wandemuden...

Дзе, вандроўнік прытамлёны,
Урэшцце зьведаю спакой?
Мо пад ліпаю знаёмай?
Мо пад пальмаю чужой?
У якім далёкім краі
Я, здарожаны, засну?
Хто бяз суму закапае
Безназоўную труну?
Што гадаць! Пад небам Божым —
Так я шлях закончу свой.
І ня сьвечку ў час апошні —
Зорку ўбачу над сабой.

Алесь Рыбачонак

***

Там, дзе праўдзе ніхто ня верыў,
Дзе ілгалі з усьмешкай сьвятой,
Нарадзіўся прарок, што ўсё ведаў,
Што наперад глядзеў прад сабой.
Ведаў ён усё, што магчыма.
Таямніц не было для яго.
І зьмяніць ён мог усё на Сьвеце,
Каб сказаў хоць слова адно.
Толькі слоў ён ня ведаў зь дзяцінства,
З нараджэньня ня мог гаварыць.
Ён нямы быў.
І ўсе яго веды
Пахаваны былі разам зь ім.

Алесь Туровіч

МЭТА

Мэлядычныя рытмы плэера
Пазайздросьцяць нахабству CD.
Парадыгма цывільнасьці зьменена,
Таму зьдзіўлена так не глядзі.

Электронная кроў забруджана,
Невылечнай хваробай хыцьця,
Нашу плоць віртуальнымі стужкамі
Закаваў невядомы судзьдзя.

Калі стануць нарэшце квадратнымі
Нашы твары, як тэлеэкран,
Мы запоўнім галактыку квантамі
І адновім разбураны храм.

Юры Чарнякевіч

ПАЭМА БЕЗ ІМЯ

Мая Радзіма, Крывія мая!
Як сонца бліск у небе маладым,
Народжаным зусім нядаўна,
Ты сустракаеш край, які ня згас!
І разам зь ім
Ўстаеш над памяцьцю і часам.

Стагодзьдзі белых крылаў не забылі.
Адкінуты ланцужкаў-ніцяў,
Салдатаў той жахлівае пары,
Агні.
І бляклыя рамонкі, васількі
Ў блакіце,
Ня сьняць аб радасным,
Заўсёды вечным дні.

Хай нас парою старажытнай
З муроў, дзе продак паўстае,
Ня кліча голас,
Як і гісторыя, забыты,
А з прашчурам,
Зь дзядамі нашымі ідзе.

Баяцца недарэчна ў сьвеце сэрцаў,
Што ў будучыні яснай адбіваюць
Свае удары;
Дзе людзі людзям адчыняюць дзьверы,
І нам з табою, іншаплянэцянін.

Бяз скрыгату бяздоннай будзе вера,
А ў цемры, той стары калодзеж,
Куды з табою кідаем каменьні,
Ня будзе адгукацца лёгкім усплёскам...
Вада праб'ецца!
І нішто, нішто не перашкодзіць!

... Як разьвітацца мне з табою,
міжплянэтнік?
Былое, пыл дарог пакінем ветру
І дзецям нашым,
З Сонечнай сыстэмы...

Мае развагі-думкі, так, нязначны,
Бяз словаў зразумее той, хто розум мае:
Адзін — хто ён? Ня мае сэнсу
Казаць пра непазьбежнасьць існаваньня
Ўва ўсёй Галяктыцы, ва ўсім Сусьвеце
Сяброў, братоў...
Такіх жа адзінокіх, як зямляне.

Аляксей Чубат

***

Люблю чытаць лісты,
Увосень асабліва,
Дзе слова смак густы
Напісаны чульліва.

Жыцьця кароткі сьпеў
Яны распавядаюць
І, ціхонька канаючы,
Ад дрэва адлятаюць.

Алесь Шадрын

Пераклад М.Гумілёва «Перед ночью
северной...»

Перад ночай Поўначы малою
Ды за ёю золкі — быццам кроў,
Падышла нячутнаю хадою,
Паглядзела на мяне любоў.

Атруціла позіркам, дыханьнем
Саладзейшым за дыханьне руж —
Зьнікла ў май зь яго зачараваньнем
Да Нявы люстранай, прэч ад сьцюж.

Хто параіць, дзе шукаць збавеньня,
Як да лёгкай восені дажыць,
Каб сьпякоты летняй зіхаценьне
Не змагло мне сэрца спапяліць?!

Ціхі сьнег засыпле сум і гора
І нічога будзе не шкада,
Будуць віхры енчыць у Чорным моры,
Сябру клікаць гучная вада.

Я скажу ёй : «Хочаш, мы паедзем,
У край ня белых — кут блакітных сноў,
Ні тваім, і ні маім суседзям
Мы ня кінем разьвітальных слоў»,

Не адмовісься тады — НАПЭЎНА —
Толькі б лета хуценька прайшло,
Толькі б сьцежку ў рай, для нас, царэўна,
Мілым, крохкім сьнегам замяло.

Сымон Шаўцоў

ДАРОГІ

Эх, дарогі вы, дарогі!
Я адзін, а вас так многа!
Куды вядуць тыя дарогі,
Што пачаліся ад парога
Маёй хатанькі старое?
Куды вядуць тыя дарогі,
У які нязнаны сьвет?
Дзе іх канец?..
Па ухабах і па горах,
Праз балоты і праз грэблі,
Па марах і акіянах,
Праз сухмень і хмызьнякі,
Цярністыя дарогі,
Акрывавіў свае ногі.
Твар мой потам залівае.
Сам я горкі, нібы сажа...
Куды вядуць тыя дарогі?
Дзе іх канец?
Хто мне скажа?..
Адшукаю той дарогі,
Што назад вядзе к парогу
Роднай хаты ў Беларусі,
Будавацца я вазьмуся.

Мікола Яўмененка

БЕЛАРУС

Як жывеш, беларус?
Ачуняеш калі?
У чарговы хаўрус
Цябе пхнуць маскалі,

Каб з каленяў, крый Бог,
Ты раптоўна ня ўстаў,
Не адскочыў убок,
Самастойным ня стаў.

«Брат старэйшы» цябе
Зацугляў, як каня,
Й паганяе, дзяўбе,
Бы ты пень ці даўбня.

«Брат старэйшы» гатоў
Рабаваць, гвалтаваць
І «малодшых братоў»,
Абы не працаваць.

Згвалтаваўшы Чачню
Й вольнай Грузіі стан,
Падвяргае агню
Горны Таджыкістан.

Беларусаў правы
Дома каб бараніць,
Рэзыдэнтам Масквы
Ўезд да нас — прыпыніць.

А інакш маскалі
Наш каўбасны натоўп
Ператвораць калі
У бяздомных братоў,

Навакольле ж тваё —
У надзейны каўпак
Для сталіцы сваёй
Нізавошта, за так.

Каб ня жыць абы-як,
Каб пагібель мінуць,
Бел-чырвон-белы сьцяг,
Герб з «Пагоняй» шануй!

Алесь Белы

ДЗЕНЬ НЯНАВІСЬЦІ

З самай раніцы. У выглядзе сыцен, у шэрасьці столі, у заспанасьці вачэй. А потым — позіркі. Адкуль у людзей столькі нянавісьці?.. Цыгарэта, машыны, вуліца зь людзьмі, якія сьпінай да мяне. Так лягчэй. Лепш быць па-за імі...

Двор. Нікога. Усьмешка і «Are you OK?» самому сабе. Усё нармальна. Нянавісьць быццам адступіла. Але раптам: «Ці ня хочаце паўдзельнічаць у нашай лятарэі?» — неспадзяваначцы з нацягнутай усьмешкай непатрэбны адказ... Шпрыц і 5 кубікаў 95%-нага раствору нянавісьці ў вену. Так, што бялееш і не трымаесься на нагах. Але сп. неспадзяванка прымушае стаяць. Крыху ачуняў...

— ?!! Яшчэ дзьве дозы!

— ...

— !! !!!

Ніколі не разумеў, як чалавек можа дрэнны настрой пераганяць у нянавісьць. Так, што яна можа забіць і мяне, і яго. Навошта забойствы? І чаму радасьць ад нянавісьці?..

Нарэшце вольны, нарэшце сябры. Сябры — наркотык. Ведаю, што потым — тыя самыя позіркі. Думка: лепш ужо сьпіны, лепш так, каб быць аднаму. Хоць і аднаму не лягчэй...

Шпрыц. Вялізны. З-пад нянавісьці. Набірае кроў з самога сэрца... Не шкада мне сваёй крыві. Шкада проста так аддаваць яе забойцы. Ды і шкада ў 23:59 казаць самому сабе: «What a fucking day was today»*.

* Што за непрыемны дзень быў сёньня.

М. Г.

БРУДНАЯ РЭЧ ПАЛІТЫКА

У маёй памяці пачатак гэтай гісторыі зьвязаны з адным вечарам у цеснай сяброўскай кампаніі, калі размова ўрэшце зьвялася да таго, да чаго непазьбежна зводзілася цяпер усякая размова (да Ўладара), і А. мімаходзь згадаў, што ў новым Дэкрэце — праўду казаць, цалкам тыповым і нават глянавым — ёсьць «рацыянальнае зерне». Ніколі наш А. ня быў «экстрэмістам», але погляды ў яго былі добрыя; у сымпатыях да ўладаў ніхто тады ня мог А. западозрыць, і пэўны час ён зусім арганічна ўпісваўся ў нашую «антыўрадавую групоўку».

Менавіта таму, што А. лічыўся сярод нас сваім, я так зьдзівіўся, убачыўшы ў тэлерэпартажы аб чарговым мітынгу ў падтрымку Ўладара, якія я глядзеў, прызнаюся, з чыстага мазахізму, майго знаёмага А., які сьціпла прытуліўся ўбаку ад сьвяточнага натоўпу. Ягоная постаць прамільгнула на фоне транспарантаў, дзяржаўных сьцягоў ды партрэтаў Уладара і зьнікла; тады я быў амаль упэўнены, што памыліўся.

Пасьля мы ня бачыліся даволі доўгі час (А. больш не прыходзіў на нашыя сустрэчы), але ўсё роўна я і зьдзівіўся, і засмуціўся, калі да мяне дайшлі весткі пра тое, што А. ўступіў у Партыю Маладых Патрыётаў. Усё ж А. быў нашым чалавекам... Але, урэшце, гэта ягоны выбар, сказаў я сабе, дэманструючы шырыню поглядаў. І хутка ўбачыў прозьвішча А. ў «Чэсным весьніку» — адзінай газэце, што ў нас засталася. Там з кожнай літары ягонага ліста выглёсквалася гнеўнае асуджэньне жменьцы адшчапенцаў, якія спрабуюць раскалоць адзінства нашага грамадзтва. Можа, тады я і зразумеў канчаткова, што нас разьвяло па розныя бакі барыкадаў. А. усё часьцей можна было заўважыць на ўрадавых мітынгах, але ён ужо не туліўся нясьмела недзе з краю, а горда ўзьнімаўся над натоўпам і агітаваў «тут і зараз» далучыцца да партыі ўсіх, хто па нейкіх прычынах гэтага яшчэ не зрабіў. На ягоных грудзях цяпер быў значок, які выдаюць у ПМП лідэрам мясцовых арганізацыяў. Відавочна, А. ішоў угару.

Між тым, жыцьцё ў нас станавілася ўсё больш змрочным. Доўгі, вельмі доўгі час я ня мог прызнацца самому сабе ў тым факце, што Ўладар стаўся для мяне своеасаблівай ідэяй фікс. Нябачная яго прысутнасьць паступова рабілася фонам для ўсіх маіх думак. Але дзіўная справа! Чым больш я думаў пра Ўладара, тым больш я думаў пра А. І калі думкі аб Уладары даўно ўжо выклікалі ўва мне галоўным чынам ціхую агіду, дык думаючы пра А., я ўсё часьцей адчуваў прыпадкі самай сапраўднай лютасьці. Падумаць толькі, што калісьці мы былі сябрамі!

У нелегальных лістках, якія распаўсюджваліся выключна сярод сваіх — усё, што засталося ў нас ад СМІ — ужо зьяўляліся карыкатуры на А., лепшы паказчык росту ягонае вядомасьці. Па руках пайшоў гуляць ананімны твор, напісаны даволі прымітыўна, але са зьместам, вельмі для А. абражальным. А той ужо паціскаў руку Уладару на ягоных абавязковых сустрэчах з патрыятычна скіраванай моладзяй...

Вестка аб выбуху пад час сьвяткаваньня Заканчэньня Збору Ўраджаю сталася сапраўднай неспадзяванкай. У самы разгар фэсту ў руках А., які ўжо атрымаў права стаяць за тры чалавекі ад Уладара — рэдкая прывілея — нечакана зьявілася выбуховае прыстасаваньне... Уладара нават не змаглі пахаваць па-людзку — уласна кажучы, ад яго амаль нічога не засталося. Як і ад самога А. і некалькіх чалавек з Уладаровага атачэньня.

Акрамя радасьці, крыху прыхаванай (усё ж загінулі людзі) і вялікага зьдзіўленьня, было яшчэ нешта — нікім адкрыта ня выказанае, гэтае нешта нібыта лунала ў паветры. Так, нам усім зрабілася някавата. І нават абавязковы лямант імгненна зьвернутай зь нябыту незалежнай прэсы аб самаахвярнасьці Героя, які ўвесь гэты час хаваў у сабе Тайну, рыхтаваў сябе да Подзьвігу і г.д. быў не такім ужо і гучным, нібы ўсе чакалі нейкага канчатковага распараджэньня зьверху — колькі сьлёз належыць праліць і якім глыбокім павінен быць смутак.

Я ж мусіў прызнацца самому сабе, што не магу ні захапляцца А., ні шкадаваць яго. У маіх мазгах нібыта спрацоўваў нейкі блёк. Наперадзе, я проста занадта прызвычаіўся ставіцца да А. з пагардай і нянавісьцю. Цяжка зьмяніць уласную сьвядомасьць — значна цяжэй, чым зьмяніць сьвядомасьць натоўпу.

Гісторыкі шукалі сьведчаньні ягонага схаванага нацыяналізму, каб лягчэй было ўхваліць А. у новых падручніках гісторыі, але не знайшлі нічога. Усё было абсалютна чыста. Усё было бездакорна. Ніякіх сьлядоў другога жыцьця, падвойнага дна. Таму маштабы акторскіх здольнасьцяў А. выклікалі амаль жах. Калі — я ня мог пазбавіцца гэтай думкі — гэта былі акторскія здольнасьці.

З-за відавочнай неадпаведнасьці вобразу Зьнішчальніка Дыктатараў ён так і ня здолеў стаць сапраўдным Героем. Ён ня стаў і наўрад ці калісьці стане часткай нашай сьвядомасьці, эталёнам, зь яго не атрымалася мясцовага варыянту Жаны д'Арк ці якога іншага сымбаля. Шчыра кажучы, аб ім нават ня так ужо і сумавалі — наперадзе былі і выбары ў легітымны Парлямэнт, і змаганьне зь перажыткамі старога, і ўсе цудоўныя клопаты новага жыцьця.

Сяржук Герасімаў

ЖЫЦЬЦЁ ПРАЦЯГВАЕЦЦА

Лявон не хацеў туды йсьці. Ён мог бы някепска адпачыць і на прыродзе. Напрыклад, на беразе кансэрватыўнай Сьвіслачы, гледзячы на якую, не разумееш, у які бок яна цячэ, а раз-пораз нават пытаесься ў сябе: «Ці варушыцца яшчэ гэтая рэчка ўвогуле? Ці не спынілася?»

ЭПІКОН

У Лявона не было любімых месцаў на рацэ: ён любіў частку Сьвіслачы. Тую частку, што пачыналася недзе ў Вясьнянцы, і цягнулася аж да Траецкага прадмесьця. Седзячы тут на лаўцы, камяні ці проста на зялёным дыване сьвежапакошанай травы, хлапец заўсёды адчуваў сябе ўтульна. Утульнасць наведвала адразу, як толькі ён садзіўся і пачынаў кідаць цікаўныя позіркі на незапэцканае люстэрка спакойнай вады. А калі побач знаходзілася некалькі пляшак зь цёмным півам, Лявон, цягнучы словы, вымаўляў з асалодай: « Ух! Гэта — не піцьцё, гэта — ежа... Натуральна... Жыцьцё працягваецца...»

І яно сапраўды працягвалася. Працяг жыцьця распасьцерся перад вачыма ў выглядзе жывапіснага сонечнага захаду, надрыўлівага квохчаньня жабаў, дружнага сямейства качак, якое нехта патрывожыў, інтымных паходкаў закаханых, што прадвяшчалі пошукі патаемных месцаў, і, магчыма, хуткую дэфлярацыю. Лявон у захапленьні ганарыўся навакольлем.

Але сёньня хлапец быў запрошаны ў нейкую, як яму здавалася, нецікавую тусоўку. Яны павінны былі сустрэцца ў летняй кавярні, дзе заўжды гучала адна й тая песьня: «Мальчык хочэт в Тамбоў, чыкі-чыкі-так...»

«Мне ўсё падабаецца, акрамя месца сустрэчы. У каго такі кепскі густ? Няўжо ў ЯЕ? А можа і не ў ЯЕ? Хутчэй — не ў ЯЕ...» — павольна разважаў Лявон, ґлытаючы чароўныя кроплі бурштынавага напою.

Так, гэта ЯНА яго запрасіла. Запрасіла, па ЯЕ словах, каб бліжэй пазнаёміцца. Абяцала прыйсьці разам зь сябрамі.

Лявон сустрэўся зь ЁЮ на rave-вечарыне, дзе бавіў час пад цяжарам касьмічнай DJ'скай фантазіі. Большасць моладзі ўжо пасьпела атрымаць сваю долю кайфу, стомлена адчуваючы набліжэньне раніцы. Вечарына крочыла да сканчэньня.

І яна скончылася: у памяшканьне ўскочылі амонаўцы і пачалі кідаць на брудную падлогу тых, хто ім «не спадабаўся». Даўгавалосы Лявон ніколі не выклікаў сымпатыяў сярод ахоўнікаў правапарадку. Ва ўсялякім разе, яму ў гэтым яшчэ ніхто зь іх не прызнаваўся.

Нехта балюча піхнуў хлапца ў сьпіну, і, схапіўшы за валасы, кідануў на бэтонную падлогу. Музыка сьціхла. Боль працяў сківіцу, у роце зьявіўся смак крыві, вочы заслаў туман...

Амонаўскія боты шырокімі крокамі хадзілі туды-сюды і супакойвалі «нязгодных». Пры гэтым уладальнік ботаў задаволена напяваў: «Таварышч прэзідэнт, настанет той мамент, і да канца вам паверат людзі...»

Далейшае відовішча пачало вяртаць Лявона да жыцьця: пяцёра амонаўцаў скочылі да працавітага DJ'я і выкінулі яго з крэсла, куды адразу ж узьбіўся міліцыянт з паперкай і вялікім пузам. Ён няўдала пачаў DJ'скія навушнікі і распачаў: «Раз, раз... Дзекрэт... Раз, два... У міня — дзекрэт... Раз, два, тры... Так, нармальна... У связі з новым дзекрэтам Прэзідэнта зданіе дзіскацекі пераходзіт у ведамства Міністерства культуры!»

Пры гэтым рознакаляровыя ліхтары і лазэрныя промні сваім хуткім мільганьнем сьпяшаліся пацьвердзіць словы міліцыянта, які працягваў: «Аснаваніем для прыняцйя дзекрэта служыт папраўка к статье Канституцыі Прэзідэнта «А маладзёжых цічэніях», сагласна каторай, цыцірую: «... начныя клубы і дзіскацекі, гдзе была замечана нарушэньне маладзёж'ю абшчэсьцьвеннага парадка, пераходзят у кампетэнцыю Міністерства культуры імені Э.Ханка»! Танцы кончаны, па дамам, наркоты!» — прагрымеў пузаты.

Лявон ня вытрымаў, і... зарагатаў. Нехта, зусім побач, таксама заліўся звонкім дзявочым сьмехам. Ён агледзеўся і сустрэў позірк той, што сьмяялася. Раптам Лявон сьціх.

Так нечакана сьціхаюць, калі на вялікім лузе, сярод незьлічонай колькасьці ўсялякага пустазельля, выпадкова трапляюць на прыгожую кветачку, ад адзінага толькі выгляду якой усе маркоты забываюцца, і ты зноўку адчуваеш, што жыцьцё — працягваецца.

ЯНА таксама пасур'язьнела, прамовіўшы: «Ой! Ды ў цябе губа пабіта, я зараз дапамагу...»

Лявон шчыра падзякаваў ЁЙ за дапамогу, спрабуючы яшчэ раз зазірнуць у бязьмежжа ЕЙНЫХ вачэй.

«Ведаеш, пасьлязаўтра ўвечары мы зь сябрамі зьбіраемся адпачыць. Калі хочаш, прыходзь у кавярню, на праспэкце, — пачуў хлапец, — толькі пакінь мне нумар свайго тэлефону... А вось табе — мой... Ну, бывай, папраўляйся».

... Лявон нетаропка рыхтаваўся да сустрэчы. Раптам нехта патэлефанаваў. Ён пачуў ЯЕ: «Разумееш, мае сябры ня прыйдуць, а месца для адпачынку, якое яны абралі, ня надта мне і падабаецца. Таму я прапаную набыць піва і пашпацыраваць на Сьвіслач. Калі ты згодны, то — да сустрэчы праз гадзіну ў Траецкім...»

Лявон сьпяшаўся, бо жыцьцё працягвалася.

Вольга Колас

РАЗМОВА ПРА ПРАЖЫТЫ ДЗЕНЬ

***

Вялікі ліст белай паперы, згорнутай у кутку, згубіў спадзеў быць некалі размаляваным. Бялей за шпалеры і сьвятлей за стол. Вось так часта здараецца, што нашыя жаданьні застаюцца чыстымі аркушамі...

***

Штодзённая барацьба за выжываньне без размовы з прыгожым

закопвае ў нас глыбока нашу прыгажосьць. Калі жывеш з думкаю, што табе Бог пашле на сьняданак, ты ўжо не клапоцісься пра геамэтрычную фігуру, не ўпісаную ў рэчаіснасьць. І душа твая галодная тут, разам зь целам. І разам яны пакутуюць. Яна — што ня мае сілаў лётаць, яно — што ня можа адпусьціць душу.

Беганіна, неразьбярыха, крыкі, шум вакол нас, а ўнутры — адзінота, цішыня. Кожны вымушаны пакутаваць паасобку, хоць і пакуты сустракаюцца аднолькавыя. Ёсьць невылечныя пакуты — тыя, ад якіх немагчыма пазбавіцца ні часам, ні словам, ні справай, тыя, што ня кідаюцца наўцёкі пры нашых намаганьнях, а залежаць ад іншых асобаў, думкі якіх мы ня ў стане падпарадкоўваць уласным. Праўда, калі-нікалі здараецца цуд, і людзі пачынаюць думаць у тым накірунку, як і вы. Што ж, вам можна пазайздросьціць!

***

Раніца і вечар — час, прыдатны для асэнсаваньня чалавекам свайго жыцьця і сьвету, у якім ён жыве. Тады, калі сонца ўстае і кідае на сьнег аранжавы водбліск, ці тады, калі яно кладзецца, і неба часьцяком фіялетавае. І пад гэтым небам людзі запальваюць сьвечкі, бачныя (вясёлыя каляровыя вакенцы, гарадзкая сьвяточная ілюмінацыя) і нябачныя (сьвятло ў нашых душах). Чалавек размаўляе з сабой. У гэтай нямой размове ён пытае сябе і судзіцца, ганьбіць і віншуе... Чалавек сябе любіць і сябе ж ненавідзіць. Яму бывае соромна перад сабой. Нярэдка ён злуецца, што нечага ня выканаў, што лічыў патрэбным зрабіць. Як забаўныя елачныя цацкі варушацца на калядным дрэве, так і чалавек абвешаны грахамі і дабрадзейнасьцямі.

***

Стамілася і засынаю. Фотакарткі-успаміны пра сёньняшні дзень самі знаходзяць месца ў набытым альбоме і таксама засынаюць... пад маю калыханку.

***

Спачатку хочацца запоўніць жыцьцё новымі цікавымі рэчамі, а потым зьяўляецца жаданьне ад усяго пазбавіцца, выкінуць непатрэбнае, пачаць плысьці па чыстым, зноў заняць сябе новым і цікавым, клапаціцца пра яго, і жыць дзеля яго, а потым адкінуць назад і дыхаць іншым. Кругазварот.

***

Пераасэнсоўваць рэальнасьць, быццам у сьне. Змыць пад халоднай вадой адныя фарбы і прыдумаць новае спалучэньне, займець крылы і адтанчыць у вышыні. Чаму так цяжка чэрпаць у нашай рэчаіснасьці натхненьне?

Сяргей Конан

ПЕРШЫЯ КРОКІ

Ужо прайшло нямала часу, як я падняўся з кален. Чалавек, які стаіць на ўласных нагах, хоча ісьці, рухацца. Але для першага кроку трэба шмат сіл, бо лёгка ўпасьці і цяжка потым падняцца.

А я падаў, маё цела грукалася аб камяні, адчувала боль. І зноў сілы ў кулак. Трэба падняцца, зрабіць крок, другі, упасьці, устаць і імкнуцца зрабіць на адзін крок больш. Адзін, яшчэ адзін, так драбніцы складаліся ў шлях. Я пайшоў, было проста прыемна крочыць між усяго, бо столькі рознага і непаўторнага навокал. Адно зьмяняе другое, усьлед выплывае трэцяе. Прыгажосьць і жахлівая адзінота. Раней я не адчуваў яе так востра. Адзінота — гэта значыць, ты адзін. Адзіная нота ў тваёй музыцы — гэта ты. Раней я быў часткай агульнага. Я, як усе, стаяў на каленях, бачыў чужыя патыліцы. Я быў адзінкай мноства. Ноччу бачыў адзін з усімі сон. А зараз усё па-новаму. Думкі, сны.

Я спрабаваў размаўляць з тымі, што стаялі на каленях, але яны мяне ня слухалі і ня чулі. У вачах былі адны і тыя ж пытаньні. Навошта? Чаго ты вырабляесься? Што ты хочаш? Ці ж дрэнна стаяць на каленях?

Я імкнуўся дайсьці да іх. Я станавіўся на калені насупраць іх, твар да твару. Яны бянтэжыліся. Я паварочваўся да іх сьпінаю, але яны не разумелі мяне, а некаторыя заціскалі вушы рукамі і ў вачах стаялі лямант, праклёны, нянавісьць. Некаторыя пагаджаліся, але думка устаць з кален здавалася ім жахлівай.

І я пашоў прэч, туды, дзе нараджалася сонца, куды сплывалі аблокі. Калі б вы зрабілі гэтак жа, то адчулі б, як злосьць павольна праходзіць, у душы нараджаецца спакой. Павольная хада робіць такімі ж павольнымі думкі.

Раней усё круцілася вакол тых, хто стаіць на каленях. Цяпер я думаў і пра сябе, і пра свой лёс. Праўда, часам было цяжка і някавата, калі я ішоў ля каленастоячых, ці доўгі час нікога ня бачыў. У маіх грудзях ва ўвесь голас гаварыла адзінота.

Але аднойчы, калі я ішоў па рамонкавым полі, то ўбачыў, што нешта, не, нехта рухаецца ў мой бок. То была постаць чалавека, сэрца забілася ў маіх грудзёх. У другі раз я адчуў подых шчасьця, мяне пачало адрываць ад зямлі.

Я быў не адзін.

Руслан Равяка

КАЛІ МЯНЕ ПАБУДЗЯЦЬ...

Надышла часіна, і я ўзьняўся.

Сон быў млосны ды крыху жахлівы. Я выйшаў з хаты і прайшоўся па надворку, каб ачомацца.

Зорнае неба ўпрыгожвалі зьнічкі, што раз-пораз несьліся да Зямлі. Да мяне падыйшоў нейкі чалавек. Ха! У прыцемках я пазнаў свайго гетмана.

— Даўгавата Вы спачывалі, княжа! — вымавіў ён.

— Хіба ж гэта адпачынак. Так, перадых невялікі. Пасьля апошніх справаў трэба паднабрацца моцы, — я пачухаў патыліцу і пасьміхнуўся. — Пакуль я спаў, нешта адбылося?

— Напачатку быццам бы не, але гэта толькі здавалася нам, вораг прадпрымаў шматлікія спробы перахопу перамогі. І на жаль, яму ў большасьці пашчасьціла. Усе нашыя намаганьні былі марныя. Падначаленыя амаль што вынішчаныя ці перабеглі на бок ворага...

— І вы не пабудзілі мяне! — папраўдзе кажучы, я абурыўся.

— Не жадалі перашкаджаць... Думалі сваімі сіламі...

— Добра, зьбірай рэшткі майго войска, загадай скарбніку адчыніць скарбонку. Каштоўнасьцяў не шкадаваць. Выкарыстоўваць усё, што яшчэ магчыма.

Гетман пабег выконваць мой загад. Я ж абышоў касьцёл, у якім спачываў. Будыніна была вельмі ж старая. Бачна было, што яна вынішчаецца часам, як і ўсё ў гэтым сьвеце.

Нечакана я зачапіў рукою нейкага манаха, што маліўся, уклеcouчыўшы каля капліцы, што месьцілася ззаду касьцёла.

У таго павылазілі вочы:

— Князь, князь узьняўся... Адыдзі, нячысьцік... Вяртайся ў сваю труну, мярцьвяк... Божа, дапамажы мне... Гэта ж мумія...

Ён узьняў крыжык, што боўтаўся разам з ружанцам на яго папрузе.

— Не для таго мяне клалі ў труну ў сутарэньнях касьцёла, каб я вяртаўся сюды зноўку! Ці можа дарма маё войска, пакуль я адпачываў, бараніла гэтую сьвятыню?

Надышла пара новай, вялізнай бойкі. І я да яе падрыхтаваны.

Мае хлопцы з гэтай часіны вызваленыя ад патрэбы зьберагаць мой спакой. Цяперака яны могуць увайсьці ў сьвядомасьць чалавецтва «гэтага часу» і накіроўваць іх туды, куды гэны народ сам ніколі б ня трапіў.

Сяргей Абламейка

ВЕЛЬМІ КАРОТКАЕ

***

Людзі ня хочуць ведаць праўду пра сябе. Чым хутчэй вы гэта зразумееце, тым большая колькасьць людзей будзе вас любіць, і тым большы посьпех вас чакае.

СЬВЕТАПОГЛЯДНАЕ

Гэтым сьветам кіруе ня той, хто павінен быў бы. І ня тое, што павінна было б. Таму неразумна нечага дамагацца. Трэба проста жыць.

Усё, што мы можам — гэта заставацца такімі, якімі мы ёсьць.

Менавіта гэтага найбольш ня хоча тое, што тут кіруе.

ПАЛІГЛЁТЫ

За апошнюю тысячу гадоў мы размаўлялі і пісалі па-беларуску, па-царкоўнаславянску, на лаціне, па-польску, па-французку і па-расейску. І кожны раз гэтымі мовамі авалодвала значная колькасьць беларусаў. Выглядае, што мы маем прыродную здольнасьць да моваў. Ня страшна і ў будучыню глядзець. Беларусы — нацыя-паліглёт.

АДНОСНАЕ

Уначы чалавек ідзе па вуліцы й думае: «Як позна, ніводнага чалавека вакол...» А нехта, не запальваючы сьвятла, глядзіць на яго з вакна і дзівіцца: «Так позна, а яшчэ нехта ідзе па вуліцы...»

НАШАЕ

Беларусы бадай што менш, чым іншыя народы, патрапляюць спалучыць эгаізм з пачуцьцём нацыянальнай роднасьці і салідарнасьці. Гэта вылазіць зь іх, калі яны апынаюцца за мяжой. За мяжой беларусы спаборнічаюць.

ПРАЎДАПАДОБНАЕ

Некалі, гадоў 10 таму, непрыяцелі беларушчыны пісалі, што дамагацца і бараніць правоў нацыі пачынаюць слабыя. Яны, маўляў, папросту хаваюцца за шырокія нацыянальныя плечы ад жыцьцёвых цяжкасьцяў і ўласнае няздатнасьці іх пераадолець. І выглядае, непрыяцелі мелі рацыю. Бо сапраўды, нешта замала сярод беларускіх нацыяналістаў моцных людзей.

КАЎКАЗЕЦ

18-19 стагодзьдзі — джыгіт. Мэты: добрая горская вопратка (футравая шапка, бурка), добрая зброя, добры конь і прыгожая жонка. Дамы мураваныя з дахоўкай.

20 стагодзьдзе — джыгіт. Мэты: добрая вопратка (норкавая шапка, дублёнка), «Мэрсэдэс» і прыгожая жонка. Дамы мураваныя з дахоўкай.

БЕЛАРУС

18-19 стагодзьдзі — чалавек зямлі. Мэты: кавалак зямлі, ураджай бульбы, добра пад'есьці. Адзеньне: як атрымаецца. Хаты драўляныя.

20 стагодзьдзе — чалавек зямлі (і ў вёсцы, і ў горадзе). Мэты: кавалак зямлі, ураджай бульбы, добра пад'есьці. Адзеньне: як атрымаецца. Хаты (дачы) — драўляныя.

І называе тых, хто жыве на Каўказе — «чуркамі».

ДОМ

Гарадзкія блёкі-шматпавярховікі называюць дамамі. Гэта — няпраўда. У блёку ў некалькіх суседніх кватэрах адначасова могуць быць і гора, і сьлёзы, і радасьць, і шчасьце. У Доме гэтак не бывае. Блёк — гэта ня Дом.

ПАНЕНКА

Пры сустрэчы вочы паненкі бліскаюць так, што ты разумееш: зрабі крок у адказ, і яна — твая. Пры гэтым яна робіць тое самае яшчэ двум-тром тваім калегам. І ты шкадуеш, што не давялося ўбачыць, як бліснуць тыя вочы, калі яна спаткае вас усіх разам.

ПАРАТУНАК

Неяк адзін расеец з-пад Цьверы распавёў мне, што сьвіней у іх ваколіцах пачалі трымаць толькі ў 50-я гады. Кажа, заб'юць парсюка, разрэжуць напалам і вешаюць — ня ведалі бо, як апрацаваць. Ня мелі досьведу.

Вось я і думаю, што скрыпкі, цымбалы і сьвіньні ратуюць нас. Каб не яны — зусім бы расейцамі былі.

ЭМІГРАНЦКАЕ

Трагедыя нашых палітычных эмігрантаў у тым, што яны спадзяюцца праз год-два-тры вярнуцца. Але атрымоўваецца, што ад'ежджаюць назаўсёды. Бо на Радзіме нічога не мяняецца...

ЗАСПАКАЕНЬНЕ

Беларусь застанецца. І гэта хаця б таму, што нават абыякавыя да беларушчыны прайдзісьветы, эгаісты і стукачы намагаюцца рабіць у ёй кар'еру.

35-ГАДОВАЕ

Дажыўшы да 35 гадоў, я нарэшце зразумеў, што фатальнага ў нашым жыцьці значна менш, чым мы думаем. Часта мы бываем у сытуацыі, калі абставіны штурхаюць нас на пэўны выбар. Але падумаўшы, вы заўсёды зразумееце, што раней тыя абставіны справакавалі самі.

Павал Севярынец

РЫХТУЙСЯ

Ахвярую Вячаславу Сіўчыку

Прачнуўся ад чуйнага шчоўку: перасякліся стрэлкі. І праз імгненьне — запібікаў будзік, захліставочы пульсамі сэрца. Прызыўна, трывожна, нясьцерпна. Уставаць.

Ён няўцям вылузваўся з чэрава сну, выблытваў ногі зь цёплай пучыны коўдры. Успамінаеш штоўдых. З кожным глухім крывяным штуршком пампуе парожні чэрап. Так, час ёсьць. Уф. На працу. Паесьці. Ага, сьцяміў. Учора... Сьненьні яшчэ дагнівалі ў кутках вачэй. Павыцкоўваў пальцам.

Стоп. Страшнае.

Сьнілася змрочна... Пагружаецца і ўсплывае. Я забіваю таго хлопца. У пад'езьдзе, пры дзьвярох. Цьмяна і цяжка. Божа, як жа я высіляўся грохнуць яго насьмерць...

Прабач. Гэта было днямі. Малады, з Нацыянальнага Вызваленьня. Прабач, як жа яго... Родны ты мой. Яго забілі. Так, заўчора перадавалі па радыё. Вяртаўся дамоў, праламілі чэрап, велізарная гематома пад вокам. Божа, што ж гэта такое. Іх будуць забіваць. Падонкі. Чаму ж так змрочна правальваецца скрозьсоньня, так страшна...

Ну, ціха, ціха. Іх забіваюць, а табе яшчэ жыць. Табе яшчэ ў прыбіральню й ванную, потым пасьнедаць, сабрацца і стрэлцы тваёй на ўсё пра ўсё адкроіць яшчэ паўгадзінкі.

Шторух, з шумным спускам бачка, з рокатам у гарлавіне чарупіны, з рыпам дзьверцы лядоўні, ён заводзіў, раскручваў той наладжаны ранішні рытм, зь якім учора ператвараецца ў сёньня. Сьняданак: як заўжды, яйкі, кансэрва... Не, кансэрвіна будзе на вечар. Хлеб падчарсьцьвеў. Госпадзе, яшчэ ж паўгады таму быў хлеб-хлебам — каравай табе, бохан, папека круглага, нарачанскі... Пахкія, з кменам... Прапаў. Прадаецца толькі такі. Квадратовы, шэры й сухі, як калісь за саўком.

З падваконьня выбраў газэтную лусту, сеў есьці. Што тут... крухмалістых клубняў... Прэзыдэнт, ізноў прэзыдэнт, і вось яшчэ адно пэ зь вялікае літары... Прыступілі да распрацоўкі... Так і прапячатана, чорным па белым, усё чорным па белым. Усё чорным па белым, адно каламутна-шэрыя фотаздымкі. Ён перажоўваў прэсны шыфт, заядаў хлебнай сухамяццю з пустой яечняй, і з кожным каўтком жыцьцё ўсё цяплей напаўнялася зьместам. Сытна і нудна, няма дзе са смакам прыцмокнуць. Кормаўборачная краіна. Калёнка замежжа, ізноў тэрарысты, як жа бязь іх. Не, у нас такія насякомыя ня водзяцца, тут жа такая глыбокая восень.

Холадна на вуліцы. Трэба, канечне, швэдар, батарэі яшчэ не ўключылі, то ж і на працы, бадай, прахалодна... А сядзець да пяці, усё ж ніякавата, а пасьля дамоў, цяплей, пад настольную лямпу, перабраць штосьці з часопісаў, сагрэцца за чаем зь печывам і нанач плітку паставіць, вось будзе горача, вось яно! І так хораша перад сном дачытаць, выключыць сьвятло, а сьпіраль яшчэ будзе жарка ірдзець у цемры, ціха патрэскваць і гаснуць паволі, і засынаць...

Так — час, чаёк, хутчэй. Сьпехам дасёрбаў тое, што заставалася — і на выхад.

На лесьвічным пралёце разышліся дзьве суседкі; адна абмінула яго, падымаючыся, трымаючыся за парэнчы, другая падымалася на свой паверх і зьнізу кінула ў завяршэньне размовы:

— Перажывем...

Гэта прайшло празь яго, праняло зыбкім дрыжэньнем парэнчаў, і стала так зябка, і так неспакойна ад таго нячутага, што трэба было перажыць...

Вось і шэраг паштовых шчытоў. У дзірачкі спэцназаўскіх скрыняў прасьвячаюць улёткі. Адна на падлозе, зь пячаткай бота, хтось ужо прачытаў. Колькі дзён таму закідалі такое: «Рыхтуйся да вайны». Без заўвагаў. І ў двары, на гаражах, фарбай раскроілі тое ж. Ярка-чырвоным. Што ж цяпер...

«Нас забіваюць. Усё! Сёньня».

Эх, хлопцы... Толькі слоўцы на беленькім тонкім лісточку. Усё, што ў нас з вамі засталося. І так шчымліва, з такой нясьцерпнай восеньскай сьвежасьцю пахне вогнішчам на двары, такім спаленым жалем пранізвае звонкая раніца, што чамусьці ўспомніш школу й хочацца плакаць.

Зморшчыўся сам, скамячыў паперку. Трэба выкінуць. Туды, пад іржавы памыйны бак ля гаража, вунь туды, дзе сцуць падлеткі, дзе чырвона, невыносна чырвона фаніць: PARA BELLUM. Не заціраюць жа, дурні — думаюць, нейкі мэтал ці рок. Так, нейкі рок. Выкінуў у сьмецьце, у попел з россыпам недапалкаў, мядзяных, быццам страляныя гільзы.

Хлопчыкі-хлопчыкі, так не бывае. Сёньня на вуліцы зноў мерны ход мінакоў, той самы, што ўчора і пазаўчора, вечны. Кучы людзей на прыпынку, якія чакаюць ня волі, а тралейбуса нумар сорак чатыры, і спадзяюцца пасьпець, дай бог, без кантралёра, на сваю важную працу, дзе, мабыць, удасца перахапіць да аўторка й па дарозе дахаты нарэшце купіць маргарын. На выхадныя, пад сьвята вывесяць на бальконах сьцягі бялізны і гулка закалоцяць па дварох выбіваныя дываны. А ўвечары, у агністае цемры, будуць мігцець агменьчыкі вокнаў, уладкоўвацца, тлець зь нейкім таемным значэньнем, з парадкам, нікому ня ведамым, і цьмяныя водсьветы тэлевізараў у доме насупраць будуць суладна падтакваць таму гарадзкому сямейнаму шчасьцю, якое вось гэтак мігцела ў савецкіх часоў кінафільмах. І табе будзе так добра дома аднаму, ты будзеш трошачкі стомлены й мудры, і гэта правільна.

Дрэва на рагу, прыхіліўшыся да сьцяны, абыякава й шумна пражоўвала нешта ў лістоце і сплёўвала семачкі проста яму пад ногі.

Выйшаў. Праспэкт зьвяргаўся ў дымную пройму наперадзе. Дружны маторны шум задрыжэў скрозь яго, і ён узбуджана ўспомніў той пераможны рокат калёнаў.

Крылы сьцягоў трапечуцца, лопаюць за сьпінай. Якая эфірная лёгкасьць, апоена не адчуваеш сябе. Якая сьвежасьць, сьвятая сьцягоў сьвежаніна... Свабода пабраджвае ў грудзях, пампуе да горла: «Жыве!!!» Тады жыло... Ён ня бачыць людзкога краю, увесь час захоплена азіраецца, падскоквае паглядзець, колькі народу, а там, і далей, незьлічона бурліць чалавечына — страшна, тысячагалова бруіць патокамі ходнікаў,

Алесь Аркуш

ЛЮБОЎ ДА КАГО?

1.

— Што ты хочаш гэтым сказаць? — перапытаў я свайго суразмоўцу.

Ён уважліва паглядзеў на мяне, так, што я крыху зьніякавеў, моўчкі павярнуўся і пашыбаваў у бок пляца Свабоды.

Маё пытаньне павісла ў паветры. Наўрад ці я чакаў грунтоўнага адказу. Усё было зразумела і так.

Я хвіліну назіраў за сьпінаю Кроквы. Яна няўхільна аддалялася — з кожным крокам, з кожным рухам. На душы не было крыўды. Ці меў я права рызыкаваць ягоным лёсам? Гэта быў мой плян, і тое, што я расказаў яму аб ім, не абавязвала хлопца далучацца да справы. Прынамсі, аб сваім пляне я паведаміў ужо тром знаёмым. Усе трое зрабілі гэтаксама. Калі цьвяроза ўзважыць маё становішча, дык я мусіў катэгарычна адмовіцца ад далейшага паглыбленьня ў рызыкоўную дзею. Па-першае, чатыры чалавекі палічылі яе за глупства. Па-другое, чатыры чалавекі ведалі пра мае пляны. Гэта гарантавала няўдачу. Мая цьвердалобая зацятасьць зараз была недарэчнай — справа тычылася ня толькі мяне; шмат каго я мог уцягнуць у ейны кругабег безь якой-кольвечы згоды выпадковых хаўрусьнікаў.

Я пайшоў усьлед Крокву па вуліцы Карла Маркса, аднак, адчуўшы ніякаватасьць, нібыта намагаюся дагнаць хлопца, зьвярнуў на Сьвярдлова, выйшаў на Камуністычную і рушыў у накірунку Вала Івана Жахлівага.

Мае думкі блыталіся і здавалася, што крыўда памалу ўсё ж запаўзала ўсярэдзіну. Сёньня, вось зараз, я павінен вызначыць — пачынаць свой плян, адкласьці да спрыяльных абставінаў ці ўвогуле ад яго адмовіцца.

Напэўна, я ня здолеў слушна патлумачыць. Пяць гадоў развагаў і філязафічных пошукаў не маглі нарадзіць мёртвы плод. Калі ўзыходзіць поўня, калі сьцішваецца навакольле — ты зьмятаеш сьнег з зэдліка на гаўбцы, з паўгадзіны сядзіш у адной кашулі, паліш і разглядаеш сьняжынкі на рукаве. Гэта я называў — абстрагавацца ад будзённасьці. У такія хвіліны цябе ня можа наведаць глупства. Або... Толькі ў такія хвіліны яно й наведвае чалавека. Што можа быць больш бязглуздым за касьмічную мудрасьць?! І ўсе твае развагі пра эфэкт нетрадыцыйнага ўчынку вартыя каналізацыйных сьцёкаў.

Па драўляных сходах я ўзыйшоў на вяршыню Вала і ўсеўся на апошняй прыступцы. Навакольле цьвеліў гмах былога Дома афіцэраў. Дамкі, што атачалі яго абапал, здавалася, пачалі трымцець пад абцасам псэўдарымскіх калёнаў. Я дастаў з кішэні капэрту, выняў ліст, разгарнуў і пачаў чытаць. Зьмест ліста мне быў вядомы ўжо тры гады. Ніводная літара не зьмяніла свайго месца. Зьмест іншы, таемны, схаваны, упарта не даваўся. Я тры разы прабег вачыма па тэксьце. Кожнае наступнае прачытваньне рабілася ўсё менш пранікнёным, вочы мэханічна выхоплівалі літары, складалі іх у словы, якія гублялі сэнс. Зь пісьмовага аркуша я зрабіў дзіцячы летачок, устаў і пусьціў яго ў бок грувасткага гмаху... Усё... Нават памахаў рукою. Папяровы лятун зрабіў вялікі круг над схілам Вала і вярнуўся дакладна ў мае рукі.

2.

Ведаць толькі мэту. Але на што спадзявацца? Чым кіравацца? Як вытрываць? Увайсьці ў сьмярдзючы цёмны пад'езд, дзе пабілі і пакралі ўсе лямпачкі і ўздымацца па сходах, бо ліфт не працуе (а можа проста няма элекрычнасьці), уздымацца на дзявяты паверх, трымаючыся абедзьвюма рукамі за парэнчы, асьцярожна намацваючы нагой кожную прыступку, патрапляючы ў ваніты, наступаючы на дзябёлыя целы мёртвых катоў, чапляючыся за нейкія дошкі і мэталёвыя пруты. Крок. Яшчэ крок. І так кожны дзень. Кожны месяц. Кожны год.

Спачатку прайсьці выпрабаваньне на спрыт і кемлівасьць. І толькі затым — на адданасьць і любоў. Любоў у сэрцы не гарантуе наяўнасьць спрыту і кемлівасьці. А спрыт і кемлівасьць ня ёсьць перадумовай нараджэньня любові. О, колькі спрытных і кемлівых наўкола! Ды даўно ніхто не наладжвае выпрабаваньняў на адданасьць і любоў. Адданасьць чаму? Каму? Любоў да каго? Чаго? Езуіт скажа — да пана Езуса Хрыста. Вось ён, мніх у чорным балахоне, ідзе па сутарэньнях у бок муроў Сьвятога Стэфана. Трапяткое полымя паходні адкідвае на каменныя сьцены віхлясты цень. Рэха далёка нясе гукі крокаў па вадзе. Прайшоў і ціха. Нібыта нікога не было. Прымроілася.

Любоў ня крыжык на шыі. Дакрануўся — вось ён, з пакутнай выяваю. І сэрца кальнула згадка... Любоў недзе глыбей.

На самым версе ўзьняцца яшчэ вышэй — на дах. Наваліцца кожным мускулам, уперціся сьпінаю ў халодную бляху люка, торгнуцца з усяе сілы; толькі ціха, ня трэба шуму, каб ніхто ня бачыў і ня ведаў. Люк неахвоча паддаецца, глуха рыпіць, быццам скрозь зубы намаўляе за неспакой. Прайсьці колькі крокаў і сесьці на сьнег. Тут іншае вымярэньне, арыентацыя, формы, маштабы. А зьмест?.. Любоў да каго? Адданасьць чаму?

3.

Чаму менавіта я паклікаў-справакаваўштурхнуў? Ці можна мяне абвінавачваць? Меў жа я матывацыю да свайго ўчынку. Нічога проста так не адбываецца. Каб вырасла жыта, трэба яго пасеяць. Пачынаецца дождж — і ты шукаеш месца, дзе схавацца. Сьлепіць сонца — інстынктыўна мружыш вочы. Калі ты ГЭТА зрабіў, значыць — трэба было пасеяць жыта, або ішоў дождж, або сьляпіла сонца, — нешта адбывалася, што спрыяла твайму памкненьню. Летачок, які робіць кругі над галавой — першы, другі, трэці... І ўсё адно вяртаецца ў рукі. Як птушка, якая жыцьцё пражыла ў няволі. Глядзі, — яна ізноў у клетцы. Прыляцела сама, бестурботна чырыкае і чакае хлебных крошак з рук гаспадара. Ці гэткае параўнаньне недарэчнае? Ты кажаш, што ўсё значна прасьцей — ёсьць лёс і ад яго не ўцячы. Кінь, дружа, гэтую старую песьню. Сесьці і чакаць свайго лёсу?! Але той, хто сядзіць, патрапляе ў клетку. Абавязкова знойдзецца дока, які верыць толькі ў свае жаданьні. Ён прыйдзе і насыпе побач з табой трошкі корму. Або толькі паабяцае яго. А ты сьпявай песьню, можа, у цябе атрымаецца лепш, чым у другіх, — тады атрымаеш больш і смачней.

Кроква сыходзіць. Ягоная сьпіна драбнее-драбнее-драбнее — і ператвараецца ў кропку. Канец сказу. Некалькі кропак — шматкроп'е. І таму можаш дадумваць астатняе сам. Імправізаваць... Націскаць на кнопкі паслухмянага кампутару; перабіраць віртуальныя варыянты; апранаць іх у сапраўдшчыну, як ляльку ў мініятурныя сукенкі. Бачыш, колькі ёсьць магчымасьцяў. Плойма, сьціжма, незьлічоная колькасьць. Сьпявай, сьпявай, — вясельле, якое зацягнулася, ці хаўтуры, ці сяброўская бяседа... «А любовь, как сон, стороной прошла!»

4.

Але яшчэ ёсьць тое, што баісься згубіць. Ты толькі ўяві, што й ЯГО ня стане. У адзін прыгожы, сонечны дзень ты прачнуўся — а ЯГО няма. Дзе падзелася! Ідзі спытай — у сустрэчнага мінака, у начальніка ЖЭКа, ва ўчастковага. Дзе падзелася? Дзе?!! І што ты будзеш рабіць далей? Што ўвогуле можна зрабіць?

Гэта была любоў. Яе забралі. Апошняе, што ты меў. Любоў да каго? Чаго? Да неба? Да сонца? Да хмараў? Да дажджу? Да аўто? Да маці? Да працы? Да вечаровага шпацыру? Да бацькі? Да кнігі? Да сына? Да футбольнай каманды? Да піва? Да дачкі? Да роднага места? Да жанчыны? Да стравы? Да сэксу? Да напою? Да рыбалкі? Да цыгарэтаў? Да коткі? Да «Плэйбоя»? Да Пугачовай? Да «Угадай мелодию»? Да ўласных шасьці сотак? Да мроіваў? Да вандровак? Да першага сьнегу? Да неўміручасьці? Да сваёй значнасьці? Да веснавых птушыных сьпеваў?..

І што ты будзеш рабіць? Палюбіш нешта іншае?

пеніцца на перакатах бардзюраў і валам рушыць кудысьці наперад — куды трасэрам цэліць дарога, куды мкнуць лініі паверхаў і дахаў, дзе сьцінаюцца зыкі струннага дроту. На грэбнях тралейбусаў, затопленых рухам, кучамі тоўпяцца рэпарцёры — і блішчаць па-над галовамі кадры заўтрашніх газэтаў, успыхвае на імгненьне гісторыя. І шырокая вуліца рыне такім роспачна-грозным ровам, такой вырашальнаю сілай, што рэхам згасаюць будынкі, асядаюць фасады і ўдалечыні, у гарачым марыве, у лунаньні сьцягоў зыбаецца й дрыжыць уся велізарная неруш гораду.

Потым усе разыходзіліся, пусьцела ў душы, і ты сам сыходзіў кудысьці, і так доўга не хацелася вяртацца дамоў.

А потым мітынгі разганялі. Ты, помніш, таіўся ў натоўпе пад змрочнаю аркай, і струменіла вуліца праз прывідную пару дыханьня, верашчалі сьвісткі й адчайна рэзаў паўсюль, востра ўспорваў, да віску, да крыві, там і сям, бязьлітасны бляск паліцэйскага снадзіва. А як жа табе хацелася, каб паліцыю білі, мясілі, каб далі пад дых, аж дыханьне заціскваў у кулаках. Вуліца ледзянела нялюдзкімі крыкамі, а ў вашае нішы, помніш, шыўся такі чалавечы, цёпленькі шапаточак, такі чуйны, што не пачуеш словаў, і гэтак гідзенька было, хоць вешайся. Тыя, за кім ганяўся амун, нават ня кінуліся сюды: тут стаялі.

Пасьля начныя росьпісы сьценаў, якія ж малойцы гэтыя падлеткі. Ашалелы сьцяг над унівэрсамам і разарваны той, з палоскай колеру хакі. Падпольшчыцкія ўлёткі прапячатвалі так кашчава й так ненавісначорна: «Нацыянальнае Вызваленьне». Хлопцы ведалі, на што йдуць. Іх лавілі й саджалі, камянелі ў тваіх зьвілінах іхныя камэры й калідоры. І калі моцна хацелася есьці, ты ўспамінаў пра іхныя галадоўкі, і зь недаедзеным у буфэце разжоўваў сам сабе, якая ўсё такі смачная гэтая штука — свабода. Хтосьці быў супраць, хтось заклікаў грамадзкасьць, але ўсё ішло нармалёва, учора, сёньня і заўтра, усё было ў парадку і ўсе былі чымсьці занятыя.

Потым газэты. Іх сьціскалі, «мы спрабавалі заўжды аб'ектыўна», з пакутлівасьцю папяровага трэску, «але ўладам ня ўдасца», а як жа, «выражае пратэст», да поўнага пшыку.

Вось і прыйшлі. Прыступкамі ён пагружаўся ў мэтро. Тхнула каменна ў змрочным сырым пераходзе. Ты, чалавеча, нямееш —пры іх страшэнна дзяржаўная сіла. Цяжкае шкло забойна шугнула ля скроні. Так, гэта дзяржава, тупая грувасткая сталь агароджаў. Уставіў жэтончык і ў цеснае пройме на міг падцяўся, крадком баючыся, што клацне, зашчэміць... Халодным жалезьзем у гэтай краіне сашчэплена ўсё аграмадністае варушэньне. Няўмольна гуў эскалятар, ляскат зубцоў набліжаючы: страшна патрапіць, зацісьне. У гулкім шуме падземнага сховішча глушыць, стушоўвае шарканьнем галасы ў неразборлівае кішэньне. Ніякаваты пах, дух агульнага карыстаньня. Нарэшце, гахнулі бразгатам дзьверы вагона — зьнішчальна, намёртва. Цемра за вокнамі мкне, набірае разгон, цягне, штурхае цябе назад. Ты адчуваеш сталёвы закон халадку, што пільнуе зябкае наша цяпло — вунь як на поручні гэтулькі рук камякамі, пяцернямі, моцна ўхапіўшыся, да мэталёвай трубы падлучаныя рычагамі.

Ён, заварожаны, у манатонным вагонавым гудзе, усё глядзеў перад сабой у рэклямовыя глыбі плякату. «Концерн РБ — российские банки», аж льсьніцца ад глянцу, як сьніцца. Ды што там дзяржава, а па-над усім — легендарная ўлада Імпэрыі. Гэта яна, залаціста-дубовая мэбля са смольным адлівам, ляк крамлёвых паркетаў, галерэі алейных партрэтаў. Слава калёнаў і трубаў пераліваецца тлуста, васкова і зачароўвае вока. Як глыбока, бяздонна яе невымерная веліч праглядвае навакол прыцягальнымі гладкімі праблескамі гіпнатычнае млосьці...

Плошча Незалежная.

Бухнулі дзьверы, людзі вывальвалі ў гулкія аграмады мармуровае паліроўкі, у зашарканыя плоскасьці лоску — і ў велізарных сьценах тускна люстравалася, пераломвалася на плітах шэрае калыванье натоўпу.

Не, толькі сам сабе ты незалежны. Толькі ўдома, калі зачыніўся, ты ціхі й пэўны, і ўсё жыцьцё — у табе адзіным, і гэта ёсьць ісьціна. Усе астатнія — як сабе хочуць, самы час паглядзець на гадзіньнік, канечне, ужо час, што ж, ня буду вам перашкаджаць. Так, ты вельмі заняты. Ты займаесься тым, каб перахаваць усё тое добрае і сьвятое, што толькі ёсьць на гэтай зямлі. Зьберагчы, пражыць, перабыць, каб потым, калі праміне — выйсьці, прымружыўшы вочы да яркага сьвятла, зь вінавата шчасьлівай усьмешкай, і вынесьці...

Выбраўся. Удыхнуў неахопнае плошчы. Дом Кіраўніцтва, калідорная кубатура, стромы гмах Пэду і перафарбаваны ў бледна-ружовы Касьцёл — уся пірамідавая грандыёза замерла па-над чарадой чалавечкаў, і штокрок падымалася ўсё вышэй і грамадней, грэбліва й безуважна пазіраючы ў смутныя панарамы.

Ну што, зараз ты колькі гадзінаў будзеш сядзець за сталом, навідавоку ў астатніх, зробіш выгляд, што гэта насамрэч вельмі важна — зарабіць на хлеб ды аплату кватэры, а потым усяго добрага, і нарэшце дадому. Цяжэнныя дзьверы бахнулі пячаткай у патыліцу. Праца.

Нешта беспакойна было яму сёньня. Можа быць, з-за пустога й непастаяннага надвор'я з парывамі ветру, а можа таму, што холадна й трошкі скразіла ў памяшканьні, так што ўвесь час хацелася ці то ўключыць сьвятло, ці пайсьці пагрэцца. Урэшце, вырашыў ён, хутчэй за ўсё гэта тэмпэратура, такое, ведаеш, бывае перад хваробай, непрыемнае прадчуваньне. Трэба будзе вось што, падумаў ён, апрануўшыся й рупліва зашпіліўшы ўсе гузікі, асабліва верхні, дастаць лімону ды з чаем гарачанькім.

Ён распахнуўся на вуліцу. Горад скрозь працінаў тонкі трывожны дождж. Цёмныя будыніны правальваліся ў прадоньні плошчы каламутнымі адлюстраваньнямі. Па-над прывіднай глыбінёю, квэцаючы па плеўцы вады, ён перайшоў да прыпынку. Дзе ж патрулі, куды прапалі, аніводнага. Няпэўныя дрыжыкі дажджу ўсё мацней знабілі спалоханым прадчуваньнем. Сярод ледзь сагрэтае купкі ўспучаных парасонаў, ашчаперыўшы сьпіцы, моўчкі чакалі — і, здалося яму, насьцярожана пераглядваліся.

Кахнула нешта далёка ў горадзе... І згасла, пасьпешліва стушанае дробненькім шапаценьнем. Ён дрогка пацепнуў плячыма й прыслухаўся. У нецярплівым пляскаце кропляў цікаў-цокаў таропкі, узбуджаны час.

Калі блізка заляскаў тралейбус, золкі дожджык ужо ачышчаў далячыні — там, за гранёнай смугою гораду, падземна варушылася штосьці ледзь чутнае, але пагрознае, несумненна пагрознае.

Нешта творыцца ў горадзе.

Ён забраўся, цясьней прыладзіўся да вакна, усім дрыжучым целам прыняўшы стоены рокат рухавіка. Разгойдваны корпус з натужным ровам рынуў наперад, перамкнуў скрыжаваньне дроту й пераваліў у гарлавіну праспэкта.

Стоп-стоп, а ну-ка, зрок адразу прасеў ў нішу паштамту: што гэта... закаркавана гурмой вайскоўцаў, іх падпірае, тлуміцца тупа натоўп, прапіхваючы галовы...

Тэлефон тэлеграф блякаваны кропка працяжнік думкі пульсуюць што гэта робіцца, Госпадзе!

Ляскнулі дзьвярныя затворы. Па... пайсьці паглядзець?.. Праходні, прамоклыя, моўчкі пёрлі ў салён, аглядваліся, праціскаючыся да парэнчаў. Ну, хто-небудзь скажа, хаця б паўслова, хаця б напаўголаса... Але ў шоргаце іхных падэшваў варушылася толькі сьцішанае шушуканьне. Тралейбус страсянуўся да дна й

Працяг на старонцы 20.

Андрэй Верабей

ЛІРЫКА ЧЫРВОНАГА

Апагей папулярнасьці «беларускай савецкай літаратуры» супадае з кульмінацыяй расейскага камунізму і Другой сусьветнай вайной, якая стала найважнейшай падзеяй у найноўшай гісторыі краіны, што літаратура й зафіксавала.

Вайна, а перадусім партызанская, лясная вайна-вольніца, *партызанская рэвалюцыя*, сталіся сваеасаблівай мадэрнай казаччынай і момантам славы для тоеснасьці беларусаў, перавярнуўшы іх уяўленьні пра самых сябе. Наступныя пакаленьні ўзгадаваліся на літаратуры й гістарыяграфіі, засяроджаных на вайне. Зразумела, што на гэтай хвалі спэкуляваў і каляніяльны рэжым.

Фактычна, уся гісторыя Беларусі другой паловы XX ст. — гэта толькі непазьбежны працяг той *рэвалюцыі*. Якая яшчэ бадай ня скончылася. Дзень Перамогі застаецца галоўным сьвятам летняга цыклю, Беларусь — краінай-пераможцай з старым саюзьнікам і ворагам, сьвядомасьць кіруецца тымі самымі імпульсамі. Стаіць партызанская незалежнасьць.

вырывайце з жывых жылы

Тэма вайны, вайна з выкарыстаньнем машынаў — увогуле дрэнны матэрыял для паэзіі. Уся добрая паэзія ваенных часоў — гэта спроба гаварыць найбольш пра чалавека, а не пра забойствы. Імаралістычны і шавіністычны дрэйф тых «беларускіх савецкіх» паэтаў, якія распрацоўвалі тэму вайны, лягчэй было б зразумець, калі б яны ў гэтай эстэтыцы адлюстравалі (хай сабе ў шуфляду) праўду вайны зь яе бессэнсоўнымі ахвярамі, азьвярэньнем, здрадамі, безвыходнасьцю. Але йшлося хутчэй не аб праўдзе і абліччах вайны, а пра вызваленьне пэўных рысаў нацыянальнага характару, гульню на пэўных народных ілюзіях і мітах.

Нават у шаблённых патрыятычных вершах «беларуская савецкая літаратура» глыбока распрацоўвала дзьве тэмы, якія зьліваюцца ў адну: крыўда і адплата (пры існаваньні ў беларускай мове дзьвюх антанімічных параў: крыўда/праўда, крыўда/помста — пошук праўды ператвараецца ў пошук сытуацыі ўзаемаразьлікаў за ўсё; ідэя дараваньня, такая важная ў тоеснасьці ўсіх краёў, абнятых хрысьціянскай цывілізацыяй, у беларускіх тэрыторыях стала непрынцыповай) — тэму, што рытуальна згадвалася нават у такіх, здавалася б, адлеглых па мэце і простых, «дыдактычных» вершах, як Броўкава «Родная мова», што адкрываў падручнікі па беларускай мове і дзе сярод чатырох караценькіх абзацаў, якія мелі абхапіць усё-ўсё, адзін абвяшчае:

А вораг находзіў, бязлітасна білі,
Трываць не хацелі абразы і слёз,
І разам з Бярозаю катаў тапілі
Пціч,
Друць,
Сож.

І ў Бураўкіна ў аналягічным хрэстаматыйным вершы «Беларусі»:

Колькі вызнаў і вынес ты, краю мой мілы!
І цяпер успамін мае грудзі пячэ,
Дзе старыя акопы як пустыя магілы,
Дзе сябры пахаваць не паспелі яшчэ.
У нябыт і нядоля, і ворагі рынулі...

Кожнай нацыі хапіла за свой век пад бок і пад галаву, аднак, плачуць яны не аднолькава голасна і па розным.

«Беларускім партызанам» Янкі Купалы — адэкватны адказ на першабытнасьць нацызму пад формай патрыятызму.

Партызаны, партызаны, беларускія сыны,
За пакуты, за кайданы рэжце гітлерцаў паганых,
Каб не ўскрэслі век яны!
...

Выразайце людаедаў, вырывайце з жывых жылы,
Кроў за кроў, а смерць за смерць.

Няўменьне знайсьці дакладны й моцны вобраз хаваецца пад патэтыку, даведзеную да краю буйства. Рыфмы банальныя (лясы-каласы, сілы-магілы-жылы) або выпадковыя (пабеду-следу). Фармальных прычынаў, каб трапіць у падручнікі, няма, аднак і гэты верш вучаць у школе на памяць.

Чытаньне й завучваньне такіх вершаў падсьвядома прывучае, што *ўсё можа быць*, раз магчыма тое, пра што гаворыцца ў творах, што, будзьце гатовыя, дзеці, у жыцьці бываюць часы й сытуацыі, калі сьціраюцца ўсякія межы паміж чалавечым і зьвярыным: «клююць сэрца, смокчуць кроў», «сыты людзкім жырам», «выразаў ён старцам вочы, рэзаў матак і дзяцей». Мэтафорыка замку Дракулы нараджае ва ўяве хімэрных монстраў і фармуе «пачуцьцё ворага», а калі браць канкрэтны беларускі дыскурс — зьмяшчае «ворага» як элемэнт сьветабудовы на захад ад уласнай тэрыторыі.

стойка трымаўся юнак на дапросе

Для «беларускага савецкага» мастацтва было ўласьціва атаясамліваць ворагаў і немцаў (той факт, што Хатынь палілі ўкраінцы, а ня немцы, напрыклад, старанна замоўчваўся — рухнулі б схемы) і перабольшваць жорсткасьць варагоў. Так, у фільме «Гадзіньнік спыніўся апоўначы» ґаўляйтэр Беларусі Кубэ раздае дзецям-закладнікам шакалядкі, каб яны яму ручкі цалавалі, хоць ведае, што малых восьвось расстраляюць. Парушэньне гістарычнай праўды відавочнае, і відавочныя мэты: зрабіць забойства Кубэ актам Найвышэйшае кары, катарсысам. Калі простым узьвялічваньнем сваіх подзьвігаў не абыходзілася, калі пра вайну ствараліся суцэльны міт, дык супраць каго быў скіраваны гэты міт? У супэрхіце беллітры «Камсамольскі білет» («Стойка трымаўся юнак на дапросе») таксама: цалкам нерэальная сытуацыя, «вораг-жандар» ставіць юнака перад дылемай: або цішкам-нішкам зьнішчыць свой камсамольскі білет, або сьмерць. Зразумела, юнак без ваганьняў выбірае сьмерць. Далей ідзе забойства, ня простае, а такое, што ня кожнаму паскудзе з СС прыйшло б у галаву. Для роздуму пра суадносную вартасьць жыцьця і ідэалаў не застаецца месца.

Нянавісьць да немцаў-фашыстаў, паноў-жандароў etc. — няпрыязь да таго, што з захаду, фактычна, да ўсяго эўрапейскага (самыя паняткі «Эўропа» і «эўрапейскі» досыць цяжка акрэсьліць, але ўсё ж за імі стаіць пэўная відавочная юдэахрысьціянская, грэкарымская, рацыяналістычная і сэнсуальная традыцыя; нацызм быў паразай эўрапейскіх вартасьцяў і перамогай стэпавага, азіяцкага, ірацыянальнага, што перадгадваў яшчэ Герман Гесэ ў сваім эсэ пра «рускага чалавека»; «савецкая» ж культура акрэсьлівала панятак «рускі чалавек» празь ягонае супрацьстаяньне «эўрапейскаму барбарству» й нечалавечнасьці, што былі выплёскваліся на ўсходнеславянскія землі). Быць усходнім славянінам, беларусам, паводле гэтых схемаў, значыць, не паддавацца Захаду, змагацца зь ім, быць адрозным ад эўрапейцаў. Але ж аўтэнтычны зародак усходнеславянскіх тоеснасьцяў (беларускіх і ўкраінскіх у большай, расійскіх у меншай ступені) — эўрапейскія. Антыэўрапейскі прышчэп на эўрапейскай дзічцы дае хворую шчыпу, прырэчаную на пэрыядычнае падмярзаньне.

тупат быстрага каня

Цікава, што й Панчанка, які малюе сьвет — беларускі трылер — у воку снайпэра, і Глебка —

Ноч. Халодная зямлянка.

РЫХТУЙСЯ

Працяг са старонкі 19.

рвануў далей па праспэкце.

Зыбаліся, сьцякаючы прэч у размытым асфальтавым бляску, сьцены будынкаў, ледзь пасьпявалі здрыгнуць па лужах зьніклыя постаці. У вітрынах, напоўненых бледным цяплом, збоўтвалася, расплывалася халоднай каламуцьцю нячыстае вулічнае. Вось ён, змрочны прахон — са збуцьвелага камуфляжу дрэваў, скрозь трапяткое ашмоцьце лісьця зірнуў незьмігутны праліск чыгуннага чэрапу... І заварожана, пільным вокам прасачыў за тваім вакном.

Ох, і дало за дамамі, грухнула! — ён аж зайшоўся ўсім целам: за квартал разабрала раскатамі рэха! Божа, ды што ж гэта, хіба якая машына, ён перапуджана заазіраўся вакол. Праспэктавы рух быццам перасмыкнула, усё спатыкнулася, бязладана й мітусьліва памкнула туды й сюды, а людзі, што трэсьліся поплеч зь ім у шуме й дрыжы, — замерлі, ашклянелі вачыма, ня глянуць адно ў аднаго! І бягуць наўздагон тралейбусу, падрыгваючы гумовымі палкамі, два задыханыя паліцыянты — раз, сарваліся ўбок, прапалі.

Спыніўся, расхлопнуўся сьвет. Не, гэта пэўна, трэба выйсьці, трэба зараз жа паглядзець, што ж гэта такое, выйсьці, спытаць, вунь жа людзі, і куды-небудзь туды, ці гэта адтуль вунь пабег нехта... Холадна й невядома што. Машыны шарахаліся спалозанымі прошумамі. Прайшоў дождж ці яшчэ ідзе? Разгублены хлопец, абліплыя пасмы, чагось разглядаючыся па бакох, няўцямна страсваў паніклымі крыламі парасона... Ды так і застаўся.

Тралейбус помсьліва сьцяў дзьверы й надрыўна зароў прэч. Напруга мацнела, гула, напруга ўжо трэсла жыўцом усё ягонае начыньне, і — вось яны, вось! — успыхнула яшчэ колькі штук колеру хакі!

Галоўны пляц анямеў. Пустэльняй пліткі вымерла бязьлюдная плошча. А супраць яе, справа, клубілася дрэвахмара парку, і за змрочным ваганьнем ствалоў ледзь бляднеліся сьцены Палацу. Карабач шалёна, штосілы нёс пад гару, і толькі бясконцы дрот нацята трымцеў, і паўсюдна сьцяг верхні край акаёму.

... Зьнясілена квэцнуў наступны прыпынак. Здаецца, тут ціха. Хтосьці, выходзячы, абшаснуўся ў лужыну й мацерна ёкнуў. Шчасьліва саплівыя школьнікі, захліпаючыся, дзялілі нейкую драбязу. А дождж сапраўды перастаў. Усё навакольле ўраз нямком асьвяцілася, зазіхацела, і ён спачатку няўцям па-дзіцячы ўсьміхнуўся й прымружыўся, а потым зразумеў, што сонца, што вось людзі, разьмерана цокаюць ды шаркаюць сабе па ходніках, і машыны засяроджана абганяюць адна адну на бліскучым асфальце.

Ну вось, нічога страшнага, а ты ўжо быў падумаў. Урэшце, павер, усё будзе добра. Усё гэта скончыцца вось так — ціха і нечакана ўспыхне на Захадзе, праблісьне ў кожнай кропельцы, і можна будзе проста ўздыхнуць на поўныя грудзі.

Тралейбус супакоіўся, аблегчана загуў басам і пайшоў лагодна ды роўна.

З праезнымі проймамі ў цені шыбы коратка пыхалі зарніцамі. Заходняе сонца радасна, з жарам праз халоднае шкло ярыла ў салёне: весела сьляпіла, гулялася ў хованкі з вачыма, коса раскройвала гарачыя пляжы на каленях і зь пякучай пяшчотаю залацістым пушком апыляла дзявочую шчочку... Глянь ты, якая прыгожая.

Празрыста дрыжэлі, пераліваліся празь іскрыстыя кропелькі ў шкле спляценьні бульварных алеяў. У прапаласканым ажуры шыкоўна вытанчанай гушчыні, пад скразнымі скляпеньнямі гольля прамінула мілая парачка — як клявішы з порсткімі пальчыкамі, перабіралі крок калышыны са стройнымі ножкамі. Заструменіла прэч лісьце, вось перасыпаліся, абваліліся кушчы прахонам, і ахнула ўваччу — аж не хапае ўдыху, на ўвесь далягляд — велізарная азораная катлавіна. Па-над глыбокім небам Віслачы грандыёзнай набярэжнай падковаю разварочваліся, паблісквачы гранямі, сталічныя сьпічакі й каралеўскія калянады. Зачаравана, ледзь дыхаючы затуманенай веліччу: які горад, які вялікі мой горад, які вечны... Але зноў зацерусіла, замітусіла вакно таропкае лісьце, і тралейбус зароў трубою, забіраючы на Ордэнскі круг, правабоч ад калясальнае радыёвежы, распасаванай аранжава-белым.

Усё, выходзім. Бадзёра вынырнуў. Гух, скаланула грудзі — да таго сьвежа ў горадзе пасьля дажджу. Высыхаюць цені сонечнага рэха. Малалюдна чамусь. Перайшоў скрыжаваньне, дзе здаўна прымільгаліся ўсе няхітрыя звычкі сьветлафора. Ззаду грымнуў крыты вайсковы грузавік, пераякджаючы трамвайныя рэйкі.

І пераброхнуў у аддаленых катакомбах гораду глухі выбух, і падсела надтрэснутым рэхам сэрца.

Ён абярнуўся: з дахаў, з вышыняў, з-пад самых пастаўленых рубам рэклямных шчытоў спалоханым россыпам пырхнулі птушкі. З-за нагорных кварталаў, дзе гразіла зайсьці зыркае сонца, зь перавалаў далёкае забудовы йшло трывожнае, прыглушанае дрыжэньне гукаў. Чуеш?.. Ці то там нешта тахкае, ці гэта тахт крыві ўвушшу.

Вуліца бясконца разьяжджалася з ростаняў ува ўсе бакі. Праехаў яшчэ адзін цёмна-зялёны «Урал», не зразумеў, што такое. Потым хуткім і злосным шумам паўтарылі яшчэ адзін і яшчэ. Значыцца, усё. Значыцца, здарылася, чорт пабірай. Бялютка, балюча страпянулася ў памяці ўлётачка. Нас забіваюць. Усё. Сёньня. Ён пераступіў колькі крокаў, падштурхваны цьмянай сілай кудысьці туды падбегчы... Застацца... Спрабуючы штосьці дачуць ці ўгледзець... Ці, можа, камусь патэлефаніць... Нарэшце, падхапіўся. Узваліўшы няпэўнасьць за плечы, і рынуў дахаты — шпарчэй, амаль подбегам.

З двара выветрываўся пах кастрышча, і сонечны жар тлеў скрозь дрэвы. Там, дзе калоды ствалоў з трэскам расьселіся кронамі, дзе рыштаваньні гальля пагрозна рыпелі й патрэсквалі, гатовыя зараз жа хрэснуць і рухнуць правалам грукату, агні праціналі перапаленыя дравіны, зырка палалі ў танчэйшых спляценьнях вецьця, а вышэй, дзе цяжка, галавакружна варочаліся вершаліны, вышэй, дзе гальлё рассыпалася трапятаньнем ссохлага лісьця, дзе шугала шумлівым шоргатам — лісьцікі іскрамі пырхалі з дрэва, ірдзеліся, перабляскваліся, успыхвалі ў паветры астатні раз — і шэрым бязважкім попелам гасьлі ў цьмянае сырасьці ценю. Папялішча апошняе восені ціха трушчылася пад нагамі.

У пад'езьдзе затоены, з халадком вечны змрок толькі й чакаў дрогкага бразгату ключыкаў, каб тут жа, на лесьвічнай пляцоўцы, ашчэрыцца ў шахту прахонаў шыпячым страхам.

Радыё маўчала.

Гадзіньнік чаканіў чаканьне.

Ды ты хоць думаеш, што гэта значыць!.. Гэтага ня можа быць. Божа мой, няўжо там дзесьці што бахнулі. Няўжо беспарадкі на вуліцах, і зараз аблава, іх ловяць, уломваюцца ў кватэры... Трэба нешта рабіць, не сядзець жа!

Ён еў спохапкам, таропка душыўся ўсухамяць, ажно плячыма дапамагаючы

СТАГОДЗЬДЗЯ

Перастрэлка. Цішыня.
Неба, чыстае як шклянка.
Тупат быстрага каня.

(конь мог быць ходкім, лётным, шпаркім, хуткім, але ў вершы ён «быстры»; гэта ня конь скача «пад сховам цемнаты», а «сивка-бурка вещая каурка», гэта прывід расейскай Эўропы) (адзін з найманейшых і выключных вершаў беларускай савецкай паэзіі; тэма — настальгія па адрэзаным лініямі фронту родным месьце — «ад сэрца напісана», як казалі ў тыя гады; верш вылучаецца арыгінальнасьцю ў форме і матывах) (верш пра сьвет двухвымерных прадметаў і зьяваў; сьвет бясколерны, беспрыметны, зь мінімумам кваліфікатываў; сьвет вайны; раўнінны сьвет Усходняй Эўропы сярэдзіны XX ст.) (увогуле, начныя вобразы і радкі — нацыянальная страва беларускіх паэтаў; каляніяльная сытуацыя — сытуацыя ночы; ад Багрымава «Ой, кажане, кажане, чаму ж ня сеў ты на мяне» да Глёбусава «Засынаю, ізноў засынаю // бо надзеі ніякай ня маю // і ў жыцьці ўжо нішто не трымае») — , і Куляшоў —

З самалётаў не зводжу вачэй
І не веру, няўжо самалёты
Проста з неба ляцяць на дзяцей,
Сеюць смерць кулямёты.

— і Броўка:

Гляньце — сёння ў грудзях
Толькі помста адна!

і

Аднаго кожны дзень я жадаю ў жыцці:
Каб за сонцам услед мне па трупах варожых
Хоць на некалькі крокаў наперад прайсці.

і Танк — усе яны прайшлі вайну не ў акопах, і не пад немцамі, а ваенкорамі ў франтавой газэце.

кожны чацьверты

Тое, што Нямеччына за 1944-45 была разбурана ня менеў, чым Беларусь за 1943-44, і тое, што беларусы самі нямала спрычыніліся да пачатку гэтай «апошняй» вайны ў 1939-40, нікога ў нас не абыходзіла. Беларусы — задоўга самыя няшчасныя. Бо ўмеюць лічыць ахвяры ў дубль. Пачалося зь лічбы ахвяраў Другой сусьветнай вайны, а што далей, то болей. Лічбы (бярозкі ў Хатыні), надзвычай важныя для нацыянальнай тоеснасьці беларусаў.

Я іду,
ты ідзеш,
а ён не ідзе, ён мёртвы.
Я пяю,
ты пяеш,
маўчыць кожны чацвёрты.
Мы ідзем,
ідзяце вы.
Грунт пад нагамі цвёрды.
Яны не ходзяць.
Нежывы
кожны чацвёрты.

(Анатоль Вярцінскі)

Людзі бедныя, неданошаныя і ня еўшы, але людзі маюць права быць такімі, бо былі войны, бо ёсьць прычыны (Эўропа шэсьцьсот гадоў эвалюцыянуе да усё большага перанясеньня адказнасьці ў сярэдзіну суб'екта, суб'екта-цела ці суб'екта-супольнасьці, беларусы ж насуперак жывуць, адмаўляючыся браць на сябе адказнасьць, экстэрыярызуючы яе) — гібель кожнага другога беларуса ў вайне з швэдамі і расейцамі ў XVII ст., кожнага трэцяга ў Паўночнай вайне, кожнага пятага — у вайне 1812 году і ў Першай сусьветнай і кожнага чацьвертага ў Другой сусьветнай войнах — з кансэквэнтнымі высновамі пра асаблівасьць долі й геаграфічнага становішча, пра «прахадны двор», «скрыжаваньне шляхоў», «мост між усходам і захадам», пра тое, што беларусы ня самі адказныя за свой спэцыфічны матэрыяльны й маральны стан, высновамі пра «варагоў» і «сяброў», пра выключную трагічнасьць, якая абумоўлівае выключныя правы і накладае асаблівыя абавязкі, гэткі мазахісцкі мэсіянізм — гэтыя лічбы відавочна ў шмат разоў перабольшаныя, але працягваюць паўзьці дагары, і ўжо ня раз чуецца пра кожнага трэцяга *беларуса*, забітага ў Другую сусьветную вайну або ў 1812 годзе. Яшчэ адзін вынік стагодзьдзя — беларусы прывучыліся гуляць мільёнамі сьмерцяў як шчытом і мячом, казыром і пяцьцю картамі адной масьці. Нацыя ператварыла сваіх мёртвых у мэблю свайго дому, у капітал, у «бюлетэнь» (калі паліклінічны лісток непрацаздольнасьці — гэта капітал) (цяпер паводле звыклай схемы ў капітал ператвараецца Чарнобыль). Тут — «мы ў адзіночку не пражывем». З гэтага гледзішча па-прароцку-двухсэнсоўна гучаць адны з апошніх радкоў «беларускае савецкае» паэзіі:

Таму асцерагайцеся,
Бо замест сонца
У нашых песнях —
Небяспечны стронцый.

(Максім Танк)

Чалавек тут вырастае з пэўнасьцю, што *ўсё магчыма,* і ўсё на сьвеце ўспрымае як нармальнае. Межы магчымага і нармальнага рассунуліся да немагчымасьці. Беларусам за нішто будзе зноў пакласьці мільёны людзей у зямлю («не впервой») (існуе стэрэатып, што ўсходнія славяне прайграюць падступнаму й хітраму Захаду ў штодзённым жыцьці, але пры гэтым ніхто не параўнаецца зь імі ва ўменьні выжываць у цяжкіх становішчах; з гэтай тэзы лягічна дайсьці да высновы, што адзінае выйгрышнае, а значыць выгоднае для ўсходніх славянаў становішча рэчаў — экстрэмальнае, напрыклад, ваеннае) (пайграем у вайнушку: хто будзе «немцамі»?). Па-другое, калі йдзецца пра пэрыядычныя галакосты, прападае разуменьне вартасьці кожнага асобнага жыцьця кожнага асобнага чалавека. Па-трэцяе, хлусьня гістарыёграфаў — маці ўсіх хлусьняў. Пачацьвертае, вялізная лічба ахвяраў апошняй вайны сакралізуе гэтую падзею, ператварае ў блюзьнерства любыя спробы гістарычных ці палітычных пераацэнак, задае пэўную арыентацыю нацыянальнай сьвядомасьці; вядома, «дзела крэпкае, калі яно скроплена крывёю». Хто наважыцца дакапацца да рэальных і канкрэтызаваных (колькі жыдоў, колькі жыхароў іншых краінаў, колькі расейскіх ваеннапалонных, колькі ў камэрах гестапа, колькі пад савецкімі бамбёжкамі etc.) лічбаў?

З падачы мастацтва чалавек пагарджае найважнейшай абмежавальнай праўдай: магчымае тое, што чалавек лічыць магчымым.

Ад веку беларусаў «білі й крыўдзілі» — гэта стала стэрэатыпам і абгрунтаваньнем пазыцыі. Крый Божа ім зноў дарвацца да магчымасьці помсьціць, бо то будзе страшная помста. Гэта будзе сэрбскі сындром, памножаны на савецкую вывучку.

каб сала у хаце кублямі вялося

У культурнай казаччыны два наступствы: непавага да нормы (непавага да *літары* правілаў і законаў, «бескультурнасьць» у сэнсе схільнасьць зьмешваць знакі; філязофія «ўсё-можа-быць», «пачуцьцё нясталасьці й нетрываласьці») і ўсходнеславянская эўрапейская/антызаходнеэўрапейская раздвоенасьць («пачуцьцё ворага», пакрыўджанасьць, помсьлівасьць, гістэрычнасьць, міты пра мост між захадам і ўсходам, недаацэнка сваёй культуры й традыцыі).

Калі хочацца радыкальных зьменаў, паўстае пытаньне пра выдаленьне дыдактычнага курсу літаратуры з школьных праграмаў (літаратура — нестабільнасьць, мова — стабільнасьць) (асабліва калі йдзецца пра маладую нацыю зь невялікім корпусам тэкстаў, што тоіць небясьпеку ўзьнікненьня кляўстрафобіі).

Працяг на старонцы 22.

сківіцам. Дрыготка трэсьліся рукі, быццам сьпяшаліся рынуцца ў рукавы курткі, хутчэй штосьці аднекуль дастаць і па імклівай хадзе гатоўна сагнуцца ў локцях. Пастарайся стрымацца... Спакойна... Але тут жа прасыпаў соль — і цяжка адсеў ад стала, тупа дажоўваючы, аддыхваючыся, зь перабоем у грудзях.

А можа, чорт пабірай, гэтага паскуду грохнулі? — у ім аж усё адышло, — калі так, то пачнецца, і ох як пачнецца! Ну што, выйшаў бы ў цэнтры, і куды, скажы мне, куды далей?!

Так, радыё загінула. Тэлефона ніхто са знаёмых не падымаў. Змучаны бясконцымі гудкамі, узьведзены супраць гадзіньнікавай стрэлкі, ён, ды што ж такое, шалёна скруціў нейкі нумар наўсьлеп і здаўлена выгукнуў у чыюсьці кватэру:

— Скажыце, што творыцца ў горадзе?!

— Вы не туды патрапілі.

Гудкі.

Шыба бзыкала ціхенька й натужна. Прачыні!.. Застарэла трэснуў прах пылу. Згрудзіліся бразгатам рамы. У падвойным адлюстраваньні, у стылых глыбінях дрэваў, ледзь жыва, задрыжэла ягоная бледная здань. Спалохана шаснуў у твар, аж зайшоўся трапятаньнем, шоргат дваровага вецьця: там, скрозь вецер, снаваў няўмоўчны прыглушаны пошум. Нешта цяжкае разгружалася ў далёкім горадзе, шэрхла, патрушчвалася — і шалахцелі, несканчона падалі адзін пры адным падстраляныя шэрыя лісьцікі.

Ён дранцьвеў. Штосьці дзёрзкае й адчайнае, зусім невялічкае, перабіралася толькі ў пальцах. Яны, маленькія, нэрвічна мітусіліся, нецярпліва й патрабавальна сьціскалі тлустыя складкі вопраткі, да болю закусвалі пазногці, роспачна расьціралі тут і там пуды пахаладнелага цела, змаршчыны, скроні...

Ён з жахам глядзеў на рукі: пальцы дрыжэлі, і яму стала старшна. Штосьці... Кудысьці ж трэба ісьці...

Нечакана, як барабанная перапонка, ажыла сьцяна, напятая тэлевізарнымі пазыўнымі. Канечне! — да Сашы, там жа павінны...

Суседавы дзьверы рванулiся насьцеж так рэзка, што ён убачыў свой сполах у Сашавым твары.

— Што там такое?!

Ён пабачыў задымленую панараму, аднекуль з вышыні, і ўсё правалілася.

... Паўстанцы занялі Дом Афіцэраў. Здалёк відаць, як трапечацца там іхны падняты сьцяг. Паводле зьвестак, вось ужо паўтары гадзіны працягваецца штурм прэзыдэнцкага Палацу. Дзьве атакі, здаецца, адбітыя. Відавочна, рыхтуецца трэцяя. Дзе сам прэзыдэнт, ня ведае ніхто — сувязь перарвалася яшчэ ўдзень. Бязладныя жорсткія перастрэлкі. Агонь вядзецца бесьперастанку з абодвух бакоў. Да месца бою нельга наблізіцца за некалькі соцень мэтраў. Дрэнная бачнасьць, усё задымленае. Сорак хвілінаў таму паступілі зьвесткі, што разгарэўся бой на ніжніх паверхах будынку КРБ і ва ўнутраным двары. Грузавік пратараніў масіўную браму. Тэлерадыёцэнтар заняты невядомым падразьдзяленьнем, людзі ў камуфляжы ды масках нікога не падпускаюць. Калёна бронетэхнікі, што ўвайшла ў горад з паўночнага ўсходу яшчэ чатыры гадзіны таму, была абстраляная й спыненая ў раёне Ўрэчча...

Перадавала Расея. А БТ?..

На экране шалела мяшаным шумам чорна-белая ліхаманка. Гэта вайна. І пакуль ён зьнямела дапяў, узбуджаныя белачорныя дрыжыкі пранялі яго дарэшты.

У разнасьцежаным пакоі стыла зьмярканьне. Заваконнае лісьце ткалася шэрасьцю, змрок патрохі сьцінаў непрыбранае на стале... Стухала, сьцішвалася наваколле, але тым кашчавей азначаўся ўдалечыні цяпер ужо чутны траскучы пошчак.

Там ідзе бой. Зараз ва ўсім велізарным горадзе няма пастаяннага вечаровага шуму, няма паўсюднай пульсацыі. Усё пагасла, развалена, страшна. І ты са сваім уключаным у пакоі сьвятлом нічога ня значыш.

Штурмуюць Палац. Давайце, хлопчыкі... Дзе ж ён сам, гэтая падла... Можа, ужо зьнішчаны! Можа, ужо колькі гадзінаў яго шарахнула. Гранатамётны выбух, ашмёткі целаахоўнікаў. Гіганцкай сьвяточнай пэтардай. І ўся ўлада пайшла спустошаным рэхам, вось яна — хочаш, прыгаршчамі падбірай — рассыпаная ў ашкелках на асфальце, і толькі дыміцца наўкола. Можа быць, і ўся герархія ўзброенай камуфляжнае чэлядзі, у міг жудасьці пазбаўленая валадара, паражаная страшным шокам — разам выбухнула ўсім кашмарным, што толькі можа таіцца ў казармах!.. І зараз хто засеў ў зьдзічэлым зацятым ражы, адстрэльваецца насьмерць, хто таропка пераапранаецца й зрывае пагоны, хто беспардонна разьбягаецца па горадзе, ліхаманкава громіць і гробіць усіх і ўся, каб ашалелыя чэргі па вітрынах глушылі страшэннае пачуцьцё: заўтра ўжо будзе позна. Заўтра для іх усё будзе скончана.

І нашы. Вызваленцы. Сівыя й бязвусыя. У куртках, у ношаных строях, у якіх хадзілі на працу, зь вязанымі каптуркамі на галаве. Падпярэзаныя белым на локці. Перабягаюць... Групамі...

Госпадзе, там жа зараз усе, усе твае! Сяргей — што, няўжо ведаў учора, ён жа заўсёды ў курсе такіх справаў... На перакуры з-пад броваў так выпрабоўна прымружыўся на цябе, і не сказаў, не сказаў ані слова... Алег, маўчыць тэлефон, канечне ж, ён там, канечне, пабег, Алежка! Тыя студэнты... Ён памятае, гаркавы прысмак ад палай лістоты, пілі піва ля кулінарыі, заўважыў значкі. Ну што, хлопцы, — як, жыве? Вядома, жыве, куды ж яно дзенецца. Мы Маладзёвага Вызваленьня. Хлопцы, трымайцеся, я з вамі. Я ўсё гэта ненавіджу. Дай нам Бог перажыць. Паціснуў кволую й танклявую далонь, здавалася, хрусьне — пальцы, быццам празрыстыя, чуйна ўздрыгнулі. Даўгавалосы, здаецца, Віталь. Усё выстукваў рытмы на століку. Рок. Гэта страшна, калі такія суглобы ашчапераюць зараджаны калаш. Так, нас пачнуць адстрэльваць, казаў Чэсь, як курапатак. Кудлаты грэблівы Чэсь з падпаленым шчацінаю падбародзьдзем. На грудзях калекцыя значкаў, бы ордэнскія планкі. Вэтэран мітынговы. Даводзіў пра псыхатропную зброю, скачкі з парашутам, пра рыжых ірляндцаў. Рыхтуйся. Канечне, будзем. Нас, можа, ня хопіць, але мы будзем усё роўна.

Дрыжыш. Што, не гатовы.... У цябе анічога няма, адно тоўстыя кніжкі й расьпяты сьцяг на сьцяне. Кухонны нож, сталовы, тупы, што там яшчэ... Ды малаток недзе ў шафе, ня помніш, калі й цьвікі забіваў. Зараз жа выходзь на вуліцу, чуеш.

А там вайна. Такая, што вырве ўласным крыкам, ты ўяві. Паўзком, жыватом і каленямі. Закасана да локця. Натужна зашнураванае жыламі. Вуліца ператвараецца ў непадступную шахту з адвеснымі сьценамі. Прыцэльная пільнасьць зрэнкаў... Трохі вышэй за мушку, і бахай хутчэй. Ператрымаеш — расплываецца зрок... Колькі там жыхароў шэпчуцца ў павыключаных кватэрах, на карачках перапаўзаюць на кухню. Дзеткі перад экранамі вокнаў, захоплена дрыжучы ля пякучае батарэі, цокаюць з кожнай чаргой, а мама роспачна моліць — толькі б ня вышыбла шкло.

Успышка! Сыпецца тынк... Прыгніся. Гэта твая вайна. Ты столькі разоў сам сабе ўяўляў, як гэта будзе. Ты ж страшэнна хацеў. Ты цішком, задыхана мроіў, ты ваяваў пад грозны музычны роў, пад транспартны грукат. Выходзь, ну, давай жа!

Вось ён, сёньняшні вечар, перад табой. Вечнасьць успыхвае й гасьне, азарае правулкі, цьмяныя помнікі постацяў. Увесь сьвет, часта дышучы, дрыжыць і вагаецца ў траскае тэлекамэры. Там заходзяцца ад ярасьці, шалу й моцнага бегу.

Усё, там вайна. У здаўна знаёмых дамах і вулачках. У горадзе, дзе ты столькі выхадзіў, такое выношваў... Там, дзе тваімі сьлядамі спрэс брукаваныя ходнікі, дзе вокны й вітрыны глядзяцца тваімі адлюстраваньнямі, дзе табою надыханы дух...

Прабірайся ў кварталах. У застаялай цямрэчы гарышчаў, у падчарэўях каналізацыяў. Зь цёхканьнем гільзаў, са струшчаным шклом ашкелкаў. Са здушаным кхеканьнем, гэй, цішэй, каб не пачулі. Трэба пралезьці вунь там, хтосьці свой за сьпінаю, вунь, за домам, і грохнуць той БТР. І ўсё, і там апошняя плошча, апош-

Працяг на старонцы 22.

ЛІРЫКА ЧЫРВОНАГА СТАГОДЗЬДЗЯ

Працяг на старонкі 21.

год адзінаццаць, а можа, дванаццаць

Увогуле ж пытаньне зь «беларускай савецкай літаратурай» заключаецца ня ў тым, адкінуць яе ці не адкінуць; пытаньне ў тым, што яе няма куды прытачыць. Ідзецца не пра ацэнку, а пра спробу інтэрпрэтацыі і клясыфікацыі.

БСЛ дэкляравала рэалізм, але рацыяналізму, інтэлектуальнасьці, аб'ектыўнасьці, крытычнасьці, супярэчлівасьці, шматтраннасьці, аналітычнасьці ў ёй няма.

БСЛ дэкляравала вернасьць клясычным канонам (прыкладам, вершы, напісаныя вэрлібрам, ухваляліся толькі ў тым выпадку, калі іх аўтарам быў герой сацыялістычнай працы), але пры гэтым, як правіла, не выходзіла за простыя, паўфальклёрныя формы.

БСЛ вымушана была пераважна школьнай і дыдактычнай літаратурай і дэкляравала сваю «даступнасьць», але толькі безадказныя бацькі могуць рэкамэндаваць дзецям твор хоць нейкага аднога зь яе пісьменьнікаў, не прачытаўшы перад тым: у любога можна натрапіць на дзікунства ці ідалапаклонства, прычым у самых нечаканых месцах. Ды й мала хто зь дзяцей зачытваецца творамі, дзе ўсё раскладзена па паліцах і якія не зважаюць на элемэнтарныя законы папулярнай літаратуры.

БСЛ дэкляравала сваю народнасьць, трактуючы яе як глыбінную адпаведнасьць нацыянальнай душы і арыгінальнасьць, аднак, як паказала Саламія Паўлычко ў «Дыскурсе мадэрнізму ва ўкраінскай літаратуры», ідэалёгія і эстэтыка гэтага народніцтва сфармаваліся пад уплывам расейскага народніцтва (якое, дарэчы, сталася ня самай плоднай, маргінальнай галіной у расейскай літаратуры), а расейскае народніцтва было позьняй кампіляцыяй шэрагу эўрапейскіх тэорыяў.

БСЛ дэкляравала таксама эстэтычнасьць і сьвятую вайну супраць безгустоўнасьці, але паколькі ў прынцыпе шукала сабе лёгкіх шляхоў (характэрны факт: трымалася за хібны, перакручаны правапіс толькі таму, што так «прывычна») (трагедыяў александрыйскім вершам не пісалі) (не цікавілася філязофіяй і навукамі, нават сучаснай псыхалёгіяй: сярод «беларускіх савецкіх пісьменьнікаў» малы мінімум людзей зь нефілялягічнымі адукацыяй або грунтоўнымі досьледамі зь іншых, нават блізкіх гуманітарных навук), то пісала досыць адвольныя рэчы («Год адзінаццаць, а можа, дванаццаць // Сэрца баліць, што не здолеў спаткацца.» — Здаецца, у вершы «Пахне чабор» Петруся Броўкі, часта выдаваным за шэдэўр беларускае паэзіі, замест лічбы 12 магло б стаяць 13 або 17) (хто іх там ліча?).

Любая інтымная тэматыка ў БСЛ а priori заставалася другаснай, як у любой літаратуры, якая сьвядома фармулюе сябе як літаратура таталітарнага грамадзтва.

БСЛ ставіць сабе ў заслугу зьберажэньне беларускай мовы і ідэі, але амаль у кожным творы парушала, падвяргала рэвізіі нават тыя спрэчныя, не заўжды лягічныя, зрусыфікаваныя нормы беларускай мовы, якія яна сама сабе стварыла, тым самым прышчапляючы чытачам непавагу да мовы і да нормы ўвогуле. Урэшце яна да апошняга трымаецца за «наркомаўскі» правапіс, навязаны сталінскай рэформай 1933 году. Колькі зь «беларускіх савецкіх» пісьменьнікаў запомніла, што, у адрозьненьне ад расейскай мовы, у беларускай прыназоўнік «па» вымагае меснага склону?..

Мастацтва — гэта ня толькі эстэтыка, але яшчэ й этыка. Радкі ж кшталту Крапівоўскіх «Ад Якуціі аж да Мазыршчыны // Чужаедскія кодлы панішчаны» ня вылушчыш з агульнага даробку, важаць і сваеасаблівыя шэдэўры жанру пахвалы, што йдзе ў беларускай літаратуры ад Рымшы: сапраўды, «Вялікаму Сталіну ад беларускага народа. Пісьмо працоўных, пераказанае шасцю паэтамі» і «Ленін думае пра Беларусь» Бураўкіна з фармальна-стылістычнага пункту гледжаньня — з самых вартых і найкалярытнейшых твораў БСЛ. З чыста ж фармальнага пункту гледжаньня «беларуская савецкая літаратура» сваім патэтычным і рытарычным, далібог стандартным патрыятызмам («З пушчамі, бярозавымі трактамі, // З гулам самалётаў над зямлёй, // З працавітай песняй дужых трактараў, // З яснай, электрычнаю зарой» — Пімен Панчанка) і эпігонствам кампрамэтуе беларускі нацыянальны дыскурс.

Дык куды, да якой традыцыі залучыць БСЛ?

Ідэалягічная заангажаванасьць, апалягетыка правадыроў, багаборства, бруталнасьць і маральнае экспэрымэнтатарства даюць падставу для аналёгіяў з пэўнай эўрапейскай *літаратурай левых*. Аднак жа, эўрапейская левая літаратура звычайна не стваралася за грошы ўладаў і на замову ўладаў. Калі браць постаці асобных культурных герояў, у БСЛ і блізка няма нікога ўпоравень з Маякоўскім ці Арагонам.

Камуністы — гэта слова як са сталі,
Камуністы — гэта слова як з агню.
Маркс і Энгельс нам імя такое далі
Сто гадоў таму назад упершыню.

(Аркадзь Куляшоў)

Памылкі беларускай мовы маюцца тут у кожным радку, а больш... А больш нічога. І марны занятак — перачытваць БСЛ у пошуках нечага *іншага*, бо знайсьці яго можна пераважна толькі ў тых, хто па часе ці абставінах выхаваньня й жыцьця ня поўнасьцю належыць БСЛ, або ў тых, што былі рэпрэсаванымі, а значыць, не зусім адпаведнымі яе нормам.

Уласна, стылёвая невыразнасьць і ёсьць самай характэрнай рысай БСЛ.

Іншы раз даходзіла да дэманстратыўнага ідыятызму:

Савецкі Саюз не адзін:
Амерыка, Англія ў згодзе.
Што ж будзе, калі гэты млын
На поўныя ставы заходзе?
А як матцы глядзець
На сына, што стаў галавешкай?
Праклёны ж яе, ну як медзь,
Звінелі і білі даўбешкай.

(Якуб Колас)

Што азначаў гэты ідыятызм? Ці то была стома, ці то шчырая страта густу й меры, ці форма пратэсту — гэта ўжо пытаньні інтэрпрэтацыяў. Здаецца, што нейкае значэньне і кантэкст «беларуская савецкая» літаратура магла б набыць у выніку постмадэрновай інтэрпрэтацыі — але то сумная для яе пэрспэктыва.

Гэтак, *«беларуская савецкая літаратура» — гэта плынь у беларускай літаратуры XX ст., адзначаная моцнымі дыдактызмам і ідэалягічнай заангажаванасьцю, а таксама спэцыфікай густаў, плынь, якая стварыла «наркомаўскі» правапіс і карысталася ім, якая зьвязала свой лёс зь лёсам расейскага камунізму, каб разам і адначасова зь ім дасягнуць найвышэйшай кропкі разьвіцьця, а пасьля канчаткова замерці на зломе тысячагодзьдзяў.* Яе гістарычная і эстэтычная вартасьць, як і шанцы далейшага ўплыву на мастацтва і грамадзтва выклікаюць пытаньне.

Ёсьць пытаньне з вызначэньнем часавых рамак «беларускай савецкай літаратуры». Яе зараджэньне прыпадае на 20-я гады, а згасае яна марудна, пачынаючы недзе з канца 50-х, з 60-х (з пункту найбольшае сталасьці і росквіту) на пару зь левым таталітарызмам і эўрапейскімі камуністычнымі інтэлектуаламі, пусьціўшы яшчэ кволую хвалю камсамольскага дэкадансу. Гэтак, Чарнышэвіч, Янка Маўр, Пфляўмбаўм, Максім Танк, Янка Брыль, ... яшчэ ня цалкам да яе належаць, а Быкаў, Караткевіч, Адамчык, Купрэеў, Разанаў, ... ужо пачалі адмаўляцца ад яе варштату.

Калі прыйшла самая пара процістаць нэакаляніяльнаму ладу і духу, ідэалёгію й рыторыку змаганьня зноў спрабуюць сфармуляваць у мове рымэйкаў зь «Беларускім партызанам».

Галоўнае пытаньне зь «беларускай савецкай літаратурай» заключаецца ў тым, *як* яе забыць.

РЫХТУЙСЯ

Працяг на старонкі 21.

няе поле газону, так шчыра выстрыжанае для цябе.

Ты жывеш у зыках і шолахах, якія злавесна пашэптваюць, ператрэскваюцца ў лістападавым шоргаце, сьцішваюцца... І тут жа выбухаюць страшэннай чаргой! — і — вось ужо рраз-ра-джа-ец-ца! — на-вакол! — а-глу-шаль-ны! — ррро-кат! — з асколкавым віскам разлушчвае па завугольлях гучныя пошчакі!..

Крывава-яркая бітая цэгла. Балюча глядзець.

Вулічны бой. І цябе разам з болем, з успыхнутым зухам праймае ўпэўнена й гэтак пранізьліва ўся тая сіла і веліч, якую глушылі й вытоптвалі ў нас столькі вякоў. Чуцьцё свайго гораду. Адчуваньне свайго. Цяпер, ва ўзбуджанай калатнечы, ты цісьнесься да каменнага цела, да тонных плітаў табою абжытага гораду, тулісься да збудаваных сьвятыняў памяці, усё цяплей і цясьней, шэпчаш, шэпчаш штось пра сябе, увесь поўны грамаднай цягай, уладна апоены вулічным пахам — і зь перабежкай, упаўшы, зьліўшыся з гэтай зямлёй, стоена дыхаючы ёю, грэеш у пальцах пяшчотны асфальтавы пыл, перабіраеш казыткае дробнае сьмецьце й чуеш, чуеш прываленым тулавам, як бухае гулка, прызыўна падземнае сэрца — і толькі тады, у апошняй, да сутаргаў зьведзенай гарачыні, спазнаеш невымерную роднасьць краіны, спрадвечна тваёй, за якую ты зараз б'есься.

Нясьцерпныя позвы. Туды.

Холадна, як ён дрыжыць. Туды. Ператварыцца ў цьмяную постаць. Прабірацца, згасаючы ў цемрадзі. Успыхваць страхам у водсьветах ліхтароў, ценем сьцінацца ля сьценаў. І туды, хуценька, як мага хутчэй туды, да цёплага, да агнёў, да сваіх... Баісься.

Што ж там, хто каго... Дажыць да раніцы, да сьвітаньня, а потым, што будзе потым? Пагромы, выкідваньне з вокнаў, падлеткі са зброяй у патрулях... Ці арышты, і пасты на кожным рагу, і БТР ля кінатэатру?..

Пад вакном рэхкнула. На ўвесь двор загірчэла рацыя. Прыдавіўшы ашалелае сэрца, ён успоўз на падваконьне. Унізе, ля пад'езда, трохі асьветлены зь першых паверхаў, варушыўся заплямаваны амунавец. Так, амун. Адзін, гадзіна. Што, хаваесься, сцыкун... Зашыўся...

Слухай, дастаць малаток, а... І крадочкам на лесьвіцу. Сабрацца ў камяк да пульсу, пальчыкі — ледзь за парэнчы, нябачныя ў цемры парэнчы. Ціхусенечка, не скрышыць і пясчынкі. У змроку, амаль без дыханьня, незваротным кружэньнем спускацца, ціха спускацца, круг за кругам сыходзіць... Ступаць усё глыбей, усё цямней... І на самым дне намацаць нагою парог. Шыбануць дзьверы, ён тут! Гахнуць у голаў! — абваліцца, друзла асядзе... І дабіваць, надсілу, бо цяжка праломваць чэрап, дарубацца да поўнага хрушчу...

Альбо разам з Сашам, нармальны жа хлопец.

Ты што...

У начным горадзе стаялі дрыготкія вагні. Так далёка, можа, здавалася, успыхвалі водсьветы. І чуваць, як прыглушана строчыць, спрачаецца страляніна.

Той, унізе, сьцішана кхекнуў. Пстрыкнуў у двор недапалак. Зьнічкай.

Гэта, мабыць, Саша так дзіка трызвоніў у дзьверы. Ну, што там, ізноў перадавалі, што?! — кінуўся адчыняць.

Двое ў вайсковым прайшлі паўзь яго ў кватэру так засяроджана і ўпэўнена, што ён і ня змог спужацца як сьлед. Толькі калі пад ботам першага, бугая, балесна ўскрыкнула родненькая падлога — ён жахнута, да віску сьцяў ручку дзьвераў.

Другі азірнуўся — з сабачай зубастай усьмешкай, з такім ашчэрам шчырае жорсткасьці — усё перабягаў, абнюхваў блішчастымі чорнымі вачыма, і задыхана, перарывіста згаўкваў:

— Там, гэты, бля, засеў... Во, хазяін, якраз супраць цябе... Ну, зараз мы, мамэнтам з вакна яго, с-суку...

Грукатнула мэбля — здоровы ўжо ссоўваў стол. Пёс у запэцканым камуфляжы аддыхваўся ля падваконьня, чагосьці высочваў, выцкоўваў — оп! Нарэшце цопнуў таго за руку:

— Пасі — ён!

— Э, ты, выключы сьвет.

Ён ледзьве патрапіў выключыць... Пальцы дрыжэлі ў шчаўчку, і лямпа двойчы ўзбліснула маланкай. Зь цямрэчы растрыбушанага пакою, у шэрым дваровым трымценьні, ён анямела ўглядаўся, вышукваў... Вунь, вунь праз двор, у прыцэле вачэй, на даху суседняга дома, варушыцца... У прыцэле вачэй перабіраецца цьмяны згусак... Паўстанец. Прыгнуўшыся, нешта трымае й асьцярожна пераступае між укрыжаваных антэнаў. У крок яму глуха тукае бляха. Тук. Тук.

Тыя, чорныя, сьціснулі ці ня ўвесь прасьвет. Прыладжваліся, прыціраліся, як не пацмоквалі. Іх навальнічныя цені зь лістападавым шумам хадзілі ходырам, абшарвалі столь і сьцены, курыліся ў вулічных водсьветах, у белых палосах сьцягу, і ён сам адчуваў, як цьмянела ў ягоным збляднелым твары.

Скінуць іх зараз.

Аж ашпарылі дрыжыкі — у ім узьнялася чалавечая сіла, ён здужае! Прачуў, як дыханьне на старце прымервае міг — ірвануць, заграбаючы, волатам зрынуць цяжэнныя целы ў прадоньне... Зараз жа... Зараз...

А ў жахлівым шолаху лісьця кешкаўся шэпт ашчэранага:

— Ззабівай... Ну, цэль у галаву... Мачы, загасі гэтага підара ўмаць...

Бахнула громам! — шарахнула рэха душою ў пяткі.

Боўдзіла ляскнуў калашнікавым, засіпеў сьліной скрозь зубы — «хер яго знае...» Павярнуў цьмяны твар, няўцямна агледзеўся...

А ён, насьмерць сьцяты нянавісьцю, ужо ведаў: усё! Гэтыя сволачы выйдуць — хутчэй! — ён схопіць ды хаця б малаток, сунецца ў куртку — і на вайну! Хут...

Божа, які боль!!

Твар раскулешаны ўкроў... Лоб ледзяна садніць, з хрэскам, балюча... Усёй бэтоннай сьцяной гудзе патыліца. Біў бугай. Гэта бугай ашалела рве сьцяг са сьцяны, аж пстрыкаюць зашчапкі па ўсім пакоі:

— Ёп тваю, колькі ж вас тут, сукаўё!..

Другі з аглушальным грохам бурыць паліцу — гэтыя кніжкі табе падбіраць ужо ня трэба.

Яны шчасьліва саплі, ботаброхалі па прыступках, зводзілі яго, заламанага ў суставах, круг за кругам у змрочныя прахоны. Падпіхваючы, здрыгаючы парэнчамі. Ён пераступаў як мог асьцярожна, яго, вантоўна п'янага млосьцю, вяло... На падбародзьдзі, на вуснах зьдзекліва казыталі кроплі, цяжкія ртутныя кроплі... Ён трусіў галавой, каб скапвала, капала хутчэй і, прымружаны болем, усё ж такі бачыў, як на белай сарочцы распаўзаецца, ліпне да сэрца гарачая чорная паласа.

— Стоп, — задыхана прытрымаў за плячо здаровы. — Слухай, на хер куды яго перці. Тут і пагрузім, прама ў пад'езьдзе.

Віктар Шніп

З ЦЫКЛЮ «БАГЕМА»

***

Я б купіў сабе горныя лыжы
І паехаў бы ў Альпы гуляць.
На лыжах я б ляцеў над Парыжам,
Як вароны над Менскам ляцяць.

Я б у Альпах знайшоў сабе кралю
І сваю б падарыў ёй любоў,
Як багемскую вазу з крышталю,
Як анёльскую песьню бяз слоў.

Я б купіў сабе горныя лыжы,
Я купіў бы сабе пісталет,
Калі б я быў, як Азія, рыжы,
Каб ня быў я тутэйшы паэт.

***

Сяджу з табой у бары
І каву моўчкі п'ю.
Ты любіш тары-бары,
А я — цябе люблю.
Як неба, дым над намі
Ад польскіх цыгарэт.
Ты райскімі нагамі
Мой растаптала сьвет,
Дзе я быў нежанаты,
Дзе я віно любіў,
Дзе я пляваў на Штаты,
І дурням морды біў...
Няма даўно былога,
З табою каву п'ю.
Ты любіш вершы Блока,
А я іх — не люблю.

***

Сумная, нібыта грэх, паненка,
Быццам бы туман, на ёй сукенка.
Ты за ёй ідзеш, нібы сабака,
Прад табой, як рай, паненкі срака.
Думаеш сабачымі мазгамі:
Заваліць паненку б пад кустамі.
А яна ідзе, нібы сьмяецца,
Нібы ў келіх ром кубінскі льецца.

ЖОРСТКІ РАМАНС

З залатой, як піва, габрэйкай
Ад цябе ён зьляцеў на Канары,
Хоць бы мог са сваёй канарэйкай
Загрымець, як казёл, пад фанфары.

І цяпер ты адна, як дурніца,
Будзеш дзетак малых гадаваць.
І на вуліцах цёмных сталіцы
Белым целам сваім гандляваць.

А ён будзе гуляць на Канарах
І габрэйку, як крыж, цалаваць.
А яму падыхаць бы на нарах
І свой век малады праклінаць.

Сабярэш ты вялікія грошы
І заплаціш патрэбным хлапцам,
Каб яны, як магільныя вошы,
Дапаўзьлі да твайго малайца.
І зарэжуць яго тыя хлопцы
І габрэйку ім не шкадаваць.
І прышлюць табе ў чорнай каробцы,
Што папросіш на памяць прыслаць.

Будзеш плакаць і будзеш сьмяяцца...
А пакуль што ты сёньня адна
Ледзь ідзеш, як пабітая, з працы,
Не ўдава, але ўжо не жана.

БАЛЯДА СЭКСУ

У бялюткім, як туман гатэлі,
Бы ў сьнягах, валяесься ў пасьцелі.
І наколькі ты шчэ маладая
І настолькі ты яшчэ дурная.

Хоць ты любіш сэкс і апэльсіны,
Толькі больш у Лёндан і Афіны
Хочацца табе, такой салодкай,
Як цукерка з залатой абгорткай.

Ты ляжыш, як кошка, уздыхаеш,
І сабе страхоцьця наганяеш —
Вось памыецца твой Джон у душы,
Выйдзе мокры і цябе задушыць...

Толькі Джон твой, камсамолец быўшы,
Зьбег даўно, за сэкс не заплаціўшы.

***

Я сёньня маю грошы,
Я сёньня менскі пан,
Харошы і прыгожы,
Як новенькі наган.
Гуляйце, прыгажуні,
Няхай шанцуе вам.
Не распускайце нюні —
Нічога вам ня дам.

Я сёньня кралю маю,
Я сёньня каву п'ю.
Мяне дурыць — ня раю,
А то, як вош, прыб'ю.

Я сёньня маю грошы,
Я сёньня менскі пан,
Харошы і прыгожы,
Як новенькі наган.

МАЯ ЗАМЕЖНІЦА

Я паднёс табе чорную ружу
У крыштальным бакале зь віном.
Я ня стаў тваім сябрам ні мужам,
Я застаўся нязбытачным сном.

Я з табою ніколі ня буду
Па парыскіх салёнах хадзіць.
Я гляджу на цябе, як атруту,
Не магу я атруту любіць.

Дык вазьмі гэту чорную ружу —
У мяне больш нічога няма.
Я пайду і схаваюся ў сьцюжу,
Бо па мне сёньня плача турма.

Не пытайся, чаму турма плача,
Я нічога табе не скажу.
Сёньня жыць не магу я іначай,
І ня кліч ты мяне за мяжу.

"НАША НІВА" 6 (103) 16 САКАВІКА 1998



Бясплатныя прыватныя абвесткі

Каталіцкую пэрыёдыку 97-98 г. куплю. Любую. Ліда, Рыбіноўскага, 34-24. Тэл.: (01561) 3-52-87. Уладзімер

Паганцы і нехрышчонікі, атэісты і агностыкі! Хто яшчэ не набыў часопіс „Крыўя" за 1996 г., звяртайцеся праз тэл. у Менску: 61-96-45.

Маладая нацыяналістка шукае працу (2 замежныя мовы, кампутар, правы кіроўцы, музычная адукацыя). Тэл.: 31-40-80. Юля

Рэпэтытар. Гісторыя Беларусі. Падрыхтоўка да ўступных іспытаў, таксама да школьных. Пытаць Сьвятлану. Тэл.: 247-81-73 (акрамя аўторка. Да 22 гадзін)

Zaprašajem manarchistaŭ! 246012, Homiel, a/s 124 Aleś Čomy

Zaprašajem tych, chto nie zabyŭ imia narodu svajho. Vivat manarchija! Slava vajaram VKL! 246012, Homiel, a/s 124

Zaprašajem prychilnikaŭ sapraŭdnaha adradžeńnia! Imia, vielič, VKL!!! 246012, Homiel, a/s 124

Manarchisty-patryjoty, hurtujciesia! Nie — levakam! Za samabytnaść, vielič, volu, VKL! 246012, Homiel, a/s 124

Vialikaja Kryvickaja Litva — Respublika Biełaruś! Skaročana — VKL! A Žamojć znachodzicca za Vilenskim Krajem. Vitaŭt

Vinšuju ŭsich kryvičoŭ ź vialikim śviatam — 80-mi ŭhodkami ŭtvareńnia BNR. Chaj žyvie Rodny Kraj! Lasny Brat z Baltkrevii

Віншую ППРБ з Днём Волі. Выходзь з-за кратаў і падыхай водарам свабоды. Мікола

Віншуем нашу любую дачушку Кацю Кудрыцкую з днём нараджэньня і Днём Волі. Мама, тата

Прыўкрасную шляхцянку Кацярыну віншую з Днём Народзінаў. Зычу шмат сонца і ўсьмешак! Брат

Набуду «Нарысы па гісторыі Беларусі» 1-2 т. Тэл.: 257-81-85. Марына

Пазнаёмлюся зь беларускай высокай, прыгожай. Пра сябе: 27/188, сымпатычны, шкодных звычак ня маю. 220123, Менск, а/с 261

24 сакавіка на «Вольнай сцэне» апошні спэктакаль «Віта Брэвіс або Нагавіцы сьвятога Георгія». Сьляшайцеся, сапраўдныя нашчадкі Францыска Скарыны!

Ідзе лета. Прапаную прыхільнікам беларушчыны арганізаваць абмен вандроўкамі. Прапановы ўдзелу, фінансаваньня і разьмяшчэньня слаць на адрас: 211030, Ворша, вул. Сямёнава 35-317. Сьцяпанаву Віктару

Сям'я здыме аднапакаёвую кватэру з тэлефонам. Тэл.: 221-23-68

ВВЛ-78 з нараджэньнем у Дзень Волі. Дачакаемся! Ігар

Маёй вольнай каханцы Вользе віншаваньні з Днём Волі і нараджэньнем. Ігар

Найпрывабнейшая Ларыса! Віншуем з Днём нараджэньня! Цяпла, сьвятла і максымальнай рэалізацыі асабіста-жаданага! Сям'я Мельнікавых

Дарагі і паважаны Генадзь Шэпелеў! Віншуем цябе з чарговым Днём Нараджэньня. Жадаем адлаведнага! Сям'я Мельнікавых

Дарагі і паважаны Алесь Пушкін! Віншуем з нагоды выставы ў Воршы! Жадаем далейшага! Сям'я Мельнікавых

Дарагі і паважаны Алесь Мазур! Віншуем цябе з Днём Нараджэньня! Жадаем найлепшага! Анжэла, Андрэй і Альберт Мельнікавы

Дзяўчына, якая была на канцэрце 1.03.98 зь сяброўкай у байцы С.О.F. і размаўляла зь ёй па-беларуску, патэлефануй, калі ласка. Тэл.: 268-86-33 Кастусь

Беларуская мова: пераклады, індывідуальнае навучаньне. Тэл.: 221-23-68

Куплю кнігі «Міты бацькаўшчыны» Ул.Васілевіча, «Дамавікамэрон» А.Глёбуса, «Одры Хепберн» з сэрыі «Жанчына-міт». Тэл.: 251-19-52 Таццяна

Куплю рэпрадукцыі карцін Нікаса Сафронава (пра Сафі Ларэн і інш.). Прадам «Дэмаграфічны энцыклапэдычны слоўнік». Тэл.: 251-19-52. Таццяна

Дзяўчат групы 8 «ГС» Глыбоцкага ПТВ віншую з надыходам вясны. Жадаю посьпехаў у вучобе. Вольны хлопец

Аксану Крылову віншую з надыходам вясны. Жадаю ўдачы, каханьня, а таксама веры, алтымізму. Аляксандар Далідовіч

Віншую дзяўчат групы 8 «ГС» з Днём Канстытуцыі. Жадаю ніколі ня падаць духам! Вольны хлопец і Сяргей Хрысталюбаў

Прадаю грэйдэрныя нажы для грэйдэра. Тэл.: 264-87-87 (код 25). Андрэй

Калі ты жадаеш, каб твой любімы беларускі гурт прагучаў на Радыё Рокс, дасылай свае заяўкі на адрас: 220002, Менск, Старажоўская 8а

Куплю «Историю зарубежного искусства» (пад рэд. Мальцавай і Кузьміной); Рэмарк «Чорны абэліск»; Ул.Караткевіч, збор твораў, 1 і 3 тамы. Тэл.: 240-08-88, Віталь

Беларускамоўны гурт «Інтэльмздыя» жадае мець дапамогу дзеля выкананьня песень: скрыпачку і дзьвюх дзяўчын з вартасьцю галасоў альт і сапрана. Існуе невялікі конкурс. Тэл.: 253-47-66, 248-47-42, Руслан

Рэдакцыю «Нашай Нівы» і ўсё кола яе чытачоў шчыра віншуем з 80-годзьдзем БНР! Мы — з вамі за Волю, Незалежнасьць, Радзіму! «Малады Фронт»

Надзея, Ганна, якія жывуць у Берасьці і любяць Беларусь, 25 Сакавіка — сьвята на нашай вуліцы! Віншую ад усяго сэрца! Паліна

Шукаю працу без спэцнавыкаў і сяброў беларусаў — сьціплых, сумленных, бяз шкодных звычак. Мне крыху за 40 гадоў. 213760, Асіповічы-4, а/с 54. Генадзь

Мілы Алесік! Віншую з Днём нараджэньня! Дзякуй за нашае сяброўства. Посьпехаў! Ваша файная дзяўчына

Віншую Яўгена Малікава з 20-годзьдзем. Жадаю адшукаць тую папараць-кветку, што дапаможа зьдзейсьніць самыя сьмелыя жаданьні. Яўгенія

Віншую ўсіх шчырых беларусаў з Днём Волі. Загляне сонца і ў наша ваконца. Скаўтка

Шчыра віншую з 80-годзьдзем утварэньня БНР усіх сумленных беларусаў і Барыса Рагулю асабіста. Здароўя і посьпехаў. Прэсная А.Б.

Дашлю спосабы нарошчваньня цягліцаў бяз «хіміі» і трэнажораў; павелічэньня росту да 8 см; памяншэньня вагі да 8 кг за 13 дзён. Капэрта са зв/а + купон б/а. 246012, Гомель, а/я 147

Праца ў хатніх умовах — 8 відаў. Прыбытак ад 100$. Навыкаў не патрабуецца. Капэрта са зв/а + купон б/а. 246012, Гомель, а/с 143

Спосабы: павелічэньня грудзей на 1-2 памеры бяз «хіміі»; паляпшэньня зроку і памяці; плянаваньня полу дзіцяці. Капэрта са зв/а + купон б/а. 246012, Гомель, а/с 147

Праца ў хатніх умовах, 4 млн. на месяц. Капэрта са зв/а + купон б/а. 220073, Менск, а/с 26.

Ксэракопія, Ф А-4, 800 рублёў копія. Тэл.: 253-92-26

Куплю паперу для ксэраксу. Тэл.: 253-92-26

Беларуская Музычная Альтэрнатыва прэзэнтуе канцэрт-акцыю

18 САКАВІКА 19-00

ВОЛЬНЫЯ ТАНЦЫ 2

(вул. "Интернасьёнал", 4, за "Рытам")

мясцовы час (наваполацк)

flowerwil

новае неба

deviation (horadnia)

кальян (горадня)

barfly's dreams

кошт **70,000** з фізэрам **50,000**

Сапраўдная інфармацыя на сапраўднай мове

БЕЛАРУСКАЯ РЭДАКЦЫЯ ПОЛЬСКАГА РАДЫЁ

Перадачы Пятай Праграмы Польскага Радыё выходзяць штодзённа на 10 мовах (беларуская, польская, украінская, расейская, летувіская, ангельская, нямецкая, эспэранта, чэская, славацкая) на кароткіх і сярэдніх хвалях, па спадарожніку, пры дапамозе кабэльнай сувязі, наземных трансьляцыяў ды праз Інтэрнэт-аўдыё.

ПУБЛІЦЫСТЫКА:

Тыдзень у сьвеце 20.00 ндз, 6.00 пн;
Тыдзень у Польшчы 20.00 сб, 14.30 ндз;
Тыдзень у карэспандэнцыях з Горадні, Вільні, Віцебску 16.30, 20.00 ндз;
Ад панядзелку да нядзелі — інфармацыйны блёк 20.00 ндз;
Штодзённы камэнтар 6.00, 11.00, 20.00;
Рэзананс 20.00 ндз, 16.30 пн;
Вакно — Беларусь у сьвеце 17.00 чац;
Скрыжаваньне думак (польска-беларускія дачыненьні) 20.00 сб, 11.00, 14.30 ндз;

АКТУАЛІІ:

Навіны 14.30*, 16.30, 17.00, 20.00;
Карэспандэнцыі зь Беларусі 6.00, 11.00, 16.30, 17.00, 20.00;
Агляды прэсы 14.30;
Польская прэса пра Беларусь 20.00;
Найцікавейшы сюжэт дня 20.00 пн*, 16.30;

КУЛЬТУРА І ЛІТАРАТУРА:

Беларуская эміграцыйная пісьмовасьць 20.00 ндз, 11.00, 16.30 пн;
Бабілёнская бібліятэка 16.30, 17.00 пн;
Агляд тыднёвіка «Ніва» 20.00 пн, 6.00, 14.30 аўт;
Агляд выданьняў «Часопіс» і «Przegląd Prawosławny» 20.00 сер***, 11.00, 16.30 чац***;
Культурныя Актуаліі 20.00 сер, 6.00, 14.30 чац;
Гартаючы Культурныя Старонкі 20.00 сер, 6.00, 14.30 чац;
Беларуская эміграцыя пра нацыянальную мову 20.00 чац, 11.00, 16.30 пт;
Ад Бібліі да беларускай літаратуры 20.00 сб, 11.00, 16.30 ндз;
Жыцьцяпіс (літаратурная перадача) 16.30, 17.00 пт;
Погляд з партэру (тэатральная перадача) 16.30, 17.00 ндз;

КАРЫСНАЕ, ЦІКАВАЕ, ЗАБАЎНАЕ:

Усякая ўсячына 20.00 пн, 11.00, 14.30, 16.30 аўт;
Юрыспрудэнцыя 16.30, 17.00 аўт;
Эканоміка Польшчы 20.00 аўт, 11.00, 14.30 сер;
Інтарэс (эканамічны выпуск) 16.30 аўт;
Кроніка спорту 20.00 аўт, 6.00 сер;
Цьвіркун (дзіцячая перадача) 20.00 сер, 11.00, 16.30 чац;
Навука і тэхніка 20.00 чац, 6.00, 14.30 пт;
Урок польскай мовы 20.00 пт,6.00, 14.30 сб;
Сьмех ды й годзе (гумар) 20.00 пт, 11.00, 16.30 сб;
Рэдакцыйная пошта 16.30 сб, 6.00, 14.30 ндз;
Рэлігійная гутарка 6.00 ндз;

МУЗЫКА:

Канцэрт віншаваньняў 17.30 ндз, 6.00, 14.30 пн;
Музычны выпуск 11.00, 16.30 пн, 20.00 ндз;
Пра-рок (музычная праграма) 16.30, 17.00 сб.

Умоўныя азначэньні: * 6.00 — гадзіны перадачаў паводле менскага часу; ** пн — панядзелак, аўт — аўторак, сер — серада, чац — чацьвер, пт — пятніца, сб — субота, ндз — нядзеля; *** трэці тыдзень месяца; пры штодзённых перадачах дні тыдня не зазначаныя.

НА КАРОТКІХ ХВАЛЯХ

14.30	41,18 м	50,04 м
	7285 кГц	5995 кГц
16.30	41,27 м	49,22 м
	7270 кГц	6095 кГц
20.00	41,78 м	48,00 м
	7180 кГц	6250 кГц

ПРАЗ СПАДАРОЖНІК (EUTELSAT II F-6 Hot Bird)

6.00 11.00 17.00
13 градусаў усходняй даўжыні, адпаведная частата 11,474 Ггц; гарызантальная палярызацыя, нясучая гуку (аўдыё) 7,38 Мгц

НАШ АДРАС:

Праграма для замежжа 00-977 Варшава P.O. box 46 Польшча
Юрасю Корбану 210038 Віцебск 38 п/с 5 Беларусь
http://www.radio.com.pl/piatka
lobatiuk@radio.com.pl
ajny@radio.com.pl
(+4822) 645-93-67; 645-92-82
fax: (+4822) 645-59-17

Дакумэнты ТБМ

ШАНОЎНЫЯ СЯБРЫ!

Стан беларускамоўнай адукацыі выклікае зразумелую заклапочанасьць: так і не адрадзіўшыся ў поўнай меры, беларускія школы і ВНУ пачынаюць зьнікаць. Таварыства Беларускай Мовы імя Ф.Скарыны надае гэтаму вялікую ўвагу. Заплянавана правесьці чарговае паседжаньне Рэспубліканскай Рады ТБМ па прабемах беларускамоўнай вышэйшай школы. У час падрыхтоўкі да яго былі разасланыя лісты рэктарам усіх ВНУ Беларусі з наступнымі пытаньнямі:

1. Ці вывучаецца беларуская мова студэнтамі ўсіх спэцыяльнасьцяў Вашай ВНУ? На якіх курсах і ў якім аб'ёме выкладаньне ідзе па-беларуску? Якая дынаміка гэтага працэсу, пачынаючы з 1993 году?
2. На якой мове выкладаюцца грамадзкія дысцыпліны?
3. Як выкарыстоўваецца беларуская мова пры вывучэньні прыродазнаўчых дысцыплін: матэматыкі, фізыкі, хіміі, біялёгіі, геаграфіі?
4. Колькі выкладчыкаў у працэнтавых адносінах ад усіх карыстаюцца ў навучальным працэсе беларускай мовай?
5. Колькі абітурыентаў у працэнтавых адносінах ад агульнай колькасьці здавалі ўступныя іспыты па-беларуску, пачынаючы з 1993 году?
6. Ці разглядаліся на Савеце Вашай ВНУ пытаньні выкарыстаньня беларускай мовы ў працэсе навучаньня? Якія прымаліся рашэньні і калі?
7. Колькі падручнікаў і іншай вучэбнай літаратуры выдадзена, пачынаючы з 1993 году, на беларускай мове? Колькі працэнтаў гэта складае ад усёй выдадзенай Вашымі супрацоўнікамі літаратуры?
8. Што стрымлівае пашырэньне выкарыстаньня беларускай мовы ў навучальным працэсе Вашай ВНУ?
9. Ці афармляюцца дысэртацыйныя дасьледаваньні ў Вашай ВНУ на беларускай мове? Ці бываюць абароны на ёй?
10. На якой мове вядзецца справаводзтва ВНУ і праводзяцца паседжаньні яе Савету?
11. Якія мерапрыемствы агульнадзяржаўнага ўзроўню неабходныя, на Вашую думку, для разьвіцьця і пашырэньня ўжытку беларускай мовы?
12. Наколькі Вы асабіста валодаеце і карыстаецеся беларускай мовай?

На вялікі жаль, актыўнага водгуку на нашу просьбу пакуль што няма. Атрыманыя толькі адказы рэктараў Полацкага дзяржаўнага ўнівэрсытэту, Гарадзенскага мэдыцынскага ўнівэрсытэту, Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўнівэрсытэту, Менскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўнівэрсытэту, а таксама тэлефонны званок з Інстытуту нацыянальнай бясьпекі.

Улічваючы ўзьнятую праблему за важную для шырокіх колаў грамадзтва — выкладчыкаў ВНУ, студэнтаў, бацькоў, — заклікаем да ўдзелу ў абмеркаваньні ўсіх ахвотных. Шырокі абмен думкамі, магчыма, стане першым крокам да вырашэньня надзённых пытаньняў. Лісты з прапановамі, інфармацыяй, развагамі просім накіроўваць на адрас: 220005, Менск, вул. Румянцава, 13, тэл.: 233-25-11.

Сакратарыят Таварыства беларускай мовы імя Ф.Скарыны

КУПОН

Бясплатнай прыватнай абвесткі

Тэкст:

Імя і прозьвішча

Адрас, тэлефон

Запоўніце гэты купон і мы надрукуем Вашу абвестку (ня больш за 15 слоў) бясплатна. 220123, Менск, а/с 71

Пытайцеся ў шапіках «Белсаюздруку» і ў прыватных распаўсюднікаў, а яшчэ лепш — выпісвайце

ЛЕГЕНДА БЕЛАРУСКАЙ ПРЭСЫ

НАША НІВА

Падпісны кошт у 1998 годзе:
на месяц — 18.000 руб.
на квартал — 54.000 руб.

Індэкс 63125

"Наша Ніва" незалежная газэта

НАША НІВА

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

рэдактар ..... Сяргей Дубавец
выдавец ..... Рэдакцыя газэты "Наша Ніва"
заснавальнік ..... Павал Жук
адказны сакратар ..... Алег Дзярновіч
мастацкі рэдактар ..... Сяргей Харэўскі
аддзел інфармацыі ..... Андрэй Лапцёнак
Віктар Корзун
дызайн і вёрстка ..... Лявон Раманчык
набор ..... Аляксандра Макавік
стыль і карэктура ..... Паўлюк Канавальчык
пры ўдзеле ..... Сяргея Шупы

АДРАС ДЛЯ ДАПІСАЎ
220123 Менск, а/с 71
Тэл./факс 213-43-52
E-mail: niva@user.unibel.by
http://members.xoom.com/Nasa_Niva

© НАША НІВА. Спасылка на "Нашу Ніву" абавязковая. Наклад 2960. 12 палос фармат А2 нумар падпісаны ў друк 0:26 , 16/3/1998 . Друкарня выдавецтва "Беларускі Дом друку". Менск, праспэкт Францішка Скарыны, 79. Замова № 1421. Кошт свабодны. У шапіках "Белсаюздруку" — 9500 руб.

Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня № 581 ад 4-га ліпеня 1996 г., выдадзенае Дзяржаўным камітэтам друку Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: г. Менск, пр. газэты "Известия", д. 8, кв. 173.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12